НАВАГОДНІ НАСТРОЙ ТОЛЬКІ Ў АРДЫНАТАРСКАЙ 6

ЯК БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ НОВЫ ГОД СВЯТКАВАЛІ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 СНЕЖНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 255 (29369)

# З надыходзячым!

Мінчанін Кірыл ІВАНКЕВІЧ з малодшай дачушкай Лінай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Дваццаць першы веку дваццаць першага...*
*Што нам гэты новы прынясе?*
*З трапяткою веру у лепшае*
*Сустракаем мы яго усе.*

*І жадаем — каб хваробы згінулі,*
*Каб у доме — лад, у свеце — мір.*
*Каб турботы тлумныя пакінулі,*
*Каб учынкі добрыя былі.*

*Каб у небе над Радзімай — сонечна,*
*Каб без хмар на небе, што з сабой.*
*Каб дзіцячы смех звінеў... А што яшчэ*
*Пажадаць пад урачысты бой?*

*Самага найлепшага, прыўкраснага*
*На уцеху сэрцу і вачам,*
*Шчодрага, спакойнага і яснага*
*Года зычым нашым чытачам!*

***Звяздоўцы.***

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НАШ АБАВЯЗАК ПЕРАД ЦЯПЕРАШНІМ І БУДУЧЫМІ ПАКАЛЕННЯМІ — ЗАХАВАЦЬ КРАІНУ»

**У апошнія дні года ў кіраўніка дзяржавы шмат рабочых паездак. Сёлета ў лік абавязковых ён уключыў наведванне мінскага атрада міліцыі асобага прызначэння. І гэта невыпадкова.**

Фота БелТА.

«Загружанасць надзвычайная, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка на пляцы перад асабовым складам сілавога блоку. — Але пры ўсіх выдатках часу я не мог не прыехаць сёння да вас. І ў гэтым страі я бачу сапраўдных патрыётаў нашай Радзімы, людзей абавязку, гонару і сумлення. Гэта вы даказалі сваёй штодзённай самаадданай працай, калі забяспечылі правапарадак і стабільнасць у краіне, не дапусцілі хаосу і грамадзянскага супрацьстаяння».

Свет імкліва змяняецца, становіцца ўсё менш бяспечным для жыцця людзей, а шэраг дзяржаў і зусім пагрузіліся ў бездань грамадзянскіх войнаў і міжнацыянальных канфліктаў, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Побач з нашымі заходнімі і паўночнымі межамі ідзе пастаяннае нарошчванне ваеннага патэнцыялу. Польшча і краіны Прыбалтыкі сталі палігонамі для рэгулярных вучэнняў і трэніровак войскаў НАТА, — дадаў ён. — ***Нам пагражаюць не толькі ўвядзеннем новых эканамічных санкцый, супраць нас развязалі сапраўдную інфармацыйную вайну, пастаянна ладзяцца палітычныя правакацыі».***

Аднак, па словах Прэзідэнта, час прайшоў, страсці трохі ўляглися, і «людзі на свае вочы ўбачылі, хто рваўся да ўлады».

«Вядучую ролю ў арганізацыі вулічных беспарадкаў выконваюць замежныя «ляльказоды» і іх памагатыя — калабаранты, якія не здолелі іншым чынам паказаць сваю хоць нейкую палітычную значнасць, — лічыць беларускі лідар. — Мы ўжо з вамі бачылі такіх (на шчасце, у кадрах нямецкай кінахронікі), якія захоплена маршыруюць з БЧБ-сцягамі і партрэтамі фюрара».

Нягледзячы на велізарныя фінансавыя ўліванні, прамы замежны ўдзел у арганізацыі пратэсных акцый і падрыхтоўцы радыкальных элементаў, спроба адрадзіць падобнае ў нашы дні фактычна захлынулася, па словах кіраўніка дзяржавы, па простай прычыне: «Немагчымая гераізацыя нацызму ў краіне, якая страціла кожнага трэцяга свайго грамадзяніна».

***«Мяцеж, бліцкрыг або «каляровая рэвалюцыя» не прайшлі.*** Таму няўдалыя «змагары», якія сядзяць у цёплых замежных кабінетах, працягваюць вынаходзіць усё новыя падкопы супраць нашай дзяржавы, як яны кажуць, «на карысць беларускага народа». Карысці толькі не бачна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У гэтых «дзеячаў» свае спецыфічныя ўяўленні і разуменне палітыкі. Замест пошуку канструктыўнай альтэрнатывы, сумленнай і адкрытай барацьбы за сімпатыі людзей яны заклікаюць да вулічных баталій. Узамен змястоўнага дыялогу па пераадоленні наяўных праблем спрабуюць паставіць пад сумнеў легітымнасць дзяржаўных інстытутаў. Актыўна садзейнічаюць заклікам знішчаць маёмасць нязгодных з імі, распраўляцца з іх дзецьмі, жонкамі і блізкімі людзьмі. Пры гэтым яны называюць сябе патрыётамі, хоць у адкрытую працуюць на развал эканомікі і ліквідацыю існуючага канстытуцыйнага ладу і знішчэнне краіны».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, да чаго ў суседніх краінах прывяло «разбурэнне масавай свядомасці і гістарычнай памяці народа». Асабліва ў самай актыўнай яго часткі, якая яшчэ не перажывала сапраўднай бяды, — моладзі.

***«Хачу, каб вы разумелі маю пазіцыю, чарговы раз вам пра гэта кажу, — дадаў ён. — Яна нязменная: наш абавязак перад цяперашнім і будучымі пакаленнямі — захаваць краіну. Час абраў проста нас. І мы яе захаваем, чаго б нам гэта ні каштавала. Захаваем для ўсіх нас, для нашых дзяцей і ўнукаў. У гэтым мая і ваша галоўная задача. Калі хочаце, гістарычная місія».***

Яшчэ адна заява прагучала з вуснаў Прэзідэнта на адрас сілавых структур увогуле і АМАПа ў прыватнасці:

«Дарагія сябры, шчыра і адкрыта вам кажу (і няхай яны пачуюць): калі б людзі ў пагонах дарэмна елі хлеб (як яны кажуць), калі б у тыя жнівеньскія дні вы пахісну лі ся — мы сёння жылі б у іншай краіне. І ўвогуле, ці жылі б мы і ці існавала б гэтая краіна? Кажуць, вялікае бачыцца на адлегласці. ***Пройдзе яшчэ няшмат часу, і тыя, хто сёння не разумеюць і супрацьстаяць нам на чыстых мінскіх вуліцах, зразумеюць, што здзейснілі вы сёлета».***

Чарговы раз Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: ***«Ніякім «майданам» у Беларусі не бываць, калі мы забяспечым адзінства народа, цвёрдасць улады і сацыяльна-палітычную стабільнасць у краіне».***

У кіраўніка дзяржавы ёсць усе паўнамоцтвы і сродкі, каб не дапусціць братазабойчых сутыкненняў, адзначыў беларускі лідар і дадаў, што адна з галоўных роляў адведзена сілавым структурам.

Галоўнакамандуючы выказаў падзяку не толькі прысутным, але і тым, «хто стаіць у гэтыя цяжкія дні побач з намі плячо ў плячо», за мужнасць, стойкасць, вернасць прысязе і свайму народу.

«Гэта не проста словы. Для кожнага з вас гэта надзейны арыенцір, які вызначае справы і ўчынкі, — падкрэсліў ён. — Запомніце. Я ніколі ў жыцці нікому не здраджваў. Для некаторых, хто вельмі цікавіцца: «А вось Лукашэнка, ён колькі? Ён заўтра збяжыць, пойдзе і іншае». Не ведаю, дайшло гэта да вас альбо не, я сказаў шчыра: ***пакуль апошні амапавец мне не скажа сыходзіць, я буду наглуха стаяць у гэтай краіне побач з вамі плячо ў плячо. Бо ні ў вас, ні ў мяне акрамя гэтай зямлі, гэтай краіны больш нічога няма».***

***«Ва ўмовах узмацнення рэальных і патэнцыйных выклікаў і пагроз нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь мы сваю незалежнасць адстаім, канстытуцыйны лад, будучыню краіны і народа»,*** — запэўніў Прэзідэнт.

«Пры гэтым кожны супрацоўнік і вайсковец, чалавек у пагонах павінен ведаць і разумець, што на нашым баку закон і што вы абароненыя дзяржавай, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — ***Людзі вераць у вас і ведаюць, што вы заўсёды прыйдзеце на дапамогу, забяспечыце спакойнае і мірнае жыццё нашых грамадзян, абароніце краіну ад знешніх і ўнутраных пагроз.*** Наглядны таму прыклад — апошнім часам зладжаная работа Камітэта дзяржбяспекі і МУС па спыненні дзейнасці тэрарыстычных груп, якія абяцалі нам, беларусам, зладзіць «вясёлы» Новы год. Няхай паспрабуюць».

Сілавыя структуры — найважнейшы фактар нацыянальнай бяспекі, міру і спакою ў грамадстве, адзначыў Прэзідэнт.

«Таму кіраўніцтва краіны аддае асаблівую ўвагу цяперашняму стану і перспектывам іх развіцця. Эканамічныя ўмовы сёння няпростыя, але нам удаецца своечасова аснашчаць вас самымі сучаснымі ўзорамі тэхнікі і ўзбраення, захоўваць кадравае ядро, павышаць прэстыж службы. Гэтая дзейнасць будзе працягнутая. І тыя просьбы, якія паступілі мне на працягу года, будуць рэалізаваныя ў наступным годзе», — паабяцаў Галоўнакамандуючы.

Ён выказаў перакананасць, што, нягледзячы на складаныя абставіны, у якіх надыходзіць Новы год, усе праблемы будуць пераадолены, як гэта бывала неаднаразова. Кіраўнік дзяржавы пажадаў усім прысутным, асабліва іх родным і блізкім, невычарпальнай жыццёвай энергіі, моцнага здароўя і сямейнага дабрабыту.

«Запэўніваю вас, што я, як Прэзідэнт, і ўсё кіраўніцтва краіны зробім усё, што ад нас залежыць, каб вы ніколі не асудзілі мяне і кіраўніцтва краіны, — завяршыў сваю прамову Аляксандр Лукашэнка. — Яшчэ раз паўтараю: я бязмерна вам удзячны за стойкасць і мужнасць. І ведайце: пакуль вы ў страі, я разам з вамі».

* * *

Пасля гэтых слоў кіраўнік дзяржавы ўручыў узнагароды прадстаўнікам Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства абароны, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, Службы бяспекі Прэзідэнта.

Сярод узнагароджаных — намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь Казакевіч, намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі Мікалай Карпянкоў, камандзір спецыяльнага атрада хуткага рэагавання ўнутраных войскаў МУС Аляксандр Быкаў, камандзір АМАПа ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый Балаба, камандзір АМАПа УУС Гродзенскага аблвыканкама Віктар Краўцэвіч, камандзір АМАПа УУС Брэсцкага аблвыканкама Максім Міховіч.

Узнагарод таксама ўдастоены камандзір 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады Аляксей Ялфімаў, камандзір 38-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады Аляксандр Ільюкевіч, камандзір 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння Дзмітрый Кучук, начальнік Асобнай службы актыўных мерапрыемстваў пагранічнай службы Ігар Кручкоў.

«2020 год быў дастаткова складаны для ўсіх нас, складаны для нашай краіны, — звярнуўся да Галоўнакамандуючага Дзмітрый Балаба. — Але сёння ўжо можна з упэўненасцю сказаць, што пад вашым кіраўніцтвам мы ўсе разам выканалі пастаўленыя задачы. Захавалі тэрытарыяльную цэласнасць і суверэнітэт нашай роднай, любімай Беларусі. Таварыш Прэзідэнт, сёння работа ўсяго сілавога блока нашай краіны накіраваная на забеспячэнне мірнай працы нашых грамадзян, на тое, каб сёння на вуліцах нашай краіны было спакойна, каб людзі маглі мірна сустрэць Новы год, Каляды».

Камандзір мінскага АМАПа запэўніў Прэзідэнта, што ўсе падраздзяленні, якія стаяць на пляцы перад ім, выканаюць сваю задачу дакладна і ў тэрмін.

«Вось гэта ўзнагароджанне нашых ваеннаслужачых, іх каля 50 чалавек, — гэта чыста сімвалічна, — дадаў напрыканцы ўрачыстай цырымоніі кіраўнік дзяржавы. — Бо кожны з вас — герой. І мая была каманда ўзнагародзіць усіх, нават калі іх будуць тысячы. Вы гэта заслужылі. І я ўпэўнены, што гэта зроблена. Калі не, то да Новага года мы гэта зробім. І цывільных, і ваенных. Гэта першае. Другое: яшчэ раз падкрэсліваю, я ведаю, што неабходна для ўсіх вас. І не толькі падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў, але і Міністэрства абароны, якія па законе павінны забяспечваць не толькі знешнюю бяспеку і абарону, але і ўнутраную стабільнасць. Усе пытанні, якія вамі пастаўленыя, будуць вырашаныя. Ад забеспячэння самымі сучаснымі сродкамі абароны да бытавых умоў».

Наконт апошняга Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што для сем'яў супрацоўнікаў АМАПа і для служачых унутраных войскаў цягам года будуць пабудаваны два прыгожыя сучасныя дамы.

«Вы выратавалі краіну. Пройдзе няшмат часу і людзі гэта ацэняць, — паўтарыў беларускі лідар. — Я ведаю, вы — смелыя афіцэры, смелыя воіны. ***Мы не павінны нікога баяцца на гэтай зямлі. Гэта наша краіна, наша Беларусь, мы яе адбудавалі і мы яе павінны перадаць такой прыгожай сваім дзецям».***

Падчас наведвання атрада міліцыі асобага прызначэння ГУУС Мінскага гарвыканкама Аляксандр Лукашэнка быў угнараваны знакам адрознення амапаўцаў — правам нашэння чорнага берэта. Такое рашэнне (для атрымання чорнага берэта неабходна прайсці спецыяльныя выпрабаванні) прыняў савет камандзіраў атрада.

«За асаблівыя заслугі — гэта ні ў якім разе не супярэчыць палажэнню (аб знаку адрознення. — **«Зв.»**), — растлумачыў камандзір АМАПа ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый БАЛАБА. — Таварыш Прэзідэнт, вы былі з намі ў баявых парадках і зараз вы паўнацэнны баец атрада асобага прызначэння».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Прэзідэнт прысудзіў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецпрэміі дзеячам культуры і мастацтва

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прысудзіў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва. Кіраўнік дзяржавы падпісаў адпаведныя ўказы, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Па выніках 2020 года прысуджаны пяць прэмій «За духоўнае адраджэнне».** Імі адзначаны працоўныя і аўтарскія калектывы, прадстаўнікі рэлігійных і адукацыйных арганізацый за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, якая садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і ідэй міласэрнасці.

За аднаўленне Тураўскага крыжа XII-XIII стагоддзяў прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву ў складзе члена Беларускага саюза мастакоў Алены Андрушчанкі, намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва — начальніка ўпраўлення прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры, старшыні Сінадальнага аддзела па царкоўным мастацтве, архітэктуры і рэстаўрацыі Беларускай праваслаўнай царквы Марыі Нецвятаевай і дырэктара ТДА «Залаты платан» Алега Ермаловіча.

Высокай узнагароды за стварэнне мемарыяльнага комплексу на месцы спаленай вёскі Ала ў Светлагорскім раёне Гомельскай вобласці ўдастоены аўтарскі калектыў у складзе галоўных архітэктараў праекта ААТ «Інстытут Гомельграмадзянпраект» Сяргея Пярвіцкага і Віктара Бельцюкова, а таксама члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Ізяслава Катлярова.

Прэмія «За духоўнае адраджэнне» прысуджана бацькам-выхавальнікам дзіцячага дома сямейнага тыпу ўпраўлення па адукацыі Салігорскага райвыканкама Таццяне і Андрэю Барытолям за значны ўклад у выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

За ўмацаванне ідэй гуманізму ў сучасным беларускім грамадстве, самаадданую працу па аказанні медыцынскай дапамогі насельніцтву ў перыяд эпідэміі COVID-19 узнагародай адзначаны калектыў **Гарадской дзіцячай інфекцыйнай клінічнай бальніцы Мінска.**

Святар Свята-Траецкай царквы аграгарадка Салтанаўшчына Нясвіжскага раёна Слуцкай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэй Алег Абрамовіч атрымаў прэмію за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцяў сярод дзяцей і моладзі, арганізацыю дабрачыннай дзейнасці брацтва ў гонар Праабражэння Гасподняга.

За выдатныя дасягненні ў сферы музычнага мастацтва, музейнай і бібліятэчнай справы, журналістыкі, тэлебачання, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, **прысуджаны дзесяць спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.**

Аўтарскі калектыў у складзе галоўнага і вядучага бібліятэкараў аддзела маркетынгу і бібліятэказнаўчай работы Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Юліі Касцюк і Івана Малініна ўганараваны спецпрэміяй за значныя дасягненні ў справе выхавання любові да роднага краю, стварэнне інфармацыйных рэсурсаў, прысвечаных тэме малой радзімы.

Узнагародай адзначаны таксама аўтарскі калектыў у складзе дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдата гістарычных навук Вадзіма Лакізы, навуковага супрацоўніка Нацыянальнага парку «Белавежская пушча», магістра гістарычных навук Руслана Кнігі, галоўнага архітэктара праектаў філіяла «Брэстрэстаўрацыяпраект» ААТ «Белрэстаўрацыя» Вольгі Нічыпарчык за самаадданую працу па захаванні гістарычнай памяці беларускага народа, стварэнне археалагічнага музея пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы.

За вялікі ўклад у фарміраванне патрыятычнай самасвядомасці грамадзян, стварэнне праекта «Гонар за Беларусь» спецпрэмія прысуджана аўтарскаму калектыву ў складзе кіраўніка аналітычнага цэнтра «ЕсооМ» ТАА «МЕДЫЯФАКТ-ЭКА» Сяргея Мусіенкі, аглядальніка рэдакцыі аддзела палітычнай інфармацыі Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Максіма Осіпава, начальніка аддзела падрыхтоўкі ілюстрацый упраўлення аб'яднанага сакратарыята Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Максіма Шніпа.

Калектыў Інстытута пагранічнай службы ўганараваны высокай узнагародай за значны ўклад у фарміраванне духоўных асноў падрастаючага пакалення, рэалізацыю маладзёжнага патрыятычнага праекта «Мужнасцю сваёй у неўміручасць крочылі».

Спецыяльнай прэміяй адзначаны таксама калектыў Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці — за выдатныя дасягненні ў справе захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, адраджэнне традыцыйнай тэхналогіі вырабу гліняных цацак Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння.

За значны ўклад у захаванне гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, рэалізацыю праекта Саюзнай дзяржавы па рэканструкцыі будынкаў і збудаванняў Брэсцкай крэпасці прэміі ўдастоены калектыў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

Калектыву Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі прэмія прысуджана за адраджэнне і захаванне нацыянальных традыцый, развіццё сучасных кірункаў мастацкай творчасці, значны ўклад у выхаванне дзяцей і моладзі.

Высокай узнагароды ўдастоены галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра, народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў за значны асабісты ўклад ва ўмацаванне міру і згоды ў грамадстве праз музыку, за рэалізацыю буйных рэспубліканскіх і міжнародных творчых праектаў.

Старшыня праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Марат Маркаў адзначаны спецыяльнай прэміяй за стварэнне аўтарскіх тэлеперадач пра людзей, падзеі і дасягненні суверэннай Беларусі.

За значны асабісты ўклад у адраджэнне традыцыйнай вырабу музычных інструментаў узнагарода прысуджана майстру народных інструментаў Адэльскага цэнтра культуры і народнай творчасці — філіяла Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Мар'яну Скрамблевічу.

## ПРЫСУДЖАНЫ ПРЭМІІ «БЕЛАРУСКІ СПАРТЫЎНЫ АЛІМП»

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 29 снежня падпісаў Указ № 500 «Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2020 года». Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэміі ўдастоены трэнер-выкладчык Сенненскай СДЮШАР Валерый Лектараў, загадчык аддзела спартыўных навін Агенцтва тэлевізійных навін НДТРК Мікалай Стула і дырэктар Мясцовага дабрачыннага фонду імя Аляксея Талая, член нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па інваспорце Аляксей Талай.

Узнагарода прысуджана ім за актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы.

# Сапраўдны баль у сапраўдным палацы

**Фотазамалёўка Яўгена ПЯСЕЦКАГА з Рэспубліканскага навагодняга балю для моладзі ў Палацы Незалежнасці**

# Энергія грамадства на карысць краіны

Праходзіць вылучэнне дэлегатаў на VI Усебеларускі народны сход

Менш чым праз паўтара месяца ў нашай краіне адбудзецца найважнейшая падзея — 11-12 лютага ў Мінску пройдзе VI Усебеларускі народны сход. Ва ўсіх рэгіёнах вызначаюцца з дэлегатамі, якія накіруюцца на прадстаўнічы форум.

Традыцыйна на Усебеларускім народным сходзе будуць падведзены вынікі апошняй пяцігодкі. Дэлегаты разгледзяць Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады, ацэняць тыя механізмы, з дапамогай якіх прапануецца забяспечыць эканамічны рост і захаваць мадэль сацыяльнай дзяржавы ў найскладанейшых знешніх умовах. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, VI Усебеларускі народны сход стане найважнейшым форумам пяцігоддзя. «Але паколькі вялікае бачыцца на адлегласці, праз некаторы час мы зразумеем, што гэта найважнейшы форум і ў гісторыі нашага народа. З прычыны таго моманту, які краіна перажывае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсе навацыі, якія будуць прапаноўвацца на будучым Усебеларускім народным сходзе, абавязаны служыць адной мэце — беларусам і іх дабрабыту.

Як вядома, падчас падрыхтоўкі да Усебеларускага народнага сходу ў краіне арганізаваны шырокі грамадскі дыялог. У рэгіёнах, працоўных калектывах, ВНУ абмяркоўваюцца асноўныя кірункі развіцця краіны. На месцах працуюць грамадскія прыёмныя, дзе кожны жадаючы можа выказаць сваё меркаванне і ўнесці прапановы па тых або іншых пытаннях.

«Сёння выказацца можа кожны. Гэта і ёсць плюралізм меркаванняў, неабходны для прыняцця правільных кіраўніцкіх рашэнняў, выбудоўвання эфектыўнага балансу паміж інтарэсамі дзяржавы і грамадства», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## На Гомельшчыне пачалі абіраць удзельнікаў Усебеларускага народнага сходу

**У вобласці аднымі з першых вызначалі ўдзельнікаў VI Усебеларускага народнага сходу — прадстаўнікоў ад Гомеля. У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку вылучэння кандыдатур і абрання ўдзельнікаў шостага Усебеларускага народнага сходу норма прадстаўніцтва ў цэлым для Гомеля ўстаноўлена абласным арганізацыйным камітэтам у колькасці 75 чалавек. Частка дэлегатаў вылучана і ўзгоднена на сесіі Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў, якая прайшла напярэдадні.**

Фота БелТА.

— Гарадскім арганізацыйным камітэтам даведзена норма прадстаўніцтва ад Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў у колькасці 25 чалавек, — адзначыў яго **старшыня Мікалай КАВАЛЕВІЧ.** — Таксама гарадскім аргкамітэтам устаноўлены і абраны рэзерв удзельнікаў Усебеларускага народнага сходу. Галасаванне праводзілася дэпутатамі па кожнай кандыдатуры паасобку.

Так, 15 дэпутатаў Гомельскага гарадскога і 10 — абласнога Саветаў дэпутатаў ужо зацверджаны ў якасці ўдзельнікаў VI Усебеларускага народнага сходу. Сярод абраных дэлегатаў — прадстаўнікі прамысловай сферы, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю, адукацыі, аховы здароўя і культуры. Многія з іх у апошнія некалькі месяцаў актыўна ўдзельнічалі ў рабоце грамадскіх прыёмных і дыялогавых пляцовак, таму ведаюць, якія праблемы сёння хвалююць людзей. Частка дэлегатаў вяла збор ініцыятыў і прапаноў ад грамадзян, таму ў сталіцу кожны прыедзе са сваім бачаннем і канкрэтнымі прапановамі па развіцці нашай краіны.

У ліку дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу **рэктар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Сяргей ХАХОМАЎ:**

— Я спадзяюся, што на гэтым сходзе будуць не толькі падводзіцца вынікі мінулай пяцігодкі, абмяркоўвацца планы на будучую, але і будуць абмяркоўвацца актуальныя палітычныя пытанні, пра якія ў апошнія месяцы шмат гаворыцца і ў сродках масавай інфармацыі, і на дыялогавых пляцоўках, і паміж людзьмі.

Між тым, як удакладнілі ў аддзеле арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага гарвыканкама, прадугледжаны два спосабы вылучэння дэлегатаў: ад саветаў дэпутатаў і ад грамадскіх аб'яднанняў. Такім чынам, у Гомелі яшчэ 50 дэлегатаў выберуць кіруючыя органы грамадскіх арганізацый. Каб аб'ектыўна падысці да ацэнкі дасягненняў і перспектыў развіцця, у складзе дэлегацыі абавязкова будуць прадстаўнікі розных кірункаў — ад спецыялістаў прадпрыемстваў, прадстаўнікоў сацыяльнай сферы да дзяржслужачых.

Нагадаем, што VI Усебеларускі народны сход пройдзе ў Мінску 11-12 лютага. Адпаведны ўказ аб яго скліканні кіраўнік дзяржавы падпісаў 28 снежня. Агульная колькасць удзельнікаў і запрошаных асоб VI Усебеларускага народнага сходу складзе 2 700 чалавек. Удзельнікі форуму ад абласцей і Мінска абіраюцца з улікам нормаў прадстаўніцтва раённымі і гарадскімі Саветамі дэпутатаў і найбольш шматлікімі грамадскімі аб'яднаннямі. Пры гэтым ад кожнай вобласці ў сходзе возьме ўдзел не больш за 310 чалавек, ад Мінска — не больш за 370 грамадзян. На абмеркаванне ўдзельнікаў будуць вынесены асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады і кірункі грамадска-палітычнага развіцця краіны.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## Дастойныя і аўтарытэтныя

### На Міншчыне актыўна вылучаюць дэлегатаў

**Напрыклад, учора на пазачарговай сесіі Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў зацвердзілі дэлегатаў на VI Усебеларускі народны сход, які адбудзецца 11-12 лютага.**

— Гэта ініцыятыўныя, дастойныя людзі, якія маюць аўтарытэт у сваіх калектывах, якіх паважаюць у раёне, — канстатаваў **старшыня райсавета Ігар ПЯТРОВІЧ.** — Дзмітрый Цітко — начальнік раённага аддзела Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Аляксандр Ануковіч — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач раёна, Алёна Яўсюк — дырэктар Уздзенскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага ліцэя. Яны з'яўляюцца дэпутатамі раённага Савета. Дзяніс Астрэйка працуе ўчастковым інспектарам міліцыі раённага аддзела ўнутраных спраў. Дзяніс Уладзіміравіч — дэпутат Азерскага сельсавета.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

• Меркаванне

## З пачуццём адказнасці

**Стаўка на дэпутатаў мясцовых Саветаў усіх узроўняў і актыў найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў пры вылучэнні дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу лагічная і аб'ектыўна апраўданая. Такім меркаваннем з БелТА падзяліўся кіраўнік рабочай групы рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы сходу, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.**

«Гэта людзі, якія ўжо маюць пэўны мандат ад сваіх землякоў і калег па рабоце. Яны ходзяць па зямлі і добра ведаюць асноўныя праблемы канкрэтных тэрыторый і працоўных калектываў. У іх ёсць вопыт удзелу ў грамадскіх дыскусіях. Акрамя таго, ім добра знаёма архітэктура прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў — ад унясення прапаноў да іх практычнай рэалізацыі. Паколькі сёння мала прапанаваць ідэю, важна дакладна разумець, як яе ажыццявіць і што гэта дасць для краіны ў выніку», — упэўнены Андрэй Кунцэвіч.

Па яго словах, менавіта пачуццё адказнасці за прынятыя рашэнні адрознівае сёння тых, хто актыўна ўдзельнічае ў шырокім дыялогу аб далейшым развіцці Беларусі, ад тых, хто спрабуе яго ігнараваць або дыскрэдытаваць. «Больш за тое, складваецца ўражанне, што апошнія проста не могуць цяпер прапанаваць грамадству нешта вартае, што б садзейнічала яго развіццю і росту. Дэструктыўная рыторыка паводле замежных суфлёраў многім даволі-такі ўжо надакучыла і нічога іншага, акрамя раздражнення, у людзей не выклікае», — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

• Меркаванне

## «Усебеларускі народны сход — найвышэйшая форма дэмакратыі»

**Анатоль ІСАЧАНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі:**

— Цяпер ідзе абмеркаванне, дзейнічаюць дыскусійныя пляцоўкі, абіраюцца дэлегаты. Яны прадстаўляюць усе слаі насельніцтва: людзі аўтарытэтныя, будуць выказваць свой пункт гледжання, уласнае меркаванне, прапаноўваць шляхі развіцця краіны. Канешне, мы ўсе чакаем ад Усебеларускага народнага сходу эпахальнасці, калі так можна сказаць. Тут народ будзе прымаць лёсавызначальныя для нашай краіны рашэнні: шляхі развіцця, стратэгічныя кірункі. Падчас правядзення дыскусійных пляцовак уносяцца розныя прапановы. На сённяшні дзень іх каля дзесяці тысяч: яны розныя. Многія датычацца рэгіянальнага ўзроўню, ёсць аб перадачы паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы Савету міністраў у частцы вызначэння тэрытарыяльнай цэласнасці, па выбары кіраўнікоў рэгіёнаў — палітра прапаноў вельмі розная. Самае галоўнае, што людзі не раўнадушныя, яны абмяркоўваюць, прапаноўваюць, таму што гэта будучае нашай краіны і нам разам трэба прымаць рашэнні.

На мой погляд, народны сход — самая перадавая форма прыняцця важных для краіны рашэнняў, таму што іх прымае народ. На яго выбіраюцца людзі з усіх рэгіёнаў, слаёў насельніцтва: інтэлігенцыя, рабочыя, моладзь, старэйшыны. Збіраюцца людзі, якія могуць прапанаваць і абгрунтаваць сваё меркаванне. Таму я лічу, Усебеларускі народны сход — гэта найвышэйшая форма дэмакратыі.

# ЖЫЛЛЁ, ГРОШЫ, МАШЫНЫ

## Наша стаўленне да гэтых трох рэчаў за апошнія 12 месяцаў змянілася больш за ўсё

### АМАЛЬ ДВАЙНАЯ ПРАПАНОВА, АЛЕ ПРАДАЎЦЫ НЕ ЗНІЖАЮЦЬ ЦЭНЫ

Істотным трэндам сёлета на другасным рынку жылля стала змяненне аб'ёму прапаноў. Так, калі ў студзені гэтая лічба была мінімальная (6200 аб'ектаў), то ў лістападзе (ды і ў снежні) колькасць людзей, якія выставілі сваё жыллё на продаж, вырасла амаль удвая (10 400 кватэр і асобных пакояў). За апошні тыдзень колькасць аб'ектаў на рынку вырасла яшчэ на 4 %.

**Дырэктар агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровы старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ** расказаў, што пачатак гэтага года не прадвяшчаў для рынку нічога дрэннага. Усе жылі вялікімі надзеямі і разлічвалі, што з надыходам вясны рынак яшчэ больш ажыве. Але ў красавіку да краіны дайшла пандэмія каранавіруса, і да мая стала зразумела, што год будзе цяжкі. У выніку ў 2020-м агенцтвы нерухомасці ў параўнанні з мінулым годам страцілі 20—30 % сваіх даходаў.

Спатрэбіўся час, каб навучыцца жыць і працаваць у складаных эпідэміялагічных умовах. Часткова пандэмічныя страхі перамаглі дзякуючы аператыўнаму ўводу анлайн-сэрвісаў, відэа- і віртуальных тураў па кватэрах. У ліпені рынак практычна аднавіўся да ўзроўню сакавіка. Аднак восень зноў унесла свае карэктывы. У верасні і кастрычніку актыўнасць на рынку ў параўнанні з сярэднестатыстычнымі штомесячнымі паказчыкамі знізілася ледзьве не ў два разы.

На думку экспертаў, на падзенне попыту паўплываў адразу «клубок» фактараў: першая хваля пандэміі каранавіруса, палітычная і эканамічная нестабільнасць у грамадстве, а потым і наступленне другой хвалі пандэміі.

Цяпер мы можам толькі канстатаваць, што на рынку ёсць танныя варыянты кватэр і можна таргавацца. Магчыма, заўтра гэтыя кватэры будуць каштаваць яшчэ танней. Прагноз да зніжэння ёсць.

Некалькі асеў і рынак першаснага жылля. Аднак прычынай таму сталі не каранавірус і палітычныя падзеі, а спыненне крэдытавання будаўніцтва банкамі.

Цэны на першаснае жыллё за бягучы год упалі на 10—15 %. Эксперты лічаць, што на гэтым падзенне скончыцца. А вось цэны на «другасным рынку» працягнуць зніжацца. Рыэлтары лічаць, што ў 2021 годзе адбудзецца гістарычная падзея: жыллё на другасным рынку ўпершыню за доўгі час стане танейшае, чым на першасным.

У сярэднім на 10—15 % сталі танней здавацца ў арэнду кватэры з прыватнага жыллёвага фонду ў Мінску. Попыт на здымнае жыллё скараціўся, пры гэтым рынак цяпер досыць насычаны. Разам з тым далёка не ўсе ўладальнікі кватэр гатовыя да зніжэння.

Падзенне рынку нерухомасці назіраецца не толькі ў сталіцы, але і ў іншых беларускіх гарадах. Па словах аднаго з гомельскіх рыэлтараў, сярэдняя колькасць здзелак у яго скарацілася на 50—60 % за бягучы год.

Але ў рэгіёнах далёка не ўсе прадаўцы нерухомасці вераць у крызіс. Як вынік — адмаўляюцца зніжаць цэны. У сваю чаргу ў пакупнікоў стала значна менш магчымасцяў (з-за адсутнасці крэдытавання), за кошт чаго і адбываецца скарачэнне колькасці здзелак.

### СМАЛЯВІЧЫ Ў БУДОЎЛІ, РУДЗЕНСК — У ПЛАНАХ. ЯК БУДУЮЦЦА ГАРАДЫ-СПАДАРОЖНІКІ

Сёння ў Смалявічах разгарнулася грандыёзная будоўля адразу ў двух кварталах. Калі ў кварталe нумар адзін узвядзенне жылля вядзецца Мінскім аблвыканкамам для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Смалявічах, то другі квартал забудоўваецца Мінгарвыканкамам для грамадзян, якія стаяць на жыллёвым уліку ўжо ў Мінску. На тэрыторыі другога квартала прадугледжана будаўніцтва 19 жылых дамоў агульнай плошчай 146 тысяч квадратных метраў на 2200 кватэр.

**«Калі сёлета ў чэрвені ў краіне было 400 электрамабіляў, то пасля адмены мытнай пошліны і ПДВ іх стала больш за 1600. Разам з тым больш стане і электразарадных станцый».**

Гэта ў планах, а што робіцца ў новым квартале цяпер? Тут на стадыі завяршэння знаходзіцца будаўніцтва жылога дома на 192 кватэры агульнай плошчай 14 тысяч квадратных метраў. Акрамя таго, па двух шматкватэрных дамах распрацавана праектная дакументацыя, якая ва ўстаноўленым парадку прайшла дзяржаўную экспертызу. Да канца года мінскія спецыялісты плануюць завяршыць праектныя работы з атрыманнем экспертнага заключэння яшчэ па чатырох дамах.

Мяркуецца, што кошт аднаго «квадрата» ў кватэрах новых дамоў складзе прыкладна 1100—1200 рублёў.

### ПАНДЭМІЯ СКАЖА НАЯЎНЫМ ГРАШАМ «НЕ»

Разбяромся, ці такое бяспечнае «збіральніцтва» намі папяровых грошай іншых дзяржаў? Гэта, у прыватнасці, звязана з паведамленнем навукоўцаў аб тым, што банкноты спрыяюць распаўсюджванню COVID-19.

На гэта звярнулі ўвагу медыкі. Дык чые купюры больш заразныя? Пяцірублёвыя банкноты (з айчыннага шэрагу купюр) — магчыма, самыя брудныя грошы, якія вы калі-небудзь трымалі ў руках. На самых дробных купюрах даследчыкі выявілі да 34 відаў патагенных мікраарганізмаў, якія выклікаюць пнеўманію, менінгіт і шмат іншых, мякка кажучы, непрыемных хвароб. Але, як аказалася, нашы грошы проста стэрыльныя ў параўнанні з іх «зялёнымі» братамі.

Амерыканскія аднадоларавыя купюры нашмат больш «жывыя», а значыць, і брудныя. Як устанавіла група навукоўцаў з Нью-Ёркскага ўніверсітэта, на гэтых банкнотах жыве амаль 400 відаў небяспечных мікраарганізмаў.

Хваробатворныя мікробы жывуць на купюрах даволі доўга — ад аднаго да двух месяцаў. У папяровых грашах шмат цэлюлозы, а гэта пажыўнае асяроддзе для бактэрый. На пластыкавых купюрах (напрыклад, аўстралійскіх доларах) і металічных манетах мікраарганізмаў нашмат менш, і іх жыццё кароткае — паўтара-два тыдні.

Цікава, што ў бактэрый ёсць свае перавагі сярод манет. Так, кішачныя палачкі і сальманелы асабліва часта сустракаюцца на амерыканскіх цэнтах, у якіх шмат медзі. Яны жывуць там да 11 дзён. Найбольш бяспечныя манеты з дадаткамі срэбра і золата — высакародныя металы моцна абмяжоўваюць магчымасці росту і размнажэння мікробаў. Ужо праз тыдзень пасля таго як такая манета выходзіць з абарачэння, мікраарганізмаў на ёй не застаецца.

У некаторых краінах грошы абеззаражваюць азонам і ультрафіялетам. У Японіі спецыяльная прылада ў банкаматах перад выдачай награвае купюры да двухсот градусаў. Гэтага дастаткова, каб пазбавіцца ад бактэрый, грыбкоў і цвілі. А вось еўра можна браць у рукі без усялякай боязі: на іх практычна не бывае мікробаў, паколькі купюры абаронены антыбактэрыяльнымі растворамі.

Наша моладзь грошы ў рукі амаль не бярэ прынцыпова. Дарослае пакаленне з гатоўкай больш сябруе. Нам пакуль рана хваліцца ўсеагульнай адмовай ад наяўнасці, але ў Беларусі таксама расце доля безнаяўных плацяжоў. Апошнім часам у нашай краіне шырока распаўсюдзіліся бескантактавыя плацежныя карткі, якія не прадугледжваюць увядзенне ПІН-кода. А значыць, і перадача інфекцыі пры аплаце такой карткай нязначная.

**«Цяпер мы можам толькі канстатаваць, што на рынку ёсць танныя варыянты кватэр і можна таргавацца. Магчыма, заўтра гэтыя кватэры будуць каштаваць яшчэ танней. Прагноз да зніжэння ёсць».**

Як расказалі ў Нацыянальным банку краіны, уся грашовая наяўнасць, якая паступае ў банк, першапачаткова адпраўляецца на 14-дзённы каранцін. Пасля каранціну манеты і банкноты сартуюць па ступені зношанасці і забруджанасці. У абарачэнне паступаюць чыстыя манеты і купюры, на якіх адсутнічаюць сляды пашкоджанняў. Банкноты наміналам 5 і 10 рублёў выдаюць пераважна новыя.

Прадстаўнікі Нацбанка нагадалі аб правілах захавання гігіены пасля кантакту з купюрамі і манетамі — трэба абавязкова мыць рукі. А таксама ўдакладнілі, што ў цяперашні момант больш бяспечна карыстацца бескантактавымі плацяжамі і дыстанцыйнымі каналамі банкаўскага абслугоўвання для аплаты пакупак.

### ГОД БЫЎ ЦЯЖКІ, АЛЕ НЕ ДЛЯ ЎСІХ

Барацьба з COVID-19 істотна паўплывала на сусветны рынак, перазагрузка прамысловага сектара ўнесла карэктывы ў жыцці многіх людзей, але... Негатыўныя тэндэнцыі на транспартным рынку аказалі мінімальны ўплыў на электрамабілі. Менавіта сёлета ў Еўропе колькасць продажаў электракараў за апошнія 2-3 месяцы перавышае колькасць прададзенага дызельнага транспарту.

У выніку новых тэндэнцый Вялікабрытанія ссунула дату адмовы ад продажаў транспарту з рухавіком унутранага згарання на 2030 год. Кітай абмяркоўвае аналагічнае рашэнне тэрмінам да 2035 года.

Наша краіна не застаецца ўбаку ад глабальнага трэнду. Раней у нас быў прыняты ўказ, які стымулюе развіццё электратранспарту. На дарогах сур'ёзна ўзрасла колькасць электрамабіляў. Сёння гэта відаць па колькасці зарадных сесій і электраэнергіі, якая адпускаецца ў электрасетцы Malanka. Таму прагноз у сто тысяч электрамабіляў на нашых дарогах да 2025 года — рэальнасць.

Калі сёлета ў чэрвені ў краіне было 400 электрамабіляў, то пасля адмены мытнай пошліны і ПДВ іх стала больш за 1600. Разам з тым больш стане і электразарадных станцый.

Налета сетка ЭЗС Malanka павялічыцца да 600 электразаправак. Прычым з'явяцца станцыі не толькі ў сталіцы і на галоўных магістралях краіны, але і ва ўсіх абласцях Беларусі. Усяго ў рэгіёнах усталююць каля 80 новых станцый хуткага тыпу.

Патанненне электрамабіляў, якое будзе працягвацца і ў наступным годзе, павысіць попыт на паслугі зарадкі. Эфектыўнае і камфортнае развіццё сеткі сёння патрабуе інвестыцый. Нагадаем, што ў новым годзе запраўка на ЭЗС Malanka стане платнай.

На цяперашнім этапе сетка Malanka знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці, і з 1 студзеня платныя зарадныя сесіі будуць запушчаны. Пры гэтым узровень тарыфаў будзе заставацца самы нізкі ў Еўропе: 39 капеек за кВт/г на хуткай зараднай станцыі і 29 капеек — на павольнай. Гэта неабходны мінімум, які дазволіць забяспечыць развіццё сеткі і зручную цану для ўладальніка электракара. Зараджаць электракар будзе ў два разы танней, чым запраўляць аўтамабіль звычайным палівам.

Malanka — не манапаліст на рынку. Развіццё сеткі электразаправак пойдзе на карысць як кіроўцам, так і прадпрымальнікам, таму што простыя павольныя запраўкі могуць стаць дадатковай крыніцай іх даходаў.

Аўтобусы адыходзяць на задні план, а апошнім часам на розных узроўнях абмяркоўваецца перспектыва замены аўтобуснага парка на электрычны, у сувязі з чым Malanka будзе развіваць зарадную сетку таксама для грамадскага электратранспарту. Гэта будуць зарадныя станцыі магутнасцю да 350 кВт, якія аснашчаны дадатковым абсталяваннем для зарадкі менавіта электробусаў.

Акрамя гэтага, Malanka сумесна з ПРААН і Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя распрацавала канцэпцыю праекта па прасоўванні электрамабіляў у Беларусі. У яго рамках плануецца ўсталяваць дзве першыя суперхуткія станцыі магутнасцю да 350 кВт. Будаўніцтва станцый плануецца пачаць ужо ў наступным годзе. У Мінску комплекс з дзвюх вельмі хуткіх ЭЗС з'явіцца на вуліцы Убарэвіча.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НОВЫ ГОД У «ЧЫРВОНАЙ» ЗОНЕ

## Магілёўскія ўрачы расказалі, як будуць сустракаць свята на рабочым месцы

**Магілёўская бальніца № 1 з красавіка працуе як своеасаблівы ковідны цэнтр. Менавіта тут знаходзіцца большая колькасць хворых на небяспечную інфекцыю. І калі пацыенты сустракаюць Новы год на бальнічным ложку з вымушанай прычыны, то медыкам гэта прыходзіцца рабіць па абавязку службы.**

**Урач-кардыёлаг 1-га кардыялагічнага аддзялення бальніцы Віктар ЛЕЛІКАЎ** ужо, дарэчы, на пасту і зменіцца толькі заўтра — а 8-й гадзіне раніцы. Спадзяецца, што ноч будзе адносна спакойная, калі можна так сказаць. Бо калі ў цябе 50 «сардэчных» пацыентаў у аддзяленні, які можа быць спакой. Некалькі шчасліўчыкаў напярэдадні Новага года адправіліся дадому на самаізаляцыю — свята ўсё ж такі дапамагае хутчэй стаць на ногі, аднекуль бярэцца рэзервовыя сілы, але ложкі, як правіла, доўга не пустуюць.

Віктар ЛЕЛІКАЎ да Новага года ў «чырвонай» зоне падрыхтаваўся.

— Год цалкам адрозніваецца ад папярэдніх, такіх экстрэмальных яшчэ не было, — прызнаецца ўрач. — Шмат што прыйшлося памяняць у жыцці і рабоце. Пастаянна маскі, касцюмы — успрымаеш гэта ўжо як данасць. З красавіка, так жывём. І нават перадышкі не было. Калі іншыя медыцынскія ўстановы вярталіся да звычайнага рэжыму, то мы не. Пастаянна ў адным і тым жа рытме.

За 11 гадоў работы Віктар Лелікаў ужо трэці Новы год сустракае на рабочым месцы.

— А якая розніца, — паціскае ён плячыма. — Калі б не працаваў 31 снежня, прыйшлося б выходзіць 1 або 2 студзеня. Зараз адзін наш доктар на бальнічным, таму ў мяне яшчэ і 3 студзеня дзяжурства.

Работа, вядома, напружаная, трэба час ад часу разраджацца. Суразмоўнік робіць гэта з дапамогай шашак. Дарэчы, у апошнім абласным спаборніцтве сярод медработнікаў ён заняў першае месца. І павінен быў ехаць на рэспубліканскія гульні, але ковід перашкодзіў іх правесці. Адклалі спаборніцтвы да лепшых часоў.

Нават святы цяпер трэба адзначаць па новых правілах. Калі ў іншыя часы Новы год у кардыялагічным аддзяленні неяк адчуваўся — рознакаляровы дождж на сценах, яловыя галінкі, недзе нават ёлачныя ўпрыгожанні, то цяпер ніякай мішуры. Наогул нічога лішняга, бо дэзапрацоўка ідзе пастаянна. У палатах таксама ніякіх сюрпрызаў.

— Настрой падымаем выпіскай дадому, — разводзіць рукамі ўрач.

Больш аскетычна выглядае і ардынатарская, адзіная прыкмета Новага года — маленькая елачка, якую ўпрыгожылі ў стылі мінімалізму клапатлівыя рукі жаночага медперсаналу.

— Калі пашчасціць, то імгненне, калі б'юць куранты, сустрэну тут, — усміхаецца суразмоўнік. — На змене са мной дзяжурныя медсёстры і санітаркі. Павіншуем адно аднаго, вось і ўсё свята. Дома, вядома ж, падняў бы з маці або сябрамі келіх шампанскага, але гэта можна зрабіць і іншым часам. Зараз не да гэтага. Усе чакаюць спаду другой хвалі, але мы ў сваім аддзяленні пакуль гэтага не адчуваем. Вельмі шмат звяртаецца людзей, таму і напружанасць прысутнічае. Бывае, што ў «чырвонай» зоне цэлы дзень праводзіш. Але цешыць тое, што хваробу гэтую, дзякуй богу, не падхапіў. Таму і іншым раю захоўваць асцярожнасць, насіць маскі і трымаць дыстанцыю. Мне здаецца, што яшчэ не ўсе да канца разумеюць, як гэта сур'ёзна.

Праз некалькі гадзін заступае на змену **загадчык аддзялення гемадыялізу Магілёўскай бальніцы № 1 урач-нефролаг Максім САСНІН.** Смяецца, што на правах начальніка сам сабе зрабіў такі графік.

— Калі шчыра, то ўсё па справядлівасці, — тлумачыць ён. — Нас, урачоў, у аддзяленні трое, і трэба чаргавацца. Улічваючы, што свят шмат, кожнаму якім-небудзь прыйдзецца ахвяраваць.

— А як наконт прымаўкі, як новы год сустрэнеш, так яго і правядзеш? — пытаюся ў суразмоўніка.

— Гэта не аб нашай сітуацыі, — усміхаецца Максім. — У нас такая спецыфіка, што мы большую частку жыцця праводзім на рабоце. У нас, дарэчы, завядзёнка такая: хто працуе ў Новы год, той не працуе на стары Новы. Чуў, што калегі з іншых аддзяленняў таксама прытрымліваюцца гэтага правіла.

Урачоў такой спецыяльнасці, як у Максіма Сасніна, няшмат. Нядзіўна, што за 16 гадоў сваёй работы ён каля 10 разоў сустракаў Новы год на рабочым месцы або выходзіў на дзяжурства адразу ж 1 студзеня. Але, прызнаецца, пачуццё свята ўсё роўна прысутнічае. Сёлета, канешне, яно прытупілася прысутнасцю ковіду — нельга расслабляцца, трэба захоўваць супрацьэпідэмічны рэжым.

— У іншыя гады весялей было, — кажа ён. — Наш прафкам арганізуе конкурсы на найлепшае аздабленне аддзяленняў да Новага года і святочныя канцэрты, я часта ўдзельнічаю ў гэтых мерапрыемствах. Адпаведна, гэтым падымаю настрой сабе і іншым. Летась мы, напрыклад, першае месца ў спаборніцтвах на найлепшае афармленне занялі. Нават пацыентаў падключылі. У нас 35 пастаянных, якія лечацца на працягу некалькіх месяцаў і нават гадоў. За гэты час яны ўжо нам сталі, калі не як родныя, то як добрыя знаёмыя.

Сёлета навагодні настрой крыху адчуваецца толькі ў ардынатарскай, дзе стаіць невялічкая ёлачка з фанеры з драўлянымі цацкамі. А вось само аддзяленне засталося без ёлкі і гірлянду. Што рабіць, калі прыходзіцца пастаянна апрацоўваць памяшканні дэзсродкамі і апраменьваць бактэрыцыднымі лямпамі.

Максім САСНІН.

Максім не хавае, што год быў няпросты. Вельмі моцна змянілася работа стацыянара ў цэлым і аддзялення ў прыватнасці. «Для беларускай сістэмы аховы здароўя пандэмія была не зусім чаканай, тым не менш нашы медыкі з годнасцю вытрымалі гэты экзамен на трываласць», — лічыць урач. Нагрузка вельмі ўзрасла.

Акрамя пацыентаў, якія знаходзяцца на хранічным гемадыялізе, дадаліся і новыя, так званыя ахвяры ковіду. Адным з ускладненняў каранавіруснай інфекцыі з'яўляецца, у тым ліку і нырачная недастатковасць.

— Вельмі часта хворыя на каранавірусную інфекцыю, грып, іншае вострае рэспіраторнае віруснае захворванне забываюць запіваць гарачкапаніжальныя лекі і антыбіётыкі вялікай колькасцю вадкасці, — адзначае ўрач. — У выніку пачынаюцца праблемы з ныркамі. Ускладненні адбываюцца на фоне моцнага абязводжвання.

Звычайна аддзяленне на Новы год пусцее. Але сёлета ўсё па-іншаму. Пацыенты тут асаблівыя, працэдура гемадыялізу доўжыцца каля чатырох гадзін. І нават за адным пацыентам патрэбны пастаянны кантроль. А іх тут некалькі.

— Крыху, канешне, будзе спакайней, пацыенты таксама хочуць сустрэць свята дома, — адзначае Максім Саснін. — Хоць бывала ўсякае. Больш інтэнсіўная работа пачынаецца пасля свят, таму што звяртаюцца пацыенты з прыкметамі бурнай сустрэчы Новага года.

Ён згадвае той час, калі толькі пачынаў сваю ўрачэбную дзейнасць у якасці ўрача Быхаўскай ЦРБ. Бывала і такое, што людзей прывозілі нападпітку проста з ёлкі ў карнавальных касцюмах. У чалавека траўма, кроў ідзе, а яму ўсё роўна весела.

— Трапляюцца і такія пацыенты, якія, наадварот, на свята імкнуцца ў бальніцу. На выгляд цалкам дагледжаныя бабулі і дзядулі. Магчыма, ім сумна адным дома, — канстатуе ўрач.

У аддзяленні гемадыялізу, у адрозненне ад іншых, у кожнай зале, дзе пацыенты праходзяць сваё чатырохгадзіннае лячэнне, ёсць тэлевізары. Гэта хоць неяк дазваляе хворым падняць навагодні настрой.

— Ну а мы, калі ёсць вольная хвілінка, нават пад бой курантаў можам па смартфоне звязацца з роднымі, — кажа суразмоўнік. — Мая жонка таксама ўрач і ставіцца з разуменнем да таго, што свят у мяне амаль няма. Цяжэй гэта растлумачыць маім бацькам, а таксама братам і сёстрам. Дагэтуль не могуць прывыкнуць, што ў мяне дзяжурства ноч праз ноч, у святочныя дні, ды яшчэ і ў нядзелю могуць кудысьці выклікаць для кансультацыі. Але галоўнае не ў тым, пасядзеў ты за святочным сталом у навагоднюю ноч або не, а ў тым, які год будзе. Важна, каб у сям'і ўсё было добра і родныя не хварэлі. Для прафілактыкі захворванняў, у тым ліку ковіду, трэба прытрымлівацца здаровага спосабу жыцця. Я, напрыклад, бегаю. Але гэта не значыць, што кожны павінен таксама пераходзіць на бег. Можна плаваць, хадзіць або проста прагуляцца вакол дома.

— А ці ёсць у вас звычка загадваць жаданне на Новы год? Або на рабоце пра гэта забываеш? — цікаўлюся напаследак.

— Канешне, звычка такая ёсць. У мяне адно жаданне: каб сям'я расла і мацнела. Толькі ў гэтым сэнс нашага жыцця!

Летась аддзяленне гемадыялізу заняло першае месца ў спаборніцтве на найлепшае аздабленне да Новага года.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіваў Віктара ЛЕЛІКАВА і Максіма САСНІНА.**

# ЧАС ПЕРАД СВІТАННЕМ

## Успамінаем, якім быў самы незвычайны спартыўны год

**Адыходзячы 2020 год уся спартыўная супольнасць чакала з асаблівым трапятаннем і прадчуваннем. Аднак бязлітасны лёс распарадзіўся па-свойму: 2020 год увайшоў у спартыўную гісторыю не як алімпійскі, а як самы неардынарны і неадназначны.**

Пандэмія каранавіруса пасадзейнічала адмене Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў, паўплывала на іх правядзенне ў наступным годзе. Расходы на правядзенне галоўных стартаў выраслі на 2,85 мільярда долараў. Урачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця застануцца вялікім святам для спартсменаў і гледачоў, але ўжо не будуць суправаджацца яркімі і дарагімі шоу. Яны будуць адлюстроўваць сусветны вопыт барацьбы з каранавірусная інфекцыяй.

Больш за ўсё пандэмія каранавіруса паўплывала, канешне, на галоўных герояў алімпійскага руху — спартсменаў. Сарваныя планы, дадатковы год вялізных нагрузак — праз усё гэта прайшлі беларускія атлеты. Але разам з тым яны атрымалі дадатковую магчымасць удасканаліць фізічную і псіхалагічную формы, залячыць траўмы і зарабіць алімпійскія ліцэнзіі. Менавіта ў гэтым годзе ўсе даведаліся, што спаборніцтвы можна правадзіць анлайн. Зараз атлеты ўпарта рыхтуюцца, каб летам 2021 года здзівіць увесь свет. І, як адзначаюць спецыялісты, дзівіцца будзе чаму, бо немагчыма прадказаць, як кожны спартсмен справіцца з новымі рэаліямі.

### Прыгажосць уратуе спорт

У студзені 2020 года жаночая зборная Беларусі па індорхакеі выйграла чэмпіянат Еўропы, які праходзіў у мінскім Палацы спорту. На дамашніх спаборніцтвах беларускі ўступілі толькі зборнай Нідэрландаў, якую потым абыгралі ў фінале з неверагодным вынікам 4:3. Парадавалі аматараў і маладыя валейбалісткі. Нацыянальная жаночая зборная (да 19 гадоў) заняла трэцяе месца на чэмпіянаце Еўропы 2020. Дагэтуль беларуская «маладзёжка» заваёўвала медалі кантынентальнага першынства ў пачатку 2000-х гадоў.

У лютым жаночая зборная абыграла каманду Нідэрландаў у плэй-оф Кубка Федэрацыі з вынікам 3:2. Кульмінацыяй гэтай неверагоднай гісторыі мог бы стаць фінал Кубка Федэрацыі, запланаваны на красавік, але, як вядома, адменены. Беларуская каманда павінна была сустрэцца з сапернiцамі з Аўстраліі і Бельгіі і, шчыра кажучы, мела шанцы ўпершыню заваяваць галоўны трафей.

Арына Сабаленка ў 2020 годзе выйграла тры тытулы, атрымаўшы перамогі на турнірах у Досе, Лінцы, дзякуючы чаму вярнулася ў топ-10 сусветнага рэйтынгу. Незабыўным стаў кастрычніцкі турнір WTA ў Астраве. Упершыню ў гісторыі турніраў WTA ў фінале сустрэліся дзве беларускі — Вікторыя Азаранка і Арына Сабаленка. Наймацнейшай аказалася Арына: яна перамагла з вынікам 6:2, 6:2. Пасля гэтага разам з бельгійкай Элізэ Мертэнс яна заваявала «золата» ў парным разрадзе. Недарма правяла гэты сезон экс-першая ракетка свету. Вікторыя Азаранка выйграла турнір у Нью-Ёрку, дайшла да фіналу турніру ў Астраве і нават да фінальнай стадыі US Open. Поспехі беларускі пацвярджаюцца яе фенаменальным пераходам з 50-й пазіцыі ў сусветным рэйтынгу на 13-ю. У канцы года Вікторыя была ўдастоена тытулу «Вяртанне года» па меркаванні Жаночай тэніснай асацыяцыі.

Россып медалёў заваявалі гімнасткі. Толькі да пачатку пандэміі беларускія грацыі заваявалі восем медалёў на этапе Гран-пры ў Брно. Пасля былі вымушаны закрыцца на каранцін, але час не гублялі. Гэта пацвярджае «серабро» Аліны Гарнасько і «бронза» Настассі Салас на чэмпіянаце Еўропы, які прайшоў у Кіеве ў лістападзе.

Напрыканцы года галоўнай гераіняй спартыўных навін стала 17-гадовая плыўчыха Настасся Шкурдай. За кароткі тэрмін яна абнавіла сусветны юніёрскі рэкорд на 100 метрах батэрфляем. У межах Беларусі яе 55,64 секунды — новы нацыянальны рэкорд. Усяго ў мінулым сезоне Настасся пабіла тры юніёрскія сусветныя рэкорды.

Новы біятлонны сезон пачаўся на мажорнай ноце дзякуючы Дзінары Алімбекавай. На першых двух этапах Кубка свету яна замацавалася ў васьмёрцы наймацнейшых спартсменак, абнавіла некалькіх асабістых рэкордаў. Самы паспяховы для алімпійскай чэмпіёнкі пакуль трэці этап Кубка свету, дзе яна выйграла спрынт і заняла другое месца ў гонцы пераследу. Такі высокі вынік беларускія спартсменкі не паказвалі з 2018 года, калі на біятлонным небасхіле галоўнай зоркай была Дар'я Домрачава.

### Як за каменнай сцяной

Пераможныя традыцыі на ўвесь год задала нацыянальная мужчынская зборная па баскетболе. У лютым яна ўпэўнена пачала кваліфікацыю чэмпіянату свету 2023 года. У першым матчы папярэдняй групы «А» беларусы разгромілі каманду Кіпра з вынікам 97:41. А потым, ужо дома, абыгралі партугальскую каманду — 72:56. Затым была перамога над албанцамі — 90:50 і другая перамога над кіпрскімі сапернікамі — 89:53. У лютым 2021 года ў межах прэкваліфікацыі чэмпіянату свету — 2023 баскетбалісты сустрэнуцца з камандамі Партугаліі і Албаніі. Але дзякуючы таму, што зборная Беларусі — адзіная каманда, якая на гэтым этапе не пацярпела ніводнага паражэння, яна ўжо прайшла ў наступны этап адбору.

Знакаміты гандбольны клуб «Мяшкоў Брэст» сёлета правёў найлепшы ў сваёй гісторыі старт у Лізе чэмпіёнаў. З самага пачатку брэсцкія гандбалісты абыгралі ўладальніка галоўнага трафея паўночнамакедонскі «Вардар», самы багаты клуб Еўропы «Пары Сен-Жэрмен» з Францыі і моцных венграў з клуба «Пік». А ў матчы з нямецкім «Фленсбургам» мяшкоўцы аформілі гістарычную нічыю. Пасля дзевяці матчаў каманда мае ў актыве дзевяць балаў і займае трэцюю пазіцыю ў групе «А». Развіццё гэтай гісторыі абяцае быць вельмі цікавым.

Найлепшы плывец Беларусі Ілья Шымановіч сёлета быў шчодры на рэкорды. У лістападзе, выступаючы на Міжнароднай лізе плавання, абнавіў рэкорд Еўропы. Цяпер найлепшы вынік у 25-метровых басейнах брасам раўняецца 55,86 секунды. Пасля гэтага Ілья запланаваў пабіць і сусветны рэкорд. І як у ваду глядзеў. На чэмпіянаце Беларусі ён абнавіў сусветны рэкорд на дыстанцыі 100 метраў брасам на кароткай вадзе — 55,34 секунды. Увогуле, на рэспубліканскім першынстве Ілья па-добраму «разышоўся» ў аднаўленні рэкордаў: 50 метраў брасам (55,34 секунды) і 200 метраў брасам (2 хв. 77 сек.).

Найлепшым грэка-рымскім барцом свету ў катэгорыі 87 кілаграмаў сёлета быў прызнаны барысаўчанін Кірыл Маскевіч. Ён выйграў «золата» асабістага Кубка свету па грэка-рымскай барацьбе, які праводзіўся замест планетарнага першынства. Сваё лідарства ў айчыннным веласпорце замацаваў Яўген Каралёк. У гэтым сезоне ён заваяваў «золата» ў скрэтчы на чэмпіянаце свету ў Берліне. На чэмпіянаце Еўропы спартсмен заваяваў свой першы еўрапейскі медаль — «серабро» ў омніуме.

У 2020-м, упершыню з 2013 года, беларус падняўся на п'едэстал чэмпіянату Еўропы па спартыўнай гімнастыцы: Егор Шарамкоў заваяваў бронзавы медаль у вольных практыкаваннях і сярэбраны — у апорным скачку.

### Насуперак усяму

Пандэмія каранавіруса разбурыла планы ды надзеі і параалімпійцаў. Але хто, калі не гэтыя людзі, ведаюць, як змагацца з абставінамі і пры гэтым перамагаць. Святлана Сахоненка стала сярэбраным прызёрам у спрынце і бронзавым на кароткай дыстанцыі на Кубку свету па лыжных гонках і біятлоне ў Альтэнбергу. Юрый Голуб заваяваў сярэбраны медаль на кароткай дыстанцыі. У біятлоне Святлана і Юрый узялі бронзавыя медалі ў кароткай дыстанцыі і ў спрынце адпаведна. На гэтым этапе Кубка свету да іх далучыўся Васіль Шаптабой з «бронзай» у спрынце. На наступным этапе кубка па лыжных гонках і біятлоне ў Фінстэрау Святлана Сахоненка заваявала два сярэбраныя і адзін бронзавы медаль у лыжных гонках. А Юрый Голуб стаў бронзавым прызёрам у лыжным спрынце і сярэбраным прызёрам у біятлонным. Акрамя гэтага, у спаборніцтвах па біятлоне ён заваяваў «серабро» і «бронзу».

Хрысціна Феклістава заняла трэцяе месца на Кубку свету па фехтаванні на інвалідных калясках. На чэмпіянаце Еўропы па паравеславанні Людміла Волчак і Максім Мятлоў занялі 5-е і 6-е месцы адпаведна.

Беларусь штогод прымае мноства міжнародных спаборніцтваў па розных відах спорту. 2020 год адзначыўся малой колькасцю турніраў, якія праходзілі пераважна ў пачатку года. У лютым «Раўбічы» прымалі этап Кубка свету па фрыстайле. Ігар Дрэбенкаў і Макар Мітрафанаў адзіныя сярод беларусаў заваявалі медаль гэтых спаборніцтваў — «бронзу» ў сінхронных скачках. Больш паспяховым для гаспадароў быў другі старт у «Раўбічах» — чэмпіянат Еўропы па біятлоне. Сяргей Бачарнікаў аформіў пераможны дубль, выйграўшы «золата» ў суперспрынце і гонцы пераследу. Залаты медаль у гонцы пераследу заваявала і Алена Кручынкіна. А Ірына Крыўко стала трэцяй у спрынце. Медалёвыя поспехі далі беларусам магчымасць заняць першае месца ў агульным заліку чэмпіянату Еўропы.

Вясна і лета прайшлі без буйных міжнародных спаборніцтваў у Беларусі. Увосень сітуацыю выправіла фігурнае катанне. На традыцыйным Ice Star і наватарскім Winter Star — 2020 выступалі і беларускія, і замежныя спартсмены. Гаспадары паказалі, на што здольныя. Вікторыя Сафонава перамагла ў жаночым адзіночным разрадзе двух турніраў. Канстанцін Мілюкоў двойчы заваёўваў сярэбраныя медалі. Спартыўная пара Багдан Лукашэвіч і Аляксандра Сцяпанава таксама перамаглі на двух дамашніх турнірах запар.

### Чорная паласа

Непрыемнасцяў і трагедый у спорце таксама здарылася нямала. У 2020 годзе з жыцця пайшлі многія славутыя трэнеры, спартсмены і чыноўнікі. Беларуская каманда ўступіла нямецкай у матчы Кубка Дэвіса. Беларускія тэнісісты страцілі магчымасць прайсці ў фінальны розыгрыш. А чэмпіянат Еўропы па дзюдо — 2020 у Празе не прынёс беларускім спартсменам ніводнага медаля. Некаторыя беларускія спартсмены былі дыскваліфікаваны праз парушэнне допінгавых правіл.

Грандыёзны допінгавы скандал здарыўся ў сусветнай цяжкай атлетыцы. Нацыянальная зборная Беларусі знаходзіцца пад санкцыямі і не можа адправіць на алімпіяду больш чым двух спартсменаў. Цяжкаатлетка Дар'я Важнавец была адлучана ад спаборніцтваў праз наяўнасць у допінг-пробах забароненых прэпаратаў. У кастрычніку памёр галоўны трэнер мужчынскай зборнай Віктар Шаршукоў.

### Наперад у будучыню

Самай знакавай падзеяй для маладых беларускіх спартсменаў сталі III зімнія юнацкія Алімпійскія гульні, якія праходзілі ў студзені ў Лазане. Дарэчы, гэта адзіная «алімпійская» падзея гэтага года. Беларускія спартсмены заваявалі дзве ўзнагароды юнацкай алімпіяды. Біятланістка Юлія Кавалеўская стала бронзавым прызёрам. А хакеіст Ілья Корзун у складзе мультынацыянальнай каманды тры на тры заваяваў «золата». За крок ад п'едэстала засталіся канькабежцы Макс Фёдараў і Варвара Бандарына.

Рэванш маладыя беларускія канькабежцы ўзялі на дамашнім этапе Кубка свету сярод юніёраў. Турнір прайшоў у Мінску ў лютым. Аляксей Кірпічнік, Ягор Дамарацкі, Ганна Кавалёва, Кацярына Слоева, Яўген Болгаў і Яўгенія Вараб'ёва ў суме заваявалі дзевяць медалёў на розных дыстанцыях.

Для спорту 2021 год сапраўды стане пачаткам «новага жыцця». Пачнецца яно ў велагоншчыка Васіля Кірыенкі, футбаліста Аляксандра Глеба, гандбаліста Івана Броўкі, якія сёлета скончылі кар'еру. Пасля Алімпійскіх гульняў у Токіа развітаюцца са спортам многія выдатныя беларускія атлеты.

А пакуль увесь спартыўны свет прадчувае год, які будзе напоўнены духам спаборніцтваў, азартам барацьбы, новымі радасцямі і драмамі. І ён абавязкова будзе лепшым, чым год сыходзячы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ВАСІЛЬ БЫКАЎ СЯДЗЕЎ ПАД СЦІРТАЙ, КАРАТКЕВІЧА ШПУРНУЛІ НА СЦЭНУ, ШАМЯКІН ЕХАЎ У ЦЯГНІКУ І ПЛАКАЎ

## Як беларускія класікі сустракалі Новы год

**Таямнічасць, чаканне цуду, надзея... Каляды і Новы год ствараюць асаблівую атмасферу, якую прыемна аднаўляць у словах і вобразах... Падымае келіхі з палёнкай шляхціц Завальня, спароджаны фантазіяй Яна Баршчэўскага, у аповесці Змітрака Бядулі «Салавей» над палацам пана Вышамірскага «У цёмнае неба імчаліся з грукатам, з шыпеннем, з парахавым смуродам агнёвыя змеі ракет, ляцелі высока-высока і рассыпаліся ва ўсе бакі снапамі рознакаляровых іскраў-зорак»... У «Каласах пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча «Роў над сумятнёй і калатэчай збор вясковых музыкаў. Гулі дзве скрыпкі, пявуча вохкаў бас, мядзведзем раўла дуда, пяшчотна сапла жалейка, звонка ўдаралі цымбалы, і, вышэй за ўсё іншае, узлятаў, заліваўся і ўздыхаў бубен».**

**Але не толькі героі адзначалі зімовыя святы — а і самі аўтары! Вось толькі не заўсёды іх сустрэчы Новага года былі святочныя... Пісьменнік жа мусіць перажываць трагічныя часы разам са сваім народам. І занатоўваецца ім не тое, што звыкла, а тое, што ўражвае. Давайце ж пагартаем старонкі ўспамінаў, мемуараў, дзённікаў і даведаемся, як па-рознаму сустракалі Новы год і Каляды класікі беларускай літаратуры.**

### ЯКУБ КОЛАС ЕЎ ЛАМАНЦЫ І РАСТРЭСВАЎ НА СТОЛ СЕНА

Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, ён жа Якуб Колас, любіў шчырыя застоллі — яшчэ ад часоў сялянскага дзяцінства. Не заўсёды ж у яго пакручастым жыцці была магчымасць уволю пад'есці. Па ўспамінах малодшага сына Коласа, Міхася, на навагоднія святы, ужо ў пасляваенным Мінску (зразумела, што Каляды ўжо адзначаць не выпадала) у доме накрывалі стол, на якім была і верашчака, і халадзец, і бліны... Усё па-свойску... Колас жа пакінуў падрабязнае апісанне, як святкаваць па-беларуску — цэлы раздзел паэмы «Новая зямля» «Каляды». Паэма аўтабіяграфічная, адзін з сыноў лесніка Міхала, Кастусь, і ёсць будучы класік.

Перад тым як на стол ставіўся гаршчок з куццёю, на стол пад абрус Кастусь з братам натрасалі «сянца пахучага». На ялінцы віселі «валоскія арэхі» і цукеркі ў пазалочаных абгортках. Кожны, сеўшы за стол, клаў перад сабой аладку.

*«І вось вячэра зачалася!*
*Спыніцца мушу я на квасе:*
*Ён колер меў чырванаваты;*
*Тут быў таран, мянёк пузаты,*
*Шчупак, лінок, акунь, карась,*
*Кялбок і ялец, плотка, язь,*
*Яшчэ засушаныя з лета.*
*Але не ўсё яшчэ і гэта:*
*Аздоблен квас быў і грыбамі,*
*Выключна ўсё баравічкамі;*
*Цыбуля, перчык, ліст бабковы —*
*Ну, не ўясіць, каб я здаровы!*
*Пільнуй, — цішком скажу між намі,—*
*Каб і язык не ўцёк часамі.*
*За квасам елі верашчаку,*
*А потым блінчыкі на маку,*
*А там ламанцы-праснакі*
*З пшанічнай добрае мукі.»*

Навагодняе свята яшчэ і тым дарагое для сям'і Міцкевічаў, што менавіта на ёлцы ў Саюзе пісьменнікаў, яшчэ перад вайною, пазнаёміліся маленькі Міхась Міцкевіч і дачка Янкі Маўра Наталля. Бацька адмыслова звярнуў яе ўвагу на хлопчыка, які стаў галоўным героем яе любімай кнігі — «Міхасёвы прыгоды» Якуба Коласа. Пасля вайны Міхась і Наталля сустрэнуцца зноў, пажэняцца і пражывуць доўгае і шчаслівае сумеснае жыццё.

### ВАСІЛЬ БЫКАЎ НАЧАВАЎ У СЦІРЦЕ І РЭЗАЎ ХЛЕБ НЯМЕЦКІМ ШТЫХОМ

Каб даведацца пра навагоднія старонкі біяграфіі Васіля Быкава, пагартаем яго мемуары «Доўгая дарога дадому». Што ж, нават на фронце заставалася месца для святкавання, хоць самага сціплага:

*«Новы, 1944 год сустрэў пад сціртай у заснежаным полі. Як пацямнела, бой стаў сціхаць, — немцы таксама хацелі сустрэць навагоддзе. Старшына прынёс вячэру — пярловы суп. Той хоць і пляскаўся ў тэрмасе, але даўно прастыў і быў сцюдзёны. Хлеб дык і наогул змерзлы — секлі нямецкім штыхом. Але нам, тром афіцэрам, менавіта пад новы год выдалі доппаёк — па жмені сухога пячэння і баначку шпротаў на трох. Жуючы з кішаня тое пячэнне, я і задрамаў пад сціртай, не дачакаўшыся запаветнага часу змены году.*

*А недзе на золку паднялі — батальён рушыў у наступ».*

### МАКСІМ ЛУЖАНІН ПІСАЎ ЛІСТ І ГАРЭЎ АД ЦЁМНАГА КАХАННЯ

Аднойчы за навагоднім бяседным сталом у сям'і Якуба Коласа прысутнічаў і яго асабісты сакратар, Максім Лужанін, са сваёй жонкай Яўгеніяй Пфляўмбаўм.

У 2011 годзе, у №№ 6 і 7 часопіса «Нёман» было надрукаванае ліставанне паміж Максімам Лужаніным і Яўгеніяй Пфляўмбаўм. Абое былі паэтамі «Маладняка», іх сумеснае жыццё аказалася доўгім і адлюстравала ўсю эпоху. Лужанін, чыё сапраўднае імя Аляксандр Каратай, у 1933-м быў арыштаваны і сасланы. Яўгенія, «Жэнь», як зваў ён яе, паехала за сваім «Алем» у высылку... Потым нейкі час жылі з Яўгеніяй у Маскве, дзе былі яе бацькі, потым Аль трапіў на фронт... У іх лістах неймаверная моцы пачуцці выказваюцца ў неверагоднай прыгажосці словах. На сутычцы 1942-га і 1943-га Лужанін ачуньваў пасля цяжкага ранення, атрымана пад Сталінградам. Навагоднюю ноч ён прысвяціў напісанню ліста да жонкі:

*«Я маю права гаварыць проста ў гэтыя апошнія дні майго апошняга года, таму што не маю ўжо ніякіх правоў, як і ўсё, што стаіць па той бок. Не даў мне бог кахання да цябе простага, ціхага і празрыстага, якое патрэбнае цяпер, «каб адпачыць», а разарваў, бязлітасны, душу і ўсыпаў у яе вуголлі, але не спакойныя і ласкавыя, як у маленькай пячурцы тваёй, а з сінім агнём, дымныя і курныя, — узнагародзіў мяне каханнем цёмным, злым, не даруючым, з болем, пакутай, рэўнасцю. Не даў ён мне добрага таго кахання, як не даў начам маім сну, апошнім дням спакою. Ноч. Стары, выпрабаваны спосаб — ліст. Раней не хапала дыхання для патрэбнага слова, зараз — нельга сказаць яго тады, калі гэта неабходна, калі яно асабліва яснае і гарачае. Таму пішу сёння, — словы пачалі ўскіпаць толькі ў гэтую навагоднюю ноч, сумеснасць якой прадказала ноч 1941 г., што сустрэнем мы бутэлечкай віна толькі ўдваіх. Забылася? Прадказала, а спакою не прынесла. Што ад яго, ад блукання з кута ў кут, калі валіцца кніга з рук, на шматкі разрываецца папера, і ўсё звернутае да цябе адскоквае, як ад брані. А ўнутры агонь, трывожны, ні на імгненне не згасае, які ператвараe ў попел волю да жыцця, любоў да яе. Як і некалькі годоў таму, ён нічога не пакідае, акрамя сябе ды вось такіх жа напружаных, скрываўленых лістоў».*

Можаце быць упэўненыя, што каханне Жэнь да Аля, нягледзячы на такое вось экспрэсіўнае пісьмо, вытрымала ўсе выпрабаванні — пераканайцеся, прачытаўшы лісты самой Пфляўмбаўм. Да канца свайго доўгага жыцця яна была побач з каханым мужам, пісала вершы ў стол, дапамагаючы яму ў літаратурнай працы.

### УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА ЖАНЧЫНА КУЛЬНУЛА ЗА НОГІ НА СЦЭНУ

У кнізе Адама Мальдзіса «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча» апавядаецца незвычайная навагодняя гісторыя, пра тое, як ён запрасіў сябра на Новы год у свае родныя мясціны.

*«А аднойчы, калі мы прыехалі ў Гудагай разам сустрэць Новы год, з ім здарыўся такі анекдатычны выпадак. Назаўтра вечарам усе мы пайшлі ў клуб, каб паглядзець купалаўскіх «Прымакоў». Хтосьці з самадзейных артыстаў пазніўся, і Валодзя, стомлены чаканнем і папярэдняй бяссоннай ноччу, ціха прыдрамнуў. Перапоўненая зала гучна выказвала незадавальненне ўсёй затрымкай вядучай вечара, дачцэ гудагайскага ўчастковага міліцыянера Голубева, і яна, даведаўшыся ад маці, удзельніцы ўчарашняй сумеснай сустрэчы Новага года, аб прыездзе пісьменніка, выйшла на сцэну і гучна абвясціла:*

*— Таварышы! Сярод нас прысутнічае вядомы беларускі паэт Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч! Просьба на сцэну.*

*Зала заапладзіравала. Хтосьці штурхнуў Караткевіча: цябе! І ён з яўным незадавальненнем выйшаў уперад. Але на сцэну не ўзышоў, а толькі прысланіўся да яе. Пачаў пакрыўджаным голасам:*

*— Людзі добрыя! Учора быў Новы год, сёння таксама свята. Вы стомленыя, я змораны... То якога ж яшчэ выспятка ад пана бога вам трэба?!*

*Нейкая развясёлая і дзябёлая жанчына, што сядзела ў першым радзе, рашыла, што чалавек такім чынам крыўляецца, смяшыць публіку. І, каб было яшчэ смяшней, падбегла да Караткевіча, схапіла яго за ногі і кульнула на сцэну. Валодзя ўзняўся і неяк безнадзейна махнуў рукой:*

*— Калі так, то не трэба! — і вярнуўся на сваё месца.*

*Праўда, у канцы вечара, каб рэабілітаваць сябе і Голубеву, усё ж прачытаў пару вершаў, у тым ліку пра зайца, што варыць піва.*

*Назаўтра мы пачалі фантазіраваць на тэму, які цяпер душэўны стан у той жанчыны.*

*— Разумееш, Валодзя, а раптам яна ўсвядоміла, якога чалавека кульнула. Ці яе разыгралі адпаведна. Пасмяяліся, што ў гісторыю ўвойдзе, пакарана будзе... І яна сёння пакутуе. Думае, канчаць жыццё самагубствам ці не...*

*— Што ж мне рабіць? — Караткевіч яўна не зразумеў жарту.*

*— Узяць паўлітэрка і пайсці да яе. Вывесці з трансу... Вунь, праз акно відаць яе дом.*

*І трэба ж такому здарыцца, што, ступіўшы пару крокаў на вуліцу, Валодзя сутыкнуўся з той жанчынай. Разыграная кімсьці, мусіць, участковым, яна ішла да нас «мірыцца з пісацелем», несучы з сабой сумку з прыпасамі... Расчулены Караткевіч спыніўся, пацалаваў яе ў лоб. Увогуле Валодзя не крыўдаваў за цікавыя розыгрышы».*

### ІВАН ШАМЯКІН ЕХАЎ У ЦЯГНІКУ НА ПАХАВАННЕ

Розныя сустрэчы Новага года былі і ў жыцці Івана Шамякіна — і ў вясковым дзяцінстве, і на фронце, і сярод шумлівай творчай грамады... У кнізе ўспамінаў «Роздум на апошнім перагоне» пра 1982 год Шамякін піша:

«Для мяне ён пачаўся чадам. Я пачаў баяцца сам сябе: куды ні кінуся — выпіўка. Напярэдадні Новага года сабраліся «генералітэтам» БелСЭ. Выпілі. Сустрэча Новага года — бралі патроху да чатырох гадзін раніцы. Першага трымаўся, хоць паўшклянкі кабернэ выпіў».

А яшчэ ў той жа кнізе класік успамінае, як у снежні 1965 года яго бацька трапіў у добрускую бальніцу.

*«У пераднавагодні вечар я, вясёлы, радасны, пайшоў у ГУМ — купляць дзецям падарункі. Хадзіў доўга — навагоднія чэргі. Вярнуўся і з парога, па тым, як ціха сядзелі дзеці, пачуў, што нешта здарылася. Глянуў на Машу — здагадаўся. «Бацька?» «Бацька». І зрабілася мне вельмі балюча. Я зарыдаў. Ехалі з Машай у пустым вагоне. Праваднікі страчалі Новы год, у вагоне было холадна, няўтульна. Спаць не мог. Боль прытупіўся, але наплыў, як туман, апатычны смутак, здавалася, што я хаваю палавіну ўласнага жыцця, а другая палавіна — у тумане невядомасці».*

А 31 снежня 2003 года хворы Шамякін з горкай іроніяй запісвае ў дзённік: «З Новым годам, Іван, сын Пятроў. Трымайся, дзядуля!

### МАКСІМ ТАНК САЧЫНЯЎ ВІНШАВАННЕ ЯКУБУ КОЛАСУ

Калі пачалася вайна, Максім Танк разам з іншымі пісьменнікамі адпраўіўся ў эвакуацыю, каб пасля далучыцца да працы ў вайсковых выданнях. 31 снежня 1941 года ён пакідае ў дзённіку запіс:

«Нешта наша машына, як загнаны конь, пачынае прыставаць. Каля нейкага згарэлага пасёлка заечы след перасек нам дарогу. Мо як у тую памятную ноч пад Бранскам, калі ледзь не трапілі ў варожую пастку, зноў мы збіліся з дарогі. На прыпынку М. Лынькоў з К. Крапівой нешта звяраюць на карце.

А вецер мяце, як у блокаўскай паэме «Дванаццаць», і мы ўсё больш і больш аддаляемся ад сваёй Радзімы, і ніхто з нас не ведае «Што там напарадзе?» (А. Гарун)».

Было тады марозна і завейна... А вось 1952-гі прыходзіў зусім іначай:

«Новы год сустракалі ў Лыньковых. Віншавальныя тэлеграмы ад Пракоф'ева, Сіманава, Браўна, Камісаравай, Кабзарэўскага. Перадрукаваў напісаны ўчора верш «У Рандальсволе». Ідзе густы мокры снег. Быў з Любашай на прэм'еры оперы С. Манюшкі «Страшны двор», лібрэта якой калісьці ўгаварыла мяне перакласці Л. П. Александроўская. Збіраюся паглядзець кітайскі ансамбль, які прыехаў да нас на гастролі. Цяжка захварэў Пімен. Трэба будзе яго наведаць у лечкамісіі, дзе ляжыць і А. Вялюгін. Чытаю дзённікі Дэлякруа. Увесь вольны час забірае партвучоба. Добра, што ў нас цікавыя і выдатныя выкладчыкі Г. Якоб, Шуцкі...

А на дварэ няспынна імжыць і імжыць дождж».

Наступны, 1953, год Максім Танк сустракаў у Доме творчасці ў Каралішчавічах. І напярэдадні свята быў заняты тым, што сачыняў віншаванне для Якуба Коласа:

*«Паколькі настала з снягамі зіма,*
*А ў доме яшчэ тэлефона няма,*
*У светлае ў навагоднее ранне*
*Фотатэлеграмнае шлю прывітанне.*
*Жадаю ад сэрца здароўя і сілы,*
*Каб з чаркаю, а не з лякарствам дружылі,*
*І так, як у песні, якую Вы пелі,*
*Гадоў не лічылі Вы і не старэлі».*

Жадаю ж вам, шаноўныя чытачы, каб вашы зімовыя святы апынуліся светлымі і спраўдзілі самыя цудоўныя надзеі. І няхай кнігі беларускіх класікаў стануць для вас найлепшымі сябрамі і дарадцамі.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# СУСТРАКАЕМ НОВЫ ГОД РАЗАМ!

**Да самага чароўнага свята застаюцца лічаныя гадзіны. Паўсюль адчуваецца навагодняя атмасфера. Дадаць у яе палітру сваю «ноту» па традыцыі жадаюць і тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі. Ужо можна заўважыць на экране навагоднія лагатыпы і тое, як змяніўся выгляд студый навін, пачуць і ўбачыць віншавальныя міжпраграмныя відэазамалёўкі і тэматычныя выпускі фірменных праграм. А таксама паглядзець навагоднія серыялы, выбраць гульнявыя і мультыплікацыйныя кінастужкі на любы густ.**

А вось у апошні дзень 2020-га года «Беларусь 1» прапаноўвае гледачам падвесці вынікі года з інфармацыйна-аналітычным праектам «Панарама» і ў кампаніі журналістаў Агенцтва тэленавін. У 23.50 на ўсіх тэлеканалах медыяхолдынга выйдзе навагоднае віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. У першы ж дзень 2021-га ў 10.50 гледачоў чакае паказ дабрачыннага свята для дзетак «Галоўная ёлка краіны», а ў 15.10 — тэлеверсія навагодняга маладзёжнага балю ў Палацы Незалежнасці. І, вядома, святочны кінамарафон.

На «Беларусь 2» — фільмы, спецыяльныя выпускі праграм «Уключайся!», «ПІН_КОД», «Вежа», «Камень, ножніцы, папера» стануць сапраўдным гідам па традыцыях навагодніх свят.

Сацыякультурны канал прапануе гледачам прыгатаваць нацыянальныя стравы да святочнага стала ў праграме «Беларуская кухня» і праверыць сваё веданне роднай мовы ў тэматычным выпуску віктарыны «Сваімі словамі». А вось прыхільнікаў оперы чакае асаблівы сюрпрыз — вы зможаце ўбачыць святочную праграму рэжысёра-пастаноўшчыка Галіны Галкоўскай «Навагодні маскарад», дзе вядучыя артысты і салісты Вялікага тэатра прымераць на сябе вобразы куміраў мінулага стагоддзя. А музычным упрыгажэннем навагодняй ночы стануць канцэртныя праграмы «Новы год у класічным стылі» аркестра і хору Белтэлерадыёкампаніі і «Казкі венскага лесу» Іагана Штраўса ў выкананні сімфанічнага аркестра Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Вясёлых і чароўных вам свят!

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 130

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя літоўскімі майстрамі шашачнай кампазіцыі. У шашкі-64 праблемы склаў Рымас Мацкявічус, а мініацюры ў шашкі-100 Валдас Беляўскас.

№ 145



№ 145

Белыя простыя шашкі: b6, c7, d2, h2 (4)

Чорныя простыя шашкі: a5, b2, b4, f2, g5, h4 (6)

№ 146

Белыя простыя шашкі: c1, g1, b2, h2, c5, g5, b6, d6, h6, e7 (10)

Чорныя простыя шашкі: f2, e3, g3, d4, f4, f6, g7, d8, f8 (9)

№ 147

Белыя простыя шашкі: g1, g5, b6, d6, h6, g7 (6)

Чорныя простыя шашкі: f2, a3, c3, e3, d4, e7, b8, f8 (8)

№ 148

Белыя простыя шашкі: 11, 21, 41, 42, 43, 44 (6)

Чорныя простыя шашкі: 06, 13, 23, 28, 32, 34 (6)

№ 149

Белыя простыя шашкі: 21, 23, 24, 25, 30, 40, 43 (7)

Чорныя простыя шашкі: 09, 11, 15, 28, 32, 33, 42 (7)

№ 150

Белыя простыя шашкі: 07, 11, 14, 20, 41, 42, 43 (7)

Чорныя простыя шашкі: 16, 25, 28, 32, 33, 36, 40 (7)

№ 151

Белыя простыя шашкі: 07, 10, 11, 41, 42, 43 (6)

Чорныя простыя шашкі: 16, 28, 32, 33, 36, 40 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

У кубку гібрыднай лігі Hybrid League Cup — 2020 упэўнена перамог Сцяпан Дарашэнка з Жодзіна, які нядаўна выканаў нарматыў майстра спорту Рэспублікі Беларусь. Турнір праводзіўся на сайце lidraughts.org, у ім узялі ўдзел 36 шашыстаў з розных краін свету.

№ 152 M. Monzana — С. Дарашэнка

Белыя простыя шашкі: 24, 27, 29, 32, 34, 37, 39, 40, 43, 45, 48, 49 (12)

Чорныя простыя шашкі: 2, 3, 8, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 20, 23, 25 (12)

Чорныя напалі 1...1419! 2.4035 1930 3.3524 1721! і ад пагрозы 2328 выратавання няма.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 129 Ад 18.12.20.

№ 137 1. g5-f6 e7:g5 2. f4:f8 h2:d6 [ 2...h2:d2 3. e1:c7 b8:f4 4. d4:b6 a7:c5 5. f8:b4+

3. e3-f4 c5:g5 4. f8:a3 b6-a5 5. e1-f2 g5-f4 6. a3-c1 a5-b4 7. c1:h6 a7-b6 8. f2-e3 b4-a3 9. e3-f4 b6-c5 10. h6-g7 b8-c7 11. g7-h8 c7-d6 12. h8-g7 c5-b4 13. g7-h8 d6-c5 14. f4-e5 +

№ 138 1. g5-h6 c5:g1 2. e1-f2 g1:g7 3. h6:a7 h4:f2 4. a7:g1 +

№ 139 1. c7-b8 h4:f2 [ 1... a5:e5 2.b8:c5 h4:f2 3. c5:g1 ]

2. d6-e7 d8:f6 3. b8-f4 a5:c7 4. f4:e1 c7-d6 5. e1-f2 6. f2-e3 e5-f4 7. e3:g5+

№ 140 1. f2-g3 h2:d6 2. b4-a5 d6:b4 3. a5:c7 d8:b6 4. d4-e5 f6:d4 5. h4:h8 +

№ 141 1. h4-g5 e5:c7 2. g5:c1 h2:f4 3. c1-d2 b4:d6 4. d2-e3 f4:d2 5. b2-c3 d2:b4 6. a3:e7 f8:d6 7. h6:c5

№ 142 1. 28-23 19:37 2. 29-23 12:43 3. 23:03 40:20 4. 03-26 25:34 5. 26:50

№ 143 1. 28-23 19:37 2. 29-23 12:43 3. 23:03 40:20 4. 03-26 25:34 5. 26:22 06-11

[ 5...45-50 6.22-17 50:11 7.16:07 x ] 6. 16:07 45-50 7. 22-06 50-45 8. 07-01+

Першыя дакладныя адказы даслалі В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобласць, Баранавіцкі раён, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Бурко (Орша).

Пішыце на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда», 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







# Настройцеся на пазітыў, прапішыце мэты і святкуйце ад душы!

**Праводзіць стары год і сустракаць новы пад гукі любімых мелодый для многіх з нас — добрая сямейная традыцыя, без якой не абыходзіцца ніводнае гэтае свята. І таму тэлеканал «Беларусь 1» падрыхтаваў для сваіх гледачоў падарунак ад творчай каманды медыяхолдынга і любімых артыстаў беларускай эстрады. У апошнія гадзіны адыходзячага года нас чакае музычна-харэаграфічная шоу-праграма «Новы год на Беларусь 1».**

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Здымкі яе праходзілі ў найбуйнейшым павільёне кінастудыі «Беларусьфільм» на працягу некалькіх дзён на спецыяльна спраектаванай сцэне. Аляксандр Саладуха, Ірына Дарафеева, Юлія Быкава, Вікторыя Алешка, Жанэт, Алена Ланская, сёстры Груздзевы, Святлана Агарвал і многія іншыя артысты будуць гэтым вечарам спяваць для беларусаў свае найлепшыя песні ды усветна вядомыя хіты і агучваць святочныя віншаванні.

— Гэты год быў насычаны і запомніцца мне рознымі падзеямі, але самая яркая — гэта мая спраўджаная мара трапіць на дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2020», — дзеліцца **прадстаўніца Беларусі на конкурсе Арына ПЕХЦЕРАВА.** — Я шчыра хачу пажадаць усім, каб і вашы мары здзяйсняліся. Смела ідзіце да сваіх мэт і ніколі не здавайцеся. І яшчэ вельмі моцна верце ў сябе!

Усе два дні здымак у сценах кінастудыі чуліся музыка, смех і гучалі радасныя галасы. Якраз на такіх канцэртах часам можна сустрэцца з калегамі-журналістамі і з выканаўцамі, пад чые песні заўсёды хочацца марыць пра добрае і светлае свята, каханне, цуд... Пасля аднаго з такіх выступленняў «перахапіла» **спявачку Юлію БЫКАВУ,** якую многія ведаюць як салістку гурта Aura. Вырашыла запытаць, як яна ўспрымае навагоднае свята і дзе плануе пачуць бой курантаў.

— Думаю, сёлета Новы год мы сустрэнем дома ў сямейным коле. Я гэтаму вельмі радуюся, бо ў нас цудоўныя дзеці, з якімі мне хочацца праводзіць як мага больш часу. Мы з імі ўпрыгожылі ёлачку і дом. Зараз жывём у прадчуванні свята, — кажа артыстка. — З дзяцінства ў мяне Новы год асацыюецца з чымсьці чароўным... Пах хвоі, мандарынаў, любімая ежа — усе гэтыя рэчы стварааюць атмасферу свята. Таксама я веру ў прыкмету: як Новы год сустрэнеш, так ён і пройдзе. Таму імкнуся ні з кім не пасварыцца ў гэты дзень. Але калі нейкія непрыемнасці і трапляюцца, то, думаю, не варта адразу думаць пра дрэннае. Заўсёды лепш канцэнтравацца на пазітыве, што б ні здарылася. З уласнага вопыту скажу, што лепш за ўсё сустракаць Новы год дома — тады свята атрымліваецца па-сапраўднаму душэўнае. Жадаю ўсім нам у Новым годзе дабрыні, шчасця (яно ў кожнага сваё), кахання і здароўя! Умейце ва ўсім заўважаць добрае і светлае!..

Трэба заўважыць, што кампанію артыстам складуць вядомыя асобы на Беларускім тэлебачанні — усе тыя, хто на працягу года кожную раніцу зараджаў тэлеаўдыторыю бадзёрасцю і добрым настроем на ўвесь дзень, хто першы расказваў пра галоўныя падзеі ў краіне і свеце, хто дзяліўся праверанымі рэцэптамі здароўя і прыгажосці і хто быў тэлегідам у свеце высокага і прыгожага.

Кампазіцыі і артысты на сцэне змяняюцца з невялікімі перапынкамі, а мы з фотаграфам не марнуем час і вітаемся за кулісамі з маладой **артысткай і тэлевядучай праекта «ПІН_КОД» Хеленай МЕРААІ.** Цікаўлюся, можа, яна ведае нейкі рэцэпт, як выратаваць сітуацыю і стварыць сабе навагодні настрой, калі здаецца, быццам уся гэтая святочная мітусня больш раздражняе, чым радуе? Мая суразмоўніца пагаджаецца, што з узростам навагодняе свята пачынае ўспрымацца ўжо не так, як у дзяцінстве, калі асацыюеш яго з цудамі і падарункамі.

— Ведаеце, у мінулым годзе мы прапусцілі бой курантаў. Усяго некалькі хвілін, і ўсё — магія знікла. І вось тады я і задумалася аб тым, якой чароўнай сілай мы надзяляем гэты, здавалася б, звычайны дзень. Таму, калі так атрымаецца, што святочны настрой знікне, то перш за ўсё не варта сядзець пад пледам і шкадаваць сябе. Бяром паперу і аловак і пішам свае мэты на наступны год. Прычым вельмі важна рабіць гэта мінаўта ад рукі. Гэта запускае творчы працэс, бо спачатку ты думаеш, чаго хацелася б, потым абдумваеш, як дасягнуць пастаўленых мэт. І ў выніку і настрой прыходзіць, бо ўжо заматываваў сябе на штосьці, — кажа Хелена Мерааі. — А вось калі задумацца пра нейкую атрыбутыку свята, то я не асабліва люблю і надаю значэнне ялінцы, аздабленню дому і іншым рэчам, але аліўе прыгатаваць і пачысціць усім мандарынкі для мяне ў радасць! Таму жадаю ўсім, каб вашы мары і жаданні спраўджваліся. Галоўнае, дзейнічайце!

...Што ж, і праўда, час завяршаць святочную падрыхтоўку. Настройцеся на свята і ўспомніце ў гэтыя дні пра тых людзей, якім вы ўдзячныя. Новы год вось ужо амаль перагарнуў чарговы лісток календара. Але без вашага добрага настрою, душэўных пажаданняў і пазітыўнай энергіі гэта будуць проста лічбы. Таму напішыце і стварыце сваімі рукамі тую казку, якая зноў верне вам веру ў цуд навагодняй ночы. І паглядзіце канцэрт — там дакладна пачуеце тую музыку, якую захочацца зрабіць саўндтрэкам да 2021-га.

**Алена ДРАПКО.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 13.05 Меладрама «Паспець усё выправіць». 1—4-я серыі (16+).**
**14.40, 15.25, 18.30, 19.20 Меладрама «Акушэрка». 1—4-я серыі (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.05** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**21.55 Меладрама «Клуб падманутых жонак». 1-я серыя (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.35** Тэлебарометр.
**9.05** «Панаехалі. Канікулы ўсляпую» (16+) [СЦ].
**10.00** Камень, нажніцы, папера (16+).
**10.35** «На тыдзень» (16+).
**11.25** «Паненка-сялянка» (16+).
**12.15 Баявік «Новы Чалавек-павук: высокае напружанне» (12+).**
**14.35** Анімацыйны фільм «Добры дыназаўр» (12+).
**16.05** Анімацыйны фільм «Прыгоды Цінціна: таямніца Аднарога» (12+).
**17.50** «Мяняю жонку» (16+).
**20.05** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.05** Хачу ў тэлевізар!
**23.10 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35,12.20** «Беларуская кухня». Мачанка.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.40** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 17.30 «Залатое цяля». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15 «Васіліса Прыгожая». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**14.25** «Спявае Беларусь». Фальклорнае песеннае шоу. Ансамбль народнай песні і музыкі «Траецкія музыкі» (г. Барысаў, Мінская вобласць).
**15.20, 21.45 «Следапыт». Маст. фільм (12+).**
**16.50** «Люблю і памятаю». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Генадзь Шкуратаў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Валянціна Талкунова (12+).
**23.15** «Жывая спадчына». Выраб дываноў у тэхніцы аплікацыі саломкай па тканіне (в. Рухава, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10, 12.25, 22.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**9.10** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**9.40** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Авангард» (Омск).
**11.40** Вялікі спорт.
**14.25** Біятлон. Калядная гонка — 2020. Масстарт. Мужчыны. Жанчыны.
**15.20** Біятлон. Калядная гонка — 2020. Гонка пераследу. Мужчыны. Жанчыны.
**16.20** Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). 1/4 фіналу.
**18.20** Вось гэта спорт!
**18.35** Гульні «на выраст».
**19.10** Спорт-цэнтр.
**19.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**20.20** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама» (Масква). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**0.50** Бокс. Міжнародны турнір.
**2.00** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. 1/2 фіналу.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.35** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.10** «Жыццё іншых» (12+).
**11.15** «Бачылі відэа?» (6+)
**12.10** «Угадай мелодыю» (12+).
**13.15 Серыял «Султан майго сэрца» (16+).**
**16.20, 18.20, 18.55** «Ледніковы перыяд» (0+).
**18.50** Удача ў прыдачу! Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Сонечны круг» (16+).**
**23.05** «Сёння ўвечары» (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.15** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.50, 16.50 «Бацькі». Серыял (16+).**
**20.30, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Міншчына».
**21.55** «Глядзець усім!» (16+)
**0.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).

## МІР

**5.00** Мультфільмы (0+).
**6.35 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (12+).**
**9.25** «Як у рэстаране» (16+).
**10.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Маст. фільм «Як Іванка дурань па цуд хадзіў» (0+).**
**12.00 Маст. фільм «Зігзаг удачы» [СЦ] (12+).**
**13.40 Маст. фільм «Жандар у Нью-Ёрку» [СЦ] (12+).**
**15.45 Маст. фільм «Мая мама-снягурка» (12+).**
**17.30 Маст. фільм «Каханне прэт-а-партэ» (12+).**
**19.15 Серыял «Гардэмарыны, наперад!» [СЦ] (12+)**
**1.25 Маст. фільм «Таямніца чатырох прынцэс».**
**2.55 Серыял «Тут» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**10.45** «Плюс-мінус».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Серыял «Сваты» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.20** «У людзях».
**15.05** «Ізмайлаўскі парк» (16+).
**15.50, 17.00 Серыял «Таямніцы следства-18» (12+).**
**21.05, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі. Рэанімацыя» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.10** Формы жыцця. Лясныя гісторыі (6+).
**6.20** Беларусы (6+).
**6.50** «Здароўе» (12+).
**7.35** Зламаць стэрэатыпы (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.15 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.05, 10.15 Камедыя «Выкрасці Бельмандо» (12+).**
**11.20 Серыял «Каманда» (16+).**
**13.00** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**13.25 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы Радзімы» (16+).**
**15.20** «Чакай мяне» (12+).
**16.15, 19.20, 21.30, 23.25** Сёння. Галоўнае.
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55 Серыял «Пёс» (16+).**
**19.35, 21.35 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**
**23.40** «Справа ўрачоў» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.25, 17.55, 21.05, 1.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.35** «Мультпарад». «Качыныя гісторыі» (6+).
**7.30, 15.30, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Зорны шлях» (12+).**
**8.35 Трылер «Чужыя» (16+).**
**10.35 Дзётэктыў «Таямніцы зялёнай травы» (12+).**
**13.50 Серыял «Дзённікі вампіра» (16+).**
**14.35 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).**
**16.35 Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).**
**18.00 Серыял «ОА» (16+).**
**19.15** «Суперлато».
**20.00 Серыял «Дзіўныя гісторыі» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Камедыя «11 сяброў Оўшэна» (12+).**
**23.10 Трылер «12 сяброў Оўшэна» (16+).**





## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.35** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.25** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Галілеа» (12+).
**11.00** «Шоу выхаднога дня» (16+).
**12.00** «Наш рамонт» (16+).
**12.30** Прыгоды «Смурфікі» (12+).
**14.15** Прыгоды «Смурфікі-2» (12+).
**16.00, 21.00, 0.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**16.45** Фантастыка «Чалавек-павук: вяртанне дамоў» (12+).
**19.00** Фантастыка «Прыбыццё» (16+).
**22.25** «Стэндап андэграўнд» (16+).
**23.20** «Зала чакання» (16+).
**1.25** «Рогаў у справе» (16+).
**2.15** «Проста кухня» (16+).
**4.15** «Даеш моладзь» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Пешшу...» Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт.
**7.05** «Ліса і воўк», «Лятучы карабель», «Таямніца трэцяй планеты». М/ф.
**8.25** «Лібрэта». К. В. Глюк «Арфей і Эўрыдзіка». Анімацыйны фільм.
**8.40, 1.00** «Варатар». Маст. фільм.
**9.55** «Звычайны канцэрт».
**10.25** Кіно пра кіно. «Зімовы вечар у Гаграх». У чачотцы галоўнае — кураж!» Дак. фільм [СЦ].
**11.05** «Зімовы вечар у Гаграх». Маст. фільм [СЦ].
**12.30** «Археалогія. Гісторыя з лапатай». Дак. серыял [СЦ].
**13.00, 0.05** «Прыматы». Дак. фільм [СЦ].
**13.55** «Лібрэта». Л. Дэліб «Капелія». Анімацыйны фільм.
**14.10** «Арабэла». Серыял.
**15.40** «Тыя, з якімі я... Старонкі ВГІКаўскага жыцця» [СЦ].
**16.10** Урачыстае закрыццё XXI Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Шчаўкунок». Гала-канцэрт лаўрэатаў.
**17.45** Прыгожая планета.
**18.00** Рэпартажы з будучыні. «Куды вядуць чыгункі». Дак. фільм [СЦ].
**18.45** «Па запалкі». Маст. фільм [СЦ].
**20.20** Фільм Барыса Дабрадзеева «Кастуся і Віталь».
**22.00** «Джонатан Стрэндж і містар Норэл». Серыял. 1-я і 2-я серыі.
**2.10** «Хто раскажа байку?», «Ух ты, гаворачая рыба!», «У сінім моры, у белай пене...», «Бач ты, Масленіца!», «Кантакт». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1984-ы. 1-я частка. 2011 год (16+).
**7.00, 9.45, 11.00, 12.55, 16.45, 21.45, 3.45, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**7.15** «Нязгаснае святло». Творчы вечар Аляксандра Алешка. 2016 год (12+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 18.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**13.10** «І жартам, і ўсур'ёз». 1987 год (12+).
**13.55** Фільм-канцэрт «Раніца года». 1983 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00, 22.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. 2020 год (16+).
**19.00** «Не люба — не слухай...» 1991 год (16+).
**19.55** Песні на вершы Андрэя Вазнясенскага ў фільме «Вітражныя спраў майстар». 1985 год (12+).
**22.45** «Рок і вакол яго». Тэлемост Масква — Ленінград. 1987 год (12+).
**23.45** «Сядзі і глядзі». 1994 год (18+).
**0.00** «Майстры мастацтваў». Народная артыстка СССР Фаіна Георгіеўна Ранеўская. 1978 год (12+).
**1.40** «Музычная гавань Элеаноры Філінай». Дайджэст. 2020 год (16+).
**5.00** «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ». Па старонках перадач 1985 года (12+).

## EuroSport 1

**0.35,10.30** Ралі-рэйд. Дакар (12+).
**1.05, 13.25, 16.30** Біятлон. Кубак свету (6+).
**2.00, 11.30, 15.30, 20.00** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**2.45,9.30, 14.45, 17.30** Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі» (6+).
**3.30, 11.00, 18.20** Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету (12+).
**5.00, 8.30** Тэніс. Australian Open (6+).
**6.30** Снукер. Сусветны Гран-пры (6+).
**21.05** Снукер. «Мастэрс» (6+).

## Кінакамедыя

**0.35** Эйс Вентура: вышук дамашніх жывёл (12+).
**2.05** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода (12+).
**4.10** Няпрошаныя госці (16+).
**6.10** Герой супермаркета (12+).
**7.45** Таўстун супраць усіх (16+).
**9.25** Шпіён, які мяне кінуў (16+).
**11.25** Правілы здыму: метад Хітча (12+).
**13.30** Як я стаў рускім (16+).
**15.15** Адзінаццаць сяброў Оўшэна (12+).
**17.15** Дванаццаць сяброў Оўшэна (16+).
**19.30** Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
**21.35** Халасцячкі (18+).
**23.05** Чаго хочуць жанчыны? (16+)

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** «Улегцы» (12+).
**8.35** Маст. фільм «Усветны хлопец» (12+).
**10.05, 22.20** «Глядзі сам» (16+).
**10.20** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.10, 2.15** Серыял «Мая» (16+).
**15.25** Анімацыйны фільм. «Монстр у Парыжы» (6+).
**17.10** Серыял «Завушніца Казановы» (12+).
**21.10** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**22.35** Маст. фільм «Стары Новы год» (16+).
**0.45** «Грым». Серыял (16+).
**5.30** «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)

## ТБ1000

**5.00** Двухсотгадовы чалавек (6+).
**7.30** Рэальнае каханне (16+).
**10.05** Дывергент (12+).
**12.30** Дывергент, глава 2: інсургент (12+).
**14.30** Дывергент, глава 3: за сцяной (16+).
**16.25** Галодныя гульні (16+).
**19.00** Галодныя гульні: і ўспыхне полымя (16+).
**21.30** Галодныя гульні: сойка-перасмешніца. Частка I (16+).
**23.35** Галодныя гульні: сойка-перасмешніца. Частка II (16+).
**2.00** Прадчуванне (16+).
**3.30** Забытае (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.35** Любоў-маркоў (12+).
**7.25** Любоў-маркоў-2 (12+).
**9.05** Любоў-маркоў-3 (12+).
**10.55** Горка! (16+)
**12.40** Горка!-2 (16+)
**14.15** Карлік Нос (6+).
**15.45** Ваўкі і авечкі бе-е-е-зразважнае ператварэнне (6+).
**17.10** Чорная маланка (6+).
**19.00** Брамнік Галактыкі (6+).
**21.15** Таямніца пячаткі дракона (6+).
**23.25** Скарбы В. К. (16+).
**1.20** Арытмія (18+).
**3.30** Кома (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.20** Аўта-SOS (16+).
**8.55** Самыя лепшыя суперкары (16+).
**10.35** Усярэдзіне неверагоднай механікі (16+).
**12.15** Сапраўдны суперкар (16+).
**13.55** Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
**15.35** Таемныя гісторыі (16+).
**19.15** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
**21.00** Атлас праклятых месцаў (16+).
**21.50** Паранармальныя (16+).
**23.35** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**1.15, 3.35** Нацыянальныя паркі Амерыкі (16+).
**2.00** Асушыць акіян (16+).
**4.20** Антарктыка (16+).

## Discovery

**8.00** Як гэта зроблена? (12+)
**8.48** Як гэта ўладкавана? (12+)
**9.36** Ілюзіяніст (12+).
**11.12** Невытлумачальнае і нявывучанае (12+).
**12.48** Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
**14.24** Голыя, напалоханыя і самотныя (16+).
**16.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**17.36** Сталёвыя хлопцы (12+).
**20.00** Сталёвыя хлопцы: аўкцыён (12+).
**20.48** Махінатары: машына мары (12+).
**0.00** Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
**1.42** Самагоншчыкі (18+).
**3.24** Легендарныя месцы (12+).
**5.42** Багажныя войны (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.55 Меладрама «Родныя пенаты» (16+).**
**8.30** Адзін дзень (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.40** Гісторыі выратавання (12+).
**10.10** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**10.45** Маршрут пабудаваны (12+).
**11.15, 12.10 Меладрама «Другая маладосць» (16+).**
**13.20** «Я ведаю» (6+).
**15.15** Дай пяць (6+).
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Адзін дзень (12+).
**16.40 Меладрама «Золатца». 1—4-я серыі (16+).**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.05 Меладрама «Ніколі не здавайся». 1—4-я серыі (16+).**

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
**8.00, 19.40** Тэлебарометр.
**8.05** «Клон». Серыял (16+).
**9.00** Анімацыя «Універсітэт монстраў» (12+).
**11.00** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**11.50 Фільм-казка «Папялушка» (12+).**
**13.35** «Тата папаў» (16+).
**15.15** «Мяняю жонку» (16+).
**16.55** «Вежа» (12+).
**17.40 Трагікамедыя «Джой» (12+).**
**20.10** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.20 Камедыя «Брус Усемагутны» (12+).**
**23.05** «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).

## Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 14.10** Навіны культуры.
**8.20** «Мароз Іванавіч». М/ф (0+).
**8.30 «Дайце кнігу скаргаў». Маст. фільм (12+).**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Свініна, запечаная з бульбай.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45 «У квадраце 45». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.50** «Народны майстар». Ігар Еўсціхаў (вырабы са скуры).
**13.20** «Спявае Беларусь». Фальклорнае песеннае шоу. Народны ансамбль народнай песні «Вербніца» (г. Чэрвень, Мінская вобласць).
**14.30** «Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі». Маст. фільм (16+).
**16.20** «Культурны рэпартаж». Маляванка.
**16.35** «На спіне ў чорнага ката». Маст. фільм (12+).
**18.05** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**18.20 «Дача». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.50** «Кадры жыцця». Фотакарэспандэнт, фотажурналіст Юрый Іваноў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Маст. фільм (12+) [СЦ].**

## Беларусь 5

**7.00** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Гонка пераследу. Жанчыны. Мужчыны.
**8.30** Сняданак чэмпіёнаў.
**9.00, 14.50, 20.10** Тэніс. ВТА. Абу-Дабі.
**13.20** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Змешаная эстафета.
**16.30** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Адзінкавая змешаная эстафета.
**17.30** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.30** Гульні «на выраст».
**20.00** Спорт-цэнтр.
**22.20** Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). Фінал.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10 Меладрама «За пяць хвілін да студзеня» (12+).**
**9.10** «Метэагід».
**9.30** «Народны кухар» (12+).
**10.50** «Бачылі відэа?» (6+)
**12.25** «Угадай мелодыю» (12+).
**13.15 Серыял «Султан майго сэрца» (16+).**
**16.20** «Ледніковы перыяд» (0+).
**18.20** «Лепш за ўсіх!» (0+)
**20.00** «Контуры».
**21.20** «Тры акорды» (16+).
**23.20** «Спартклуб» (16+).
**23.40 Камедыя «Француз» (12+).**

## СТБ

**21.05 «Прыходзь на мяне паглядзець». Маст. фільм (12+).**

**22.50** А. Пятроў. «Стварэнне свету». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

## Беларусь 5

**7.00** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама» (Мінск).
**8.55, 23.55** Канькабежны спорт. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.
**10.40** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэасапоіс.
**11.10** Хакей. КХЛ. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**13.05** Вось гэта спорт!
**13.20** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Жанчыны.
**14.45, 17.30** Міні-футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**16.15** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Мужчыны.
**19.25** Авертайм.
**19.55** Спорт-цэнтр.
**20.05** Гандбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2022. Мужчыны. Нарвегія — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.45** Тэніс. ВТА. Абу-Дабі.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10 Маст. фільм «Бедная Саша» (12+).**
**9.10 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага паляванне ў зімовы перыяд» (16+).**

**10.35** «Жыццё іншых» (12+).
**11.30** «Бачылі відэа?» (6+)
**12.25** «Угадай мелодыю» (12+).
**13.15 Серыял «Султан майго сэрца» (16+).**
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.40** «Ледніковы перыяд» (0+).
**18.50** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.00** «Навагодняя ноч» (16+).

## СТБ

**6.15** «Таямніцы Чапман» (16+).
**9.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**13.40, 0.05** «Невядомая гісторыя» (16+).
**15.40, 16.40 «Ёлкі 1914». Камедыя (12+).**
**17.50 «Ёлкі-5». Камедыя (6+).**
**19.55** «СТБ-спорт».
**20.05 «Ёлкі апошнія». Камедыя (6+).**
**21.45** Дак. спецпраект (16+).

## МІР

**5.00** Мультфільмы (0+).
**7.35 Маст. фільм «Загадай жаданне» (12+).**
**9.25** «Як у рэстаране» (12+).
**10.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» [СЦ] (6+).**
**13.10 Маст. фільм «Жандар і жандарметкі» (12+).**
**15.10 Маст. фільм «Каханне прэт-а-партэ» (16+).**
**17.00 Маст. фільм «Лёд у кававай гушчы» [СЦ] (16+).**
**19.15 Серыял «Адваротны бок Месяца» [СЦ] (16+).**
**0.55 Маст. фільм «Жандар і іншапланецяне» (12+).**
**2.20 Маст. фільм «Шукайце жанчыну» (12+).**
**4.55 Маст. фільм «Вовачка» (12+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Серыял «Сваты» (12+).**
**13.40** «Спецыяльны рэпартаж».
**14.30** Канцэрт Мікалая Баскава «Гульня».
**16.10 Серыял «Таямніцы следства-18» (12+).**
**21.05 Серыял «Скліфасоўскі. Рэанімацыя» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.30** Формы жыцця. Лясныя гісторыі (6+).
**6.40** Беларусы (6+).
**7.15** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.15** За гранню (16+).
**8.35** «Навукаманія» (6+).
**9.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**10.20 Фільм «Чыстая вада ў вытоку» (16+).**
**11.05 Серыял «Каманда» (16+).**
**12.45** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**13.10 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы Радзімы» (16+).**
**14.55, 16.15 Камедыя «Кахай мяне» (12+).**
**17.00 Серыял «Пёс» (16+).**
**19.25 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**
**0.00 Маст. фільм «Зімовы круіз» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.25, 19.10, 21.10, 1.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.30** «Мультпарад» (6+).
**7.30, 20.50** «Прыколы 13-й школы».
**7.35, 19.15 Серыял «Шэрлак» (12+).**
**9.05 Прыгоды «Гары Потэр і таемны пакой» (12+).**
**11.50, 16.30 Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).**
**13.30 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).**
**14.20, 18.05 Серыял «ОА» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.15 Прыгоды «Гары Потэр і вязень Азкабана» (12+).**
**23.15 Баявік «Жывеш толькі двойчы» (12+).**





## ВТБ

**6.05, 8.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.50** «Лаві момант» (16+).
**11.00, 21.30** Серыял «Івановы- Івановы» (16+).
**12.45, 23.10** «КВЗ. Панашаму» (16+).
**13.30** «Наш рамонт» (16+).
**14.00, 15.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**16.00, 17.00, 3.00** Серыял «Лонданград» (16+).
**18.00** Серыял «Кухня» (16+).
**20.45** «Поўны блэкаут» (16+).
**0.05** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства» (16+).
**0.55** «Супермамачка» (16+).
**2.35** Серыял «Татавы дочкі».
**4.35** «6 кадраў».

## Культура

**6.30** «Пешшу...» Яраслаўль узорысты.
**7.05** «Умка», «Умка шукае сябра», «Ноч перад Калядамі». М/ф.
**8.20** «Лібрэта». В. А. Моцарт «Чароўная флейта». Анімацыйны фільм.
**8.35** «Свінарка і пастух». Маст. фільм.
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.30** «Рускі плакат». «Рускі плакат і кінематограф» [СЦ].
**10.45** «Падкідыш». Маст. фільм.
**11.55, 1.30** Краіна птушак. «Глушцовыя сады». Дак. фільм [СЦ].
**12.35** «Аліло. Адраджэнне грузінскіх песнапеняў».
**14.15** «Паездкі на старым аўтамабілі». Маст. фільм [СЦ].
**15.40** «Тыя, з якімі я... Віктар Цой» [СЦ].
**16.10** Спектакль тэатра «Гелікон-опера» «Папялушка».
**17.40** «Пешшу...» Троіца-Сергіева лаўра [СЦ].
**18.10** «Хрустальны баль у гонар Яўгена Вахтангава».
**19.35** «Продлись, продлись очарованье...» Маст. фільм [СЦ].
**21.00** «Прызнанне ў каханні». Канцэрт гурта «Кватро» ў Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
**22.20** «Пасляслоўе». Маст. фільм [СЦ].
**23.55** Уладзімір Сівакой і Акадэмічны Вялікі хор «Майстры харавога спеву».
**0.35** «Залатое кольца. Падарожжа». Дак. фільм [СЦ].
**2.15** Лета Гасподняе. Раство Хрыстова [СЦ].
**2.40** Прыгожая планета. «Італія. Верона».

## Настальгія

**6.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Сустрэча сяброў» у клубе «Высоцкі». 2007 год (18+).
**6.55** Маст. фільм «Сяброўка мая» (16+).
**8.10, 9.45, 11.10, 12.50, 15.45, 16.55, 17.45, 20.25, 21.45, 23.00, 2.15, 3.45, 5.15** Музычная настальгія (12+).
**8.25** «У сучасных рытмах». 1986 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Застольныя песні». 2006 год (16+).
**13.05** Кінаканцэрт «На біс». 1988 год (12+).
**13.55** Фільм-канцэрт «Зялёная лямпа» (Б. Акуджава). 1988 год (12+).
**17.10** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**19.00** «Аншлаг! Аншлаг!». 1990 год (12+).
**0.00** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс». (16+).

## EuroSport 1

**0.35, 10.30** Ралі-рэйд. Дакар (12+).
**1.05, 3.30, 11.00, 18.30** Скачкі на лыжах з трамплінаў. Турнэ 4 трамплінаў (12+).
**2.00, 11.30, 15.15, 20.45** Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі» (6+).
**5.00, 8.30** Тэніс. US Open (6+).
**6.30** Снукер. English Open (6+).
**12.30, 17.25** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).

## Кінакамедыя

**0.55** Самы лепшы дзень (16+).
**2.45** Вельмі небяспечная штучка (16+).
**4.15** Шпіён, які мяне кінуў (16+).
**6.10** Пачатак часоў (16+).
**7.55** СуперБабровы (12+).

**9.40** СуперБабровы: народныя мсціўцы (12+).
**11.15** Бандыткі (16+).
**12.50** Халоп (12+).
**14.40** Дыяментавы паліцыянт (12+).
**16.25** Эйс Вентура: вышук дамашніх жывёл (12+).
**17.55** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода (12+).
**19.30** Мы — Мілеры (16+).
**21.25** Нязносныя босы-2 (16+).
**23.20** Спадарыня пакаёўка (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.45** «Перыскоп» (16+).
**9.10, 15.35, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**10.15, 17.20** «Старац» (16+).
**10.55, 18.30, 3.10** «Сляпая» (16+).
**12.05, 19.40, 4.05** «Варажбітка» (12+).
**13.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.20** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.40** «Знакі лёсу» (16+).
**20.55** «Косці» (16+).
**22.45** «Грым». Серыял (16+).
**23.45** «Глядзі сам» (16+).
**0.00** «10 самых» (16+).
**0.35** «Лінія абароны» (16+).
**1.05** «Дзённік Брыджыт Джонс-3». Маст. фільм (16+).

## ТБ1000

**5.30** Рамэа і Джульета (12+).
**7.40** Прыцемкі. Сага. Світанак: частка 1 (12+).
**9.45** Прыцемкі. Сага. Світанак: частка 2 (12+).
**11.45** Людзі ў чорным (12+).

**13.20** Людзі ў чорным-2 (12+).
**14.50** Людзі ў чорным-3 (12+).
**16.40, 2.35** Пяты элемент (16+).
**19.00** Штучны розум (12+).
**21.30** Двухсотгадовы чалавек (6+).
**23.55** Рэальнае каханне (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Марафон жаданняў (16+).
**7.10** Статус: вольны (16+).
**8.55** Лёд (12+).
**10.50** Легенда № 17 (12+).
**13.05** Тры волаты і марскі цар (6+).
**14.20** Тры волаты і прынцэса Егіпта (6+).
**15.30** Тры волаты. Спадчыннiца пасаду (6+).
**17.05** Самы лепшы дзень (16+).
**19.00** Горка! (16+)

**20.50** Горка!-2 (16+)
**22.30** Палюбоўніцы (16+).
**0.30** Зорка (16+).
**3.00** Час Першых (6+).

## National Geographic

**6.00** Аўта-SOS (16+).
**9.10** Ліхтугі за мяжой (16+).
**12.30** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія (16+).
**15.55, 21.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 3.25** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**4.10** Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).

## Discovery

**8.00, 9.12** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.48** Як гэта зроблена? (12+)
**9.36** Паляўнічы на цацкі (12+).
**11.12** Сакрэтныя базы нацыстаў (16+).
**12.48** Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
**14.24** Голыя і напалоханыя (16+).
**16.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**17.36** Сталёвыя хлопцы (12+).
**20.48** Махінатары (12+).
**0.00** Невытлумачальнае і нявывучанае (12+).
**0.51** Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
**1.42** Самагоншчыкі (18+).
**3.24** Дальнабойшчык у Інданезіі (12+).
**5.42** Багажныя войны (12+).

чацвер, 7 студзеня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Беларусь 1

**6.30** Слова Мітрапаліта Веньяміна на Раство Хрыстова.
**6.40 Меладрама «Казкі Рублёўскага лесу». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**8.25, 9.10 Меладрама «Дом, які...» 1—4-я серыі (16+).**
**9.00, 12.00. 15.00** Навіны.
**12.10** Сэнс жыцця (12+).
**12.40** Маршрут пабудаваны (12+).
**13.10, 15.10 Меладрама «Чужая дачка» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Родныя пенаты». 1—4-я серыі (16+).**
**1.15** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00,19.05** Тэлебарометр.
**9.05** Фільм-казка «Папялушка» (12+).
**11.00** Анімацыя «Карпарацыя монстраў» (0+).
**12.30** Анімацыя «Універсітэт монстраў» (12+).
**14.10** «Вежа» (12+).
**14.55** «Паненка-сялянка» (16+).
**15.50 Камедыя «Прыгоды Падынгтана» (6+).**
**17.20 Камедыя «Прыгоды Падынгтана-2» (6+).**
**19.10 Меладрама «Джулі і Джулія: рыхтуем шчасце па рэцэпце» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.25 Фантастыка «Марсіянін» (12+).**

**23.45** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).

## Беларусь 3

**7.25** «Размовы пра духоўнае». Раство Хрыстова.
**7.35** «Беларуская кухня». Пернік.
**8.05** «Страла» ляціць у казку». М/ф (0+).
**8.35 «Снежная каралева». Маст. фільм (6+).**
**9.55** «Жывая культура». Традыцыя прыгатавання рыбы, сушанай у печы на саломе (вёскі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці).
**10.25, 21.05 «Аднойчы праз дваццаць гадоў». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**11.40** «Галоўная ёлка краіны». Навагоднае дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.
**12.50** «Культурны рэпартаж». Каляды.
**13.05 «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі». Маст. фільм (6+).**
**14.15** Сустрэча з «Бяседай».
**15.05 «Лёгкае жыццё». Маст. фільм (12+).**
**16.40** Новы год у класічным стылі.
**17.35 «Прыходзь на мяне паглядзець» Маст. фільм (12+).**
**19.20** «Навагодні маскарад». Святочны эфір з Вялікага тэатра Беларусі.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.25** П. І. Чайкоўскі. «Шчаўкунок». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Дынама-Масква».
**9.10, 22.45** Канькабежны спорт. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.
**10.45** Слэм-данк.
**11.15** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва — Мінск».
**13.05** Між іншым.
**13.25** Баскетбол. Ліга чэмпіёнаў. «Тэнэрыфэ» (Іспанія) — «Дынама Сасары» (Італія).
**15.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**16.15** Агнявы рубеж.
**16.50** Хакей. КХЛ. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — СКА (Санкт-Пецярбург). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.25** Вось гэта спорт!
**19.40** Фактар сілы.
**20.15** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама» (Мінск). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10 Камедыя «Француз» (12+).**
**9.10** «Ісус. Зямны шлях» (6+).
**10.00 Меладрама «Зімовы раман» (12+).**
**11.30** «Бачылі відэа?» (6+)
**12.25** «Угадай мелодыю» (12+).
**13.15 Серыял «Султан майго сэрца» (16+).**
**16.20** «Ледніковы перыяд» (0+).
**20.00** Час.
**21.00 Серыял «Сонечны круг» (16+).**
**23.00** «Сёння ўвечары» (16+).
**0.30** «Каляды. Традыцыі свята» (6+).

## СТБ

**6.30** «Вялікія таямніцы» (16+).
**8.05 «Ёлкі кудлаты». Камедыя (0+).**
**9.35** «Навагодні «Блакітны агеньчык»: назад у будучыню».
**11.45, 13.45** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**15.30, 16.45 «Ёлкі-2». Камедыя (12+).**
**17.40 «Ёлкі-3». Камедыя (12+).**
**19.55** «СТБ-спорт».
**20.05 «Ёлкі новыя». Камедыя (6+).**
**21.35** «Выкрутасы». Камедыя (12+).
**23.20** «Вялікія таямніцы» (16+).

## МІР

**5.00** Мультфільмы (0+).
**7.20 Маст. фільм «Забіць вечар» (12+).**
**9.25** «Як у рэстаране» (12+).
**10.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Маст. фільм «Пакроўскія вароты» [СЦ] (12+).**
**13.15 Маст. фільм «Жандар і іншапланецяне» (12+).**
**15.10 Маст. фільм «Калье для снежнай бабы» [СЦ] (12+).**
**17.10 Маст. фільм «Мая мама — Снягурка» (12+).**
**19.15 Серыял «Адваротны бок Месяца» [СЦ] (16+).**
**2.00 Маст. фільм «Жандар на адпачынку» (0+).**
**3.40 Маст. фільм «Ідэальнае Раство» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 20.00** Весткі.
**11.20 Серыял «Сваты» (12+).**
**13.10 Меладрама «Мелодыя на два галасы» (12+).**
**16.25 Серыял «Таямніцы следства-18» (12+).**
**20.35** «Без права на памылку. Калядны візіт у Дамаск».
**21.25 Серыял «Скліфасоўскі. Рэанімацыя» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.00, 8.15** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Формы жыцця. Лясныя гісторыі (6+).
**6.30** Беларусы (6+).
**7.15** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** Сфера інтарэсаў.
**8.45** «Навукамания» (6+).
**9.15 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**10.20 Фільм «Чыстая вада ў выток» (16+).**
**11.05** Серыял «Каманда» (16+).
**12.45** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**13.10 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы Радзімы» (16+).**
**14.55, 16.15 Камедыя «Снежны чалавек» (12+).**
**17.00 Серыял «Пёс» (16+).**
**19.25 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**
**23.55 Камедыя «Дыямент у шакаладзе» (12+).**

## 8 канал

**7.00,15.05, 19.10, 21.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.15** «Мультпарад». «Качыныя гісторыі» (6+).
**7.30,15.10, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35, 19.15 Серыял «Шэрлак» (12+).**
**9.05 Прыгоды «Гары Потэр і філасофскі камень» (12+).**

**11.40, 16.05 Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).**
**13.15 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).**
**14.05, 17.45 Серыял «ОА» (16+).**
**18.55** «Фэшн is my прафешн» (12+).
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.05 Прыгоды «Гары Потэр і таемны пакой» (12+).**
**23.50 Трылер «Спадарожнік» (16+).**
**1.40** «Надвор'е».

## ВТВ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.35** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.25** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Проста кухня» (16+).
**11.00** «Дзеткі-продкі» (12+).
**12.00** Поўнаметражны анімацыйны фільм «Сезон палявання» (12+).
**13.30** Серыял «Кухня. Вайна за гатэль» (16+).
**21.00, 3.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**22.15** «Новы год, дзеці і ўсе-ўсе-ўсе!» (12+)
**1.10** «Поўны блэкаут» (16+).
**4.15** «Даеш моладзь» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** Лета Гасподняе. Раство Хрыстова [СЦ].
**7.00** «Ну, пачакай!» М/ф.
**8.25** «Лібрэта». А. Глазуноў «Раймонда». Анімацыйны фільм.
**8.45** «Маё каханне». Маст. фільм.
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.30** «Рускі плакат». «Рускі плакат і гандаль» [СЦ].
**10.45, 0.55** «Мы з вамі недзе сустракаліся». Маст. фільм [СЦ].
**12.20** «Лібрэта». К. М. фон Вебер «Бачанне ружы». Анімацыйны фільм.
**12.30** «Археалогія. Гісторыя з лапатай». Дак. серыял [СЦ].
**13.00, 0.15** Краіна птушак. «Руковая чайка». Дак. фільм [СЦ].
**13.40** «Арабэла». Серыял.
**15.40** «Тыя, з якімі я... Аляксей Благавестнаў» [СЦ].
**16.10** Гала-канцэрт Акадэмічнага аркестра рускіх народных інструментаў імя М. М. Някрасава.
**17.25** «Залатое кольца. Падарожжа». Дак. фільм [СЦ].
**18.20** «Пра каханне часам кажуць...» Канцэрт Аляксандра Малініна.
**19.50** «Дуэнне». Маст. фільм [СЦ].
**21.25** Балет П. І. Чайкоўскага «Спячая прыгажуня». Пастаноўка тэатра Ла Скала.
**2.30** «Мартынка», «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Застольныя песні». 2006 год (16+).
**6.50, 9.45, 10.55, 11.45, 14.25, 15.45, 17.00, 21.45, 23.35, 2.10, 3.45, 5.10** Музычная настальгія (12+).
**7.05** Кінаканцэрт «На біс». 1988 год (12+).
**7.55** Фільм-канцэрт «Зялёная лямпа» (Б. Акуджава). 1988 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.10** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**13.00** «Аншлаг! Аншлаг!» 1990 год (12+).
**18.00** «Майстры мастацтваў». Народная артыстка СССР Фаіна Георгіеўна Ранеўская. 1978 год (12+).
**19.40** «Музычная гавань Элеаноры Філінай». Дайджэст. 2020 год (16+).
**23.00** «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ». Па старонках перадач 1985 года (12+).
**0.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Сустрэча сяброў». у клубе «Высоцкі». 2007 год (18+).
**0.55** Маст. фільм «Сяброўка мая». (16+).
**2.25** «У сучасных рытмах». 1986 год (12+).

## EuroSport 1

**0.35, 10.30** Ралі-рэйд. Дакар (12+).
**1.05, 3.30, 11.10, 15.00, 17.15, 23.05** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнэ 4 трамплінаў. (12+).
**2.00, 11.30, 18.30** Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі» (6+).
**5.00, 8.30** Тэніс. US Open (6+).
**6.30** Снукер. Northern Ireland Open (6+).
**13.00, 16.00, 22.35** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**14.00, 21.35** Біятлон. Калядная гонка (6+).

## Кінакамедыя

**1.10** Эвалюцыя (12+).
**2.55** Вельмі дрэнная настаўніца (18+).
**4.55** Васабі (16+).
**6.30** Секс па дружбе (16+).
**8.25** Заўсёды кажы «Так» (12+).

**10.10** Эйс Вентура: вышук дамашніх жывёл (12+).
**11.40** Маска (12+).
**13.25** Паляўнічыя на прывідаў (6+).
**15.15** Правілы здыму: метад Хітча (12+).
**17.25** Нятрошаныя госці (16+).

**19.30** Аслеплены жаданнямі (16+).
**21.05** Дзевяць ярдаў (16+).
**22.50** Вясельны перапалох (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.05, 4.05** «Улегцы» (12+).
**9.35** «Калядная гісторыя». Меладрама (6+).
**11.00** «Мая мама — Снягурка». Меладрама (16+).

**12.40** «Без падману (16+).
**13.35** «Снежная каралева». Анімацыйны фільм (6+).
**16.15** «Мошчы. Доказы цуду» (16+).
**17.10** «Сардэчна запрашаем, ці Суседзям уваход забаронены». Камедыя (16+).
**19.00** «Чалавек-невідзімка» (16+).

**21.00** «Замёрзлая з Маямі». Меладрама (16+).
**22.55** «Грым». Серыял (16+).
**23.55** «Знак якасці» (16+).
**0.40** «Чужы білет». Маст. фільм (16+).
**2.25** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00** Белфегор — прывід Луўра (12+).
**6.40, 1.10** Парк Юрскага перыяду (16+).
**8.55, 3.10** Парк Юрскага перыяду-2: закінуты свет (16+).
**11.05** Парк Юрскага перыяду-3 (16+).
**12.40** Якія не спяць у Сіэтле (6+).
**14.30** Штучны розум (12+).
**17.05** Эквілібрыум (16+).
**19.00** Асобная думка (16+).
**21.30** Якія мяняюць рэальнасць (16+).
**23.25** Элізіум: рай не на Зямлі (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Горка! (16+)
**7.25** Горка!-2 (16+)
**9.25** Палюбоўніцы (16+).
**11.15** Самы лепшы дзень (16+).
**13.00** Джэнтльмены, удачы! (12+)
**14.45** Іван Царэвіч і Шэры Воўк (12+).
**16.15** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2 (6+).
**17.30** Свята пад замком (16+).
**19.00** Спадарожнік (16+).
**20.55** Населены востраў (12+).
**23.00** Населены востраў: сутычка (12+).
**0.50** Мой хлопец — Анёл (16+).
**2.25** Лёд (12+).
**4.10** Статус: вольны (16+).

## National Geographic

**6.00, 6.45** Навуковыя глупствы (16+).
**6.20** Фабрыка ежы (16+).
**7.10** Асушыць акіян (16+).
**8.55, 21.50** Забытыя персанажы Бібліі (16+).
**13.10, 2.05, 4.25** Сакрэты Бібліі (16+).
**15.50, 1.15, 5.15** Хрысціянства: узыходжанне да ўлады (16+).
**17.35** Смяротныя падарожжы апосталаў (16+).
**21.00, 3.40** Закінутыя таямніцы Бібліі з Альбертам Лінам: зніклыя гарады Старога Запавету (16+).
**23.35** Таямніцы Магілы Гасподняй (16+).
**0.25** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).

## Discovery

**8.00** Як гэта ўладкавана? (12+)
**9.36** Паляўнічы на цацкі (12+).
**11.12** Сакрэтныя базы нацыстаў (12+).
**12.48** Паляванне на кашэуўныя камяні (12+).
**14.24** Голыя і напалоханыя (16+).
**16.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**17.36** Сталёвыя хлопцы (12+).
**20.48** Махінатары (12+).
**0.00** Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
**1.42** Самагоншчыкі (18+).
**3.24** Дальнабойшчык у Афрыцы (12+).
**5.42** Багажныя войны (12+).

# Калі іграеш Дзеда Мароза, галоўнае — не пераблытаць падарункі

**Дзед Мароз — той персанаж навагодніх свят, якога кожны з нас памятае яшчэ з маленства. Менавіта ён разам са сваёй унучкай Снягуркай прыходзіць у дамы, садкі і школы, каб павіншаваць са святамі, прынесці падарункі, здзейсніць жаданні. Ён робіцца правадніком для герояў у казцы, дзе дабро перамагае зло, а сяброўства і вера становяцца сапраўднымі магічнымі сіламі, якія набліжаюць Новы год. «Звязда» вырашыла пацікавіцца ў прадстаўнікоў творчых прафесій, каму даводзілася быць у ролі гэтага вядомага чараўніка, якія гісторыі пакінуў у іх памяці гэты вопыт.**

**Алег КОЦ, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага:**

— Я даволі часта быў Дзедам Марозам, хоць цяпер, здаецца, вырас з гэтай ролі. Увогуле гэта звычайная практыка для студэнтаў акцёрскіх вузаў, пачынаючы з першых курсаў. Давялося на навагоднія святы прымяраць белую бараду і тады, калі ў мяне нарадзіўся сын. Я на працягу трох гадоў быў Дзедам Марозам у яго садку, але ні разу не «пракалоўся», і сын мяне не пазнаў. І ён дагэтуль верыць у існаванне гэтага чараўніка.

Аднак на адным з ранішнікаў адбылася наступная гісторыя... Незнаёмы хлопчык, пабачыўшы мяне ў ролі Дзеда Мароза, пачаў паказваць на мяне пальцам са словамі «Гэта мой тата!» І ў дзіцяці здарылася сапраўдная істэрыка, якую мы змаглі спыніць толькі пасля таго, як я крыху «размаскіраваўся». Калі хлопчык пераканаўся, што я — не яго тата, але і не сапраўдны Дзед Мароз, то ў вачах з'явілася здзіўленне і чыталася пытанне «А дзе ж тады сапраўдны Дзед Мароз?»... Шкадую, што давялося так расчараваць дзіця.

Скажу сумленна, сам да сёння веру ў Дзеда Мароза, бо патрэбен жа і нам, дарослым, добры чараўнік, які выканае нашы пажаданні. На Новы год заўсёды загадваю жаданні, прычым не адно, а шмат. Вельмі хочацца, каб усе людзі верылі ў цуды, таму калі я ў ролі Дзеда Мароза, для мяне гэта магчымасць падарыць людзям такую веру. Сёння ў тых жа садках бацькі назіраюць за ўсім, што адбываецца на ранішніку, праз мабільны тэлефон, а так хочацца зрабіць іх непасрэднымі ўдзельнікамі свята... А яшчэ для мяне вось што важна. Калі прыйшоў да дзяцей на навагодні ранішнік і здолеў зрабіць так, каб яны не ўспаміналі пра падарункі, а радаваліся таму, што адбываецца.

Хоць з падарункамі таксама могуць быць казусы... Здараецца, калі ў якасці Дзеда Мароза дастаеш падарункі з мяшка, іх можаш пераблытаць. Тады самае галоўнае — хуценька завалодаць увагай дзіцяці і, пакуль тое занятае, знайсці патрэбны прэзент. І тады ў выніку зноў усе шчаслівыя... У святы вельмі хочацца ўсім пажадаць заставацца дзецьмі і не пераставаць верыць у цуды. Я спадзяюся, што ў наступным годзе ўсе жаданні беларусаў здзейсняцца!

**Руслан ТУРКОЎ, прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі:**

— Мне шмат разоў даставалася роля Дзеда Мароза. Згадваецца адна гісторыя з 1990-х, я тады яшчэ працаваў настаўнікам фізічнай культуры ў Магілёве. І вось мяне запрасілі пабыць галоўным навагоднім чараўніком. Тады было складана з падарункамі, цукеркамі і цацкамі. Даводзілася раздаваць па тры-чатыры цукерчыны, каб усім дзецям хапіла. Але бывала і так, што падыходзілі бацькі і прасілі павіншаваць іх дзіця асобна. Так аднойчы падышлі да мяне і далі цацачную чыгунку, сказалі — «Падарыце вось таму хлопчыку!» Я падыходжу да дзіцяці і перадаю яму падарунак нібы ад Дзеда Мароза. А побач сядзіць дзяўчынка, паглядае на шыкоўны падарунак суседа і з надзеяй пытаецца ў мяне: «А мне што ты падорыш?» Я ж, вядома, не магу ёй прызнацца — «На жаль, твае бацькі нічога табе не перадалі», таму дастаю ёй з мяшка толькі пару цукерак, бо больш нічога не мог даць. Ніколі не забудуся надзеі і расчаравання той дзяўчынкі... Думаю, сённяшнім дзецям цяжка ўявіць, як тады жылі і як часам складана было Дзеду Марозу.

Увогуле, з дзясятак разоў мне даводзілася быць Дзедам Марозам. Калі быў ім у свае школьныя гады, то мне казалі, што тыя цукеркі, якія застануцца пасля ранішніка ў мяху, дастануцца мне. Вядома, намагаўся аддаваць дзецям найперш карамелькі, каб мне якая шакаладная цукерка засталася. Потым быў у гэтай ролі ўжо на навагодніх святах у дзіцячым садку, які наведвалі мае двайняты. На шчасце, яны ні разу мяне не «раскусілі», хоць я і не вялікі акцёр. Але я заўсёды з хваляваннем назіраў, як у такія моманты мае дзеці звяртаюцца да мяне, быццам да казачнага персанажа. У сваім дзяцінстве я таксама верыў у Дзядулю Мароза. Паколькі нарадзіўся і рос у вёсцы, то перад Новым годам разам з бацькам ездзіў у лес па елку. І калі мы ішлі па лесе, мне здавалася, што вось зараз на паляне з'явіцца хатка гэтага чараўніка... Цяпер вельмі радасна глядзець, як мае дзеці пішуць

лісты Дзеду Марозу і кажуць, каб я іх перадаў. Альбо яны вераць, што мы з ім добрыя знаёмыя, альбо проста падыгрываюць мне, каб не застацца без чаканых падарункаў... А ўсім нам хачу пажадаць на Новы год знайсці пад ёлкай дабро, мір і — самае галоўнае — здароўе! Беражыце сябе!

**Яўген АЛЕЙНІК, прадзюсар гурта AURA, кампазітар:**

— Цікавая гісторыя ў ролі Дзеда Мароза адбылася са мной гадоў дзесяць таму, калі майму старэйшаму сыну было гады тры. Мяне тады натхнілі ўласныя ўспаміны з дзяцінства, калі мой дзядуля пераапранаўся і з'яўляўся перада мной у выглядзе навагодняга чараўніка. Прычым я рэагаваў так, як спачатку і мой сын — я яго не пазнаваў. Ёсць нават фотаздымак з тых часоў... Вядома, захацелася і для свайго сына зрабіць нешта падобнае. І вось я набыў касцюм, пераапрануўся, узяў мех з падарункамі і прыйшоў у хату. І, відаць, настолькі ўжыўся ў ролю, што мой Сашка пабег па ўсёй кватэры шукаць мяне з крыкамі «Тата, глядзі, Дзед Мароз прыйшоў!» А не знайшоўшы мяне, пачаў спяваць чароўнаму госцю нашы песні, хоць мы нават не падазравалі з жонкай, што ён іх ведае. Было весела і цікава. Праўда, на наступны год мой нумар ужо не прайшоў! Сын мяне адразу пазнаў. А вось летась мы для малодшага сына выклікалі акцёра-Дзеда Мароза, і калі той запытаў у малога, ці добра ён сябе паводзіў, то наш Вова выдаў: «Так, я добра сябе паводзіў! Еў кашу і супчык!» Хоць насамрэч яго няпроста накарміць, але сказаў якраз тое, што ад яго чакалі. Думаю, сёлета паспрабую сам яшчэ раз стаць для яго Дзедам Марозам... А ўсім нам напярэдадні свята пажадаю, каб аказалася, што 2020-ы быў чорнай паласой, а за ёй у 2021 годзе абавязкова з'явіцца белая!

**Дзмітрый ЦЕРАХАЎ, вядучы тэлеканала АНТ:**

— Мне неаднойчы даводзілася быць у такой ролі, асабліва калі пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў у школе, і там ладзілі святы для дзяцей. Але быў адзін ранішнік, які мы рыхтавалі для ветэранаў педагагічнай працы Ленінскага раёна. На ім мне давялося быць Дзедам Марозам для людзей ва ўзросце. І гэта запомнілася, бо дарослыя сапраўды часам бываюць як дзеці. Заслужаныя настаўнікі з задавальненнем вадзілі хараводы, удзельнічалі ў віктарынах і радаваліся святу, магчыма нават больш, чым дзіцячая публіка.... Заўсёды прыемна быць часткай навагодняга чараўніцтва і дарыць добрыя эмоцыі дзецям і дарослым. Мы з дачкой, напрыклад, пішам лісты Дзеду Марозу, і ў такія моманты мая вера ў гэтага чараўніка нібы вяртаецца. Тым больш калі пад ёлачкай знаходзіш падарунак, пра які марыў, то чым гэта не пацвярджэнне... Калі шчыра, сам я ў дзяцінстве ніколі не спрабаваў высветліць, а ці сапраўдны Дзед Мароз. Але падтрымліваць гэтую веру ў сваёй дачкі нам з жонкай падабаецца. І вельмі хочацца, каб людзі імкнуліся настройвацца на свята, жылі ў чаканні цудаў. Хоць мы і разумеем, што ўсё залежыць толькі ад нас. Няхай ва ўсіх усё будзе добра!

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіваў герояў матэрыялу.**

Салон прыгажосці

# АДВАРОТНЫ АДЛІК

## Мы спыталі ў спецыялістаў б'юці-сферы, як паспець прывесці сябе ў парадак да навагодняй ночы

**Вечар 31 снежня — мяжа паміж мінулым і будучыняй — няўхільна набліжаецца. І калі ў апошні дзень года вы раптам зразумелі, што так і не паспелі прывесці ў парадак твар, пазногці і прычоску, то... усё яшчэ можна выправіць!**

### МАСКА, Я ЦЯБЕ ВЕДАЮ!

Непасрэдна перад Новым годам вас выратуюць сродкі, якія дазваляюць атрымаць неадкладны эфект, адзначаюць касметолагі. Перш за ўсё гэта *патчы пад вочы*. Гэтыя простыя SOS-сродкі павінны быць у арсенале любой сучаснай жанчыны. Працэдура ліквідуе маршчынкі, разгладзіць і падцягне тонкую скуру пад вачыма, падыме знешні край вока, прыбярэ эфект «стомленых вачэй». Выкарыстоўваюць патчы ў любы час сутак. Галоўнае, каб скура была вычышчаная і танізаваная. Лепш за ўсё выкарыстоўваць іх раніцай, калі ўвечары намячаецца святочнае мерапрыемства. Ліпкі бок патча варта накладваць непасрэдна пад ніжнія вейкі — так, каб паміж патчам і вокам было прыкладна 2 мм свабоднай скуры. Патчы павінны шчыльна прылягаць да твару. І не лянуйцеся паляжаць з імі 20-30 хвілін, інакш вынік можа быць не надта прыкметны.

Бліжэй да ўрачыстасці можна накласці на твар маску, эфект якой — *сеткаваты* або *плёначны ліфтынг*. Як правіла, такія маскі ўтрымліваюць буйныя малекулы гіалуронавой кіслаты, якія ўтвараюць нябачную сетку або плёнку на твары. Мыць твар пасля такой маскі нельга — знікне эфект: вы змываеце сродак, і скура вяртаецца да зыходнага стану.

— Добра працуюць і асвяжальныя экспрэс-маскі з дэтакс-эфектам, напрыклад, з алоэ. Як і патчы з алоэ пад вочы, — адзначае **касметолаг і візажыст Таццяна КАНАПЕЛЬКА.**

Яшчэ адзін варыянт — папулярныя альгінатныя маскі. Калі вы яшчэ не ў курсе, *альгінатная маска* — гэта белы парашок, падобны на муку або крухмал, у прыгожым слоічку. Альгінаты — гэта высокамалекулярны поліцукрыд, выцяжка з марской водарасці ламінарыя. Альгінатныя маскі здольныя справіцца практычна з любымі б'юці-праблемамі — ад акнэ да маршчын і пігментацыі, ад ацёкаў да сухасці і гіперадчувальнасці. Парашок разводзіцца вадой або касметычнымі вадкасцямі да стану кашы, падобнай на цеста для бліноў, і наносіцца на скуру. Нанасіць маску трэба хутка — яна амаль адразу застывае. І потым здымаецца, як другая скура, а ваша пад ёй — ужо значна больш прыгожая, чым першапачаткова.

Але касметолагі папярэджваюць: нанасіць альгінатную маску варта не стоячы перад люстэркам, а лежачы, і нават злёгку закінуўшы галаву! Накладваючы маску ў вертыкальным становішчы, вы рызыкуеце «сцягнуць твар уніз» і атрымаць адваротны эфект. Менавіта таму лепш за ўсё на апошні дзень у годзе запісацца на альгінатную маску ў салон прыгажосці. Перад нанясеннем маскі ў салоне вам зробяць масаж твару, які прыпадыме патрэбныя мышцы і падцягне скуру, а эфект замацуе альгінат. Але нават дома альгінатную маску можна зрабіць правільна (асабліва калі папрасіць дапамогі блізкіх у яе нанясенні), а каб узмацніць эфект — нанесці пад яе крэм або сыроватку: так яны глыбей пранікнуць у скуру.

Зразумела, калі вы не запісаліся да касметолага загадзя, патраціць у салон 31 снежня практычна нерэальна. Але, дапусцім, вам пашчасціла. Значыць, можна зрабіць... пілінг. Непасрэдна перад святам дапушчальныя так званыя «банкетныя» пілінгі — павярхоўныя, з невысокім працэнтам AHA-кіслот. Дарэчы, такія пілінгі з фруктовымі кіслотамі можна рабіць і дома — гэтыя сродкі прадаюцца ў касметычных аддзелах магазінаў, ёсць нават беларускай вытворчасці (і досыць нядрэнныя). «Банкетныя» пілінгі не разлічаны на працяглы вынік, затое даюць кароткачасовы эфект гладкага, «фарфоравага» твару, дадаюць рысам скульптурнасць, ліквідуюць ацёкі і робяць твар маладзейшым.

— Што датычыцца *мейкапа,* цяпер у трэндзе свежасць, — распавядае Таццяна. — Я раіла б СС-крэм для выраўноўвання тону скуры, лёгкае скульптурыраванне (цёмнае адценне наносім пад скулы і ў складку века), дадаём трохі румян. Завяршае вобраз туш для вееек і бляск для вуснаў.

### РУКІ Ў БОКІ

Манікюр у салоне лепш зрабіць за некалькі дзён да ўрачыстасці — у гэтым выпадку можна выбраць *шэлак* (устойлівае пакрыццё пазногцяў) і больш не думаць «о красе ногтей». Калі ж з манікюрам не склалася (у майстроў, як правіла, загадзя распісаны ўвесь снежань), застаецца спадзявацца на ўласныя сілы. У гэтым выпадку на ноч з 30 на 31 снежня можна зрабіць *маску для скуры рук* (такія маскі таксама прадаюцца ў касметычных аддзелах і ў інтэрнэт-крамах) або нанесці пажыўны крэм і надзець баваўняныя пальчаткі, каб ён глыбей пранік у скуру. А да нанясення крэму або маскі — зрабіць пілінг скуры рук. Перад манікюрам дасць эфект пяціхвілінная *ванначка для рук* — напрыклад, літр цёплай вады + сталовая лыжка солі. А вось *нанясенне лаку* лепш адкласці на вечар — у пераднавагодняй мітусні ёсць шанц пашкодзіць пакрыццё. Дарэчы, даручыце чыстку бульбы і адмыванне патэльні ад тлушчу вашым мужчынам — інакш усе намаганні па прывядзенні ў парадак рук будуць марныя. Да вашага ведама: у наступным годзе па-ранейшаму актуальныя кароткія пазногці. Форма — авал або мяккі квадрат. У *навагоднім манікюры-2021* у трэндзе бліскаўкі і бліскучыя каменьчыкі.

Педыкюр неабходны, калі ваш навагодні вобраз уключае адкрыты абутак. У іншых выпадках можна абысціся без яго.

### ЯК РАПУНЦЭЛЬ

Здаровыя, бліскучыя, шаўкавістыя валасы ўпрыгожаць жанчыну лепш за любую ўкладку. Тым больш што да цырульніка, як вы ўжо здагадаліся, без папярэдняга запісу перад Новым годам таксама не патраціць. Але нават калі вы запісаныя ў салон, майце на ўвазе, што плануваць кардынальную змену вобразу на пераднавагоднія дні — неразумна. І звычайна майстры ў салонах за такія заказы не бяруцца: калі нешта пойдзе не так, выпраўляць будзе ўжо няма калі.

— Пасля 25 снежня не варта рабіць з валасамі нічога больш складанага за таніраванне, — кажа **парыкмахер-стыліст, тэхнолаг касметычнага брэнда KEUNE Маргарыта** (Instagram: margo.happyhair).

Плануйце эксперыменты на тыдзень, калі скончацца навагоднія вечарынкі. Калі да пачатку свята засталося 10-12 гадзін, можна зрабіць *маску з колерам,* кажа стыліст. Гэта дадасць валасам бляск, асвяжыць колер валасоў і зробіць яго ярчэйшым. Але не варта рызыкаваць, выбіраючы такую маску ў мас-маркеце: колер можа аказацца занадта інтэнсіўны або легчы плямамі. Прафесійныя маскі ў продажы ёсць паўсюдна (напрыклад, у аддзелах з прафесійнай касметыкай для валасоў у буйных гіпермаркетах), каштуюць яны не нашмат дарожэй за маскі з мас-маркета, затое значна больш прадказальныя і бяспечныя, калі казаць пра вынік.

— Але калі маскі з колерам вы раней ніколі не спрабавалі, не трэба эксперыментаваць 31 снежня. Спыніцеся на якаснай масцы па доглядзе валасоў, — падкрэслівае суразмоўніца.

Што датычыцца ўкладкі, зараз у модзе *натуральнасць.* Але, вырашыўшы, што ў навагоднюю ноч у вас будуць, напрыклад, локаны, улічыце праграму свята. Калі вы плануеце начную прагулку на свежым паветры, то, хутчэй за ўсё, у нашым клімаце валасы яе «не перажывуць». Лепш выбраць проста дагледжаныя валасы, чым суперстыльную ўкладку, што пратрымаецца 30 хвілін, кажа майстар. І нагадвае, што любыя ўкладкі робяцца толькі на чыстыя, свежавымытыя валасы.

*Лакі для валасоў з бліскаўкамі* мы звычайна не выкарыстоўваем у штодзённым жыцці. Але на Новы год яны якраз тое, што трэба. Такі лак дадасць адпаведны настрой у ваш вобраз. Тым больш што бліскаўкі цяпер у модзе — і на вопратцы, і ў мэйкапе, і на пазногцях, і ў валасах. І не забудзьцеся пра ўсмешку! Вочы, што зіхацяць шчырай радасцю, робяць прыгожай любую жанчыну.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Сугучча

# ПІСЬМЕННІКІ Ў ЧАСЕ

## У межах XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу пройдзе сімпозіум літаратараў

**У лютым 2021 года ў Мінску адбудзецца традыцыйная кніжная выстаўка-кірмаш — васямнаццатая па ліку. Па традыцыі яе заснавальнікамі выступяць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, Саюз пісьменнікаў Беларусі, міністэрствы замежных спраў, адукацыі, культуры, а таксама ААТ «Белкніга», ААТ «Макбел».**

У праграме выстаўкі, якая запланавана на 18—21 лютага 2021 года, — Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Мяркуецца, што ён пройдзе ў анлайн-рэжыме. Назва сімпозіума — «Пісьменнік і час: роля кнігі і пісьменніка ў грамадска-духоўных працэсах». Арганізатары сёмага па ліку форуму беларускіх і замежных пісьменнікаў у Мінску — Міністэрства інфармацыі краіны, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Свой удзел у міжнародным гуманітарным творчым праекце ўжо пацвердзілі публіцысты, літаратуразнаўцы, паэты, празаікі з самых розных краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, найперш — з Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Рэспублікі Узбекістан і іншых краін.

**Сяргей ШЫЧКО.**

**Общее собрание кредиторов ООО «ТРАЙПЛ»** УНП 100017108

**по вопросу защиты требований ОАО «Трест Белтрансстрой», ОАО «АСБ Беларусбанк» состоится 12.01.2021 в 14.00 по адресу:** г. Минск, пр-т Победителей, дом 51, корп. 2, 1-й этаж. Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу: г. Минск, ул. Декабристов, д. 5, пом. 1, эт. 2, офис 15, предварительно согласовав время с управляющим по тел. **+37517342-18-18.** Также более подробная информация опубликована в объявлении на сайте: http://bankrot.gov.by

Будзе свята!

# У ДОМ — ЖЫВЫ СІМВАЛ НОВАГА ГОДА

**Больш за 83 тысячы навагодніх дрэў ужо прадалі лясгасы на елачных кірмашах. Найбольш актыўна жывыя сімвалы свята купляюць жыхары Гродзенскай вобласці: тут рэалізавана крыху больш за 22 тысячы елак і соснаў, паведамляе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Яна адзначае, што акрамя ссечаных навагодніх дрэў лясгасы прапануюць таксама навагоднія букеты і дрэвы ў кадках (елкі, хвоі, піхты). Так, па апошняй аператыўнай інфармацыі, рэалізавана каля дзвюх тысяч навагодніх букетаў і столькі ж навагодніх дрэў у кадках.

Першыя елачныя кірмашы ў краіне запрацавалі яшчэ 19 снежня. Аднак масавы гандаль разгарнуўся на два-тры дні пазней. Найбольшы попыт на традыцыйныя атрыбуты свята лясгасы прагназуюць у апошнія дні снежня.

На сайце Міністэрства лясной гаспадаркі апублікаваны пералік елачных кірмашоў у абласных гарадах і Мінску, дзе прадстаўлена прадукцыя лясгасаў і Рэспубліканскага ляснога селекцыйна-насенняводчага цэнтра. Елачныя кірмашы ад лясгасаў будуць працаваць да 31 снежня ўключна.

Сёлета сярэдні кошт навагодніх дрэў сфарміраваўся наступным чынам: да 1 метра — 10 рублёў, ад 1 да 2 метраў — 12 рублёў, ад 2 да 3 метраў — 17 рублёў. Пры гэтым цана вар'іруецца ў залежнасці ад вобласці і рэгіёна, у асобных пунктах продажу можа быць як ніжэй, так і вышэй за сярэднюю па краіне. На складах лясніцтваў навагоднія дрэвы можна набыць па найбольш выгадных цэнах. Напярэдадні навагодніх свят лесагаспадарчыя ўстановы арганізавалі гандаль больш чым на 1,1 тысячы гандлёвых пунктаў. Елачныя кірмашы працуюць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВОСЬ ГЭТА ВУЛІЦА, ВОСЬ ГЭТЫ ДОМ...

## Карэспандэнт «Звязды» праверыла, як працуе феномен кінастужкі «Іронія лёсу, або З лёгкай парай»

**Любімая навагодняя меладрама, расхопленая мільёнамі на цытаты, адзначае сёлета 45 гадоў! Фільм быў створаны ў 1975 годзе і ўпершыню паказаны па першай праграме Цэнтральнага тэлебачання СССР 1 студзеня 1976 года ў 17.45. З таго часу адрас — вуліца Будаўнікоў, 25, кватэра 12, — дзе адбываюцца ўсе гэтыя лірычныя, камічныя, а для кагосьці і драматычныя падзеі, стаў яшчэ адным сімвалам Новага года, як ёлка або мандарыны. Ёлку купіла, мандарыны — таксама, чагосьці не хапае. Ну, канешне, навагодніх прыгод! У Магілёве ж таксама ёсць вуліца Будаўнікоў і нават з домам нумар 25. Ну што, ідзём у госці?**

### БУДАВАЛІ, БУДАВАЛІ І НАРЭШЦЕ ТАК І НАЗВАЛІ: БУДАЎНІКОЎ

Калі набірала тэлефонны нумар абазначанай кватэры, нават хвалявалася. Але, напэўна, адрас сапраўды магічны. Валянціна Кацельнікава, гаспадыня кватэры, нават не здзівілася, быццам чакала, што я ў госці напрашуся. Толькі ўдакладніла: адкуль? Са «Звязды»? І дазволіла: «Прыходзьце».

Дом хоць і не шаснаццаціпавярховік, як у кіно, — усяго два паверхі, але заблытацца і нават згубіцца, самі разумееце, можна і ў дзвюх соснах. Кватэра, дзе мяне чакалі, у пад'ездзе нумар два. Ведала, але я ўсё роўна памылілася. Там, дзе па логіцы павінен быць другі пад'езд, насамрэч аказаўся першы. Валянціна мне потым спачувала. «Нас увесь час блытаюць. То хуткая дапамога не да таго пад'езда пад'едзе, то міліцыя нешта пераблытае. А ўсё таму, што ў дамах пад'езды звычайна адлічваюць справа налева, а ў нас усё наадварот: злева направа. Побач блізнюк-двухпавярховік, дык у іх усё як мае быць. А вось мы «асаблівыя».

Кватэра маленькая, але кіношная таксама памерамі не ўражвала. Невялічкі вузкі калідор і сціплых памераў зала. Усёй той кватэры каля 34 квадратаў. Адна сцяна — спрэс фота дзяцей і ўнукаў. Здымкаў столькі, што на цэлы фотаальбом хопіць.

— У нас заўсёды сям'я вялікая была, — расказвае Валянціна. — У дзяцінстве мы жылі ў гэтай кватэры ўшасцярых: бацькі, я, два малодшыя браты і бабуля. І радаваліся, што кватэра асобная, хоць і без выгод. Яны з'явіліся значна пазней, пасля рэканструкцыі. Але тады, у 1962-м, і такі варыянт задавальняў. Вакол адны баракі, а мы як паны ў сваёй двухпакаёўцы. Тады тут і вуліцы яшчэ не было, увесь мікрараён называўся Магілёў-2. Толькі ў 1964-м нарэшце пачалі будаваць дарогу, а ў вуліцы з'явілася назва — Будаўнікоў. Напэўна, таму, што тут увесь час нешта будавалі.

### ПРАЗ ПРАПІСКУ СТАЛА КІНАЗОРКАЙ

Фільм выйшаў на экраны, калі Валянціна ўжо скончыла школу. Яго якраз паказвалі на яе дзень нараджэння — 1 студзеня. «Вось дык сюрпрыз!» — здзівілася сям'я, калі пачула адрас ад Яўгена Лукашына. А тут яшчэ і суседзі з другога паверха прыбеглі і крычаць: «Вы чулі? Вашу кватэру па тэлевізары паказваюць!» Вох і насмяяліся ж тады жыхары кватэры з кіношнай прапіскі!

Тыя самыя рарытэтныя Дзед Мароз і Снягурка з ваты.

— У фільме, праўда, размова ішла пра трэцюю вуліцу Будаўнікоў, — усміхаецца Валянціна. — Але ж яна ў нашым горадзе адна. А дзесьці ў пачатку 2000-х мы і самі на экран трапілі. Мясцовае тэлебачанне здымала сюжэт да юбілейнай даты фільма, а потым круціла яго па кабельным тэлебачанні. У нас яго, на жаль, не было. Затое калегі па рабоце доўга яшчэ віншавалі: «Валя, мы ж цябе па тэлевізары бачылі».

Адзначаць Новы год па-сапраўднаму з ёлкай і падарункамі Валянціна пачала толькі тады, калі сама стала маці. Бацькі амаль ніколі ёлку не ставілі, а Новы год хадзілі з дзецьмі адзначаць да сяброў у тыя самыя баракі, дзе раней і жылі. Было весела, цікава, шматлюдна. Потым баракі знеслі, сем'і раз'ехаліся, Новы год стаў выключна сямейным святам. І без ёлкі яго сустракаць было нават сумна. У доме з'явіліся шкляныя шары, шышкі, ліхтарыкі і вось гэтыя, зараз ужо рарытэтныя, ватныя Дзед Мароз і Снягурка вытворчасці Брэсцкай фабрыкі сувеніраў. Яны былі набыты ў папулярнай калісьці краме цацак на вуліцы Ленінскай.

### НЕ ЖАНІХ, ДЫК НЯВЕСТА

Блытаніны з адрасам раней было нават больш. Тады ж дамафонаў наогул не існавала. Але прынца на канапе, як кіношная Надзя, Валянціна ў сваёй кватэры не знаходзіла. Хоць тэарэтычна адным ключом, як Лукашын, можна адкрыць дзверы не толькі сваёй кватэры, асабліва калі яна ў новым доме. Не будаўнікі ж пра замкі павінны думаць. Але жыццё часам падкідвае не менш забаўныя сюжэты, чым у кіно.

— Побач з намі сталовая, і там часта па суботах вяселлі гулялі, — згадвае Валянціна. — Справа якраз была дзесьці ў перадднавагоднія дні. Глядзім каля тэлевізара з дочкамі, і тут званок у дзверы. Адкрываю, а там нявеста з сяброўкай. Сяброўка ўмольна: «Схавайце нашу нявесту!» Я спачатку разгубілася: нічога сабе сюрпрыз! Але потым пагадзілася: няхай хаваецца. Хоць і выказала меркаванне, што жаніх наўрад ці здагадаецца, дзе яе шукаць. Так яно і адбылося. Сяброўка пайшла, а нявеста сядзела з намі хвілін 40. Прыйшлося мне выйсці на вуліцу паглядзець, ці шукае хто прапажу. Пахадзіла каля сталовай, там музыка грыміць, госці танцуюць, ніхто пра нявесту і не згадвае. Мяне аж смех разабраў — нішто сабе вяселле. Вярнулася і параіла нявесце ісці і нагадаць пра сябе самой. Яна ледзь не ў слёзы. Шкада яе стала, пайшла зноў жаніха шукаць. На гэты раз убачыла двух разгубленых хлопцаў, адзін з якіх і аказаўся тым самым жаніхом. Але без выкупу аддаваць нявесту не пагадзілася. Я ж яе амаль гадзіну берагла. І яны прынеслі каробку цукерак і бутэльку гарэлкі. Цырк на дроце, адным словам!

### НІЯКАЙ ЗАЛІЎНОЙ РЫБЫ — ТОЛЬКІ АЛІЎЕ І ШУБА

Шарык з тонкага шкла — гэта табе не бяздушная пластмаса.

Ніводны Новы год у Савецкім Саюзе не абыходзіўся без гэтых фірменных страў. Трэба было яшчэ паклапаціцца інгрэдыенты дастаць. Гэта цяпер усё на любы густ і ў некалькіх варыянтах. А раней жыццё нашмат цікавейшым было. Прыходзілася ўвесь час за нешта змагацца. Дочкі Валянціны перыяд гэтага татальнага дэфіцыту не засталі. Але традыцыя, закладзеная ў савецкія гады, жывая ў сям'і дагэтуль.

— Аднойчы я паленавалася рабіць шубу, але зяць адразу ж адчуў, што нешта не так, — смяецца суразмоўца. — І я прызналася, што шубы няма. Але высновы зрабіла. А вось заліўную рыбу не раблю прынцыпова. Шмат валтузні з ёй. А пасля таго як кіно паглядзела, наогул нават жаданне не ўзнікае.

Валянціна КАЦЕЛЬНІКАВА ганарыцца, што жыве ў кватэры з кіношнай прапіскай.

«Іронію лёсу...» жанчына гатова глядзець колькі заўгодна, хоць ведае фільм да апошняга слова і жэста. Але ён нейкім неверагодным чынам вяртае ў тыя дні, калі ўсё ў жыцці здавалася простым і зразумелым, калі ўсе жылі на пад'ёме, у прадчуванні нейкай вельмі значнай падзеі. Жылі весела і з адчыненымі дзвярыма.

— 31 снежня збіраліся ў суседзяў на другім паверсе, 1 студзеня беглі да нас, — дзеліцца ўспамінамі Валянціна. — У нас і дзеці былі прыкладна аднаго ўзросту. Дружна нешта гатавалі, за стол садзіліся за гадзіну да бою курантаў — праводзілі стары і сустракалі новы год. Потым суседзі пераехалі, а дочкі мае павыходзілі замуж. Пайшлі ўнукі, і зноў мы адзначалі свята шумнай кампаніяй. У пачатку гэтага года разам сустракалі Раство. Хадзілі на Падніколле — там цяпер проста казка. Узялі паёк для перакусу і дзве гадзіны гулялі па парку, фатаграфаваліся, сустракалі знаёмых — весела было.

На жаль, сёлета ўпершыню прыйдзецца святкаваць Новы год паасобку. З-за пандэміі не зможа прыехаць з Санкт-Пецярбурга старэйшая дачка з сям'ёй. І хоць яны кожны дзень часам нават па два разы на скайпе, адчуванні іншыя. Хочацца, каб яны былі побач, але ж не ўсё ад нас залежыць. Дачка нават ужо і падарункі перадала — набор касметыкі ў Рашэ на Новы год і новы танометр да дня нараджэння. Новы год хоць і супадае з маім асабістым святам, адчування, што гэта адно і тое ж, няма. Для мяне Новы год — гэта выключна 31 снежня. А потым пачынаецца дзень нараджэння. Калісьці мы загадвалі на Новы год шмат розных жаданняў. Спяшаліся пісаць іх на сурвэтцы, палілі пад бой курантаў, кідалі ў келіх з шампанскім і выпівалі. Нешта збывалася, але не заўсёды. Магчыма, штосьці рабілі не так. Сёлета мне хочацца загадаць адзінае жаданне. Каб дзеці і ўнукі былі здаровыя і хутчэй скончылася гэтая пандэмія, каб мы зноў сабраліся за вялікім сямейным сталом. А яшчэ хочацца, каб былі мір і згода. Сёння нехта жадае змяніць наш уклад жыцця, але мне здаецца, што лепш не будзе. Можа стаць яшчэ горш, бо будаваць заўсёды цяжэй, чым захоўваць тое, што засталося ў спадчыну. Няўжо гэта незразумела? Часам мне вельмі хочацца зазірнуць у найбліжэйшую будучыню: што нас там чакае? Спадзяюся, што нешта лепшае. Магчыма, наступны год прынясе ўдачу. І трэба крышачку пацярпець, каб потым парадавацца спаўна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

З-за пандэміі сёлетні Новы год Валянціне ўпершыню прыйдзецца сустракаць з сям'ёй дачкі з Расіі на адлегласці.

Хто каго?

# Новы здымак? Значыць, зноў трэніроўка для мазгоў!

**З чаго пачынаецца дружба, вядома ўсім: з усмешкі. А вось з чаго пачынаўся звяздоўскі конкурс «Хто каго?», магчыма, варта і нагадаць, бо справа, як той казаў, даўно мінулых дзён... Не паверыце: гадоў з 20 таму газета надрукавала першы вясёлы здымак з просьбай прыдумаць подпіс — трапны, дасціпны, кароткі (не больш за восем радкоў) і...**

**Не будзем казаць, што варыянтаў прыйшло бачана-нябачана, але ж яны былі — першыя, можа, нават нясмелыя... А далей — болей: паступова, з часам, стваралася група пастаянных аўтараў, з якой нехта (відаць, па розных прычынах), здаралася, выбываў і да якой нехта пастаянна далучаўся. Рубрыка жыла!**

**Год адыходзячы, 2020-ы, не быў выключэннем: газета, як заўжды, друкавала здымкі і адмысловыя агляды лепшых варыянтаў подпісаў; разам з чытачамі вызначала аўтараў НАЙлепшых і ўзнагароджвала квартальнай падпіскай на «Звязду».**

**Усё, здавалася б, добра? Адзінае...**

**Здымак друкаваўся раней, тыя самыя ўдалыя подпісы — журы вызначала пазней...**

**І толькі ў апошнім нумары года «карціна» атрымалася поўная. Такім чынам — усмешачку!**

## «ЯК У БРЭСЦЕ БЫЛО ШЭСЦЕ ДЗЕД-МАРОЗАЎ — ШТУК МО ДЗВЕСЦЕ...»

*Геаграфію Мароз*
*Ведаў слабавата.*
*Вылез там, куды прывёз*
*Лжывы навігатар.*
*«Дзе тут ёлка,*
*Дзе народ?» —*
*Чараўнік сканфужаны:*
*Гэта сёмы ўжо паход*
*Па знаёмых лужынах!*

**Іван Сіманёнак, г. Паставы.**

*На планеце пацяпленне?*
*Дзед Мароз,*
*спраўляй адзенне:*
*Развітайся з кажухом*
*(Замяні яго плашчом),*
*Набывай трыко і кеды.*
*Капялюш дарэчы б дзеду...*
*Скончыш пераапранацца*
*І пачнеш Адлігам звацца.*

**Мікалай Старых, г. Гомель.**

*Дзед Мароз наш Янка*
*Збочыў да каханкі.*
*Покуль там*
*сюрпрыз дастаў,*
*Дык і снег ужо растаў...*
*Але ж дзеці*
*ў дзеда вераць,*
*Значыць,*
*трэба лужы мераць!*

**Соф'я Кусянкова, Рагачоўскі раён.**

*Вось дзівосы дык дзівосы:*
*Дзед Мароз...*
*Амаль што босы —*
*У нейкіх тэпцях — па вадзе?*
*Ці не ў май да нас ідзе?*

**Аляксандр Матошка, Расонскі раён.**

## «Пяць гадочкаў Пеця Вучыўся на бюджэце...»

*Кліч ад цешчы быў, як SOS...*
*На яго й ляцеў Фядос,*
*«Сеўшы» мігам ля трубы,*
*Комін чысціў — не абы...*
*Зараз будзе печка грэць,*
*Не капціць і не дымець —*
*Небяспека знішчана,*
*Дымаход ачышчаны!*

**Іна Алісевіч, Уздзенскі раён.**

*«Венік сажу не бярэ?*
*Нечым адкалупваць?*
*Трэба, хлопча, па трубе*
*Малатком пастукваць».*

**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

*Павер, чытач мой дарагі,*
*Не будзе іншай тут работы,*
*Бо гэты ўнук бабы Ягі*
*Ізноў рыхтуецца да ўзлёту.*

**Карына Цануніна, г. Вілейка.**

*Пяць гадочкаў Пеця*
*Вучыўся на бюджэце.*
*Далей — размеркаванне,*
*Як тэст на выжыванне,*
*Ў слабенечкі калгас...*
*Й жытло — на першы час.*

**Любоў Чыгрынава, г. Мінск.**

*Ходзяць чуткі, што у Яся*
*Ёсць суседачка Настасся,*
*І ён ходзіць не абы...*
*Ўжо дабраўся да трубы.*
*А што будзе — паглядзім —*
*Паміж ёй і паміж ім.*

**Сужэнцы Астроўскія, г. Мінск.**

## «Вобшук робіць гэты коцік: Мігам знюхае наркотык...»

*З крамкі неяк ехаў дзед,*
*Вёз на ровары пакет...*
*Да яго памкнуўся коця?*
*Значыць,*
*Там ляжыць смакоцце.*
*...Не сядзі, стары, у суседкі,*
*Бо нарвешся на аб'едкі.*

**Валерый Гаўрыш, г. Чавусы.**

*Цешчы трэба*
*валяр'янка...*
*У аптэку згойсаў Янка.*
*«Адпачні», — спыніў братан,*
*Ды забыўся на ката,*
*А ў таго на валяр'янку,*
*(Што вядома і не дзіва)*
*Нюх —*
*не горшы, чым у Янкі*
*На гарэлку і на піва!*

**Мікалай Касмачэўскі, г. Наваполацк.**

*Пасвіў воўк авечак*
*(зноўку!),*
*Даглядаў казёл капусту,*
*А загадчыкам сталоўкі*
*Быў пацук стары*
*Ды шустры...*
*І каток за працу ўзяўся —*
*Каштавальнікам прысмакаў.*
*Жаль, нядоўга пратрымаўся,*
*Нехта даў нагой пад...*

**Віктар Сабалеўскі, г. Узда.**

*Ежы — поўныя прылаўкі!*
*І ўсюды — хімдабаўкі.*
*Бедны коцік! Гэта ежа*
*Без нажа цябе зарэжа!*
*Лепш бы ты лавіў мышэй,*
*Жыў бы, мо, крыху даўжэй?*

**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

## «Як такую дзеўку ўбачыш, Дык на тыдзень розум страціш!..»

*Тры бабулькі*
*пад акном*
*«Косці мылі»*
*вечарком:*
*Цікавалі*
*за дзяўчынай*
*Ды казалі*
*досыць чынна:*
*— Не інакш —*
*радзіла ночкай?..*

*Гімн*
*спяваем*
*мы вадзе:*
*Без яе ніяк...*
*нідзе...*
*Гэта вось дзяўчо*
*пад сонцам*
*Мые лапкі*
*ўлюбёнцу,*

*Не дачушку,*
*не сыночка,*
*Мо сабачку*
*ці катка?*
*Не пазнаць*
*таго звярка!*

**Мікола Кісель, г. Мінск.**

*Вабяць,*
*Клічуць дрэвы*
*ў парку,*
*Што ля ручая...*
*Дзеўчына —*
*шыкоўная! —*
*Шкода — нічыя...*

**Галіна Пятроўская, Смаргонскі раён.**

*Каб ён век бяды*
*не меў,*
*На кавід*
*не захварэў.*

**Зоя Наваенка, Глыбоцкі раён.**

*Існуе сягоння мода*
*На сабачыя пароды.*
*І калі за ёй*
*пагнацца,*
*Можна...*
*голенькай застаць-*
*ца.*

**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

## «А нядрэнна Валянцін Пражывае каранцін...»

*На лужку ў ванне Ціт*
*Лечыць свой радыкуліт.*
*Што ў бінокль*
*разглядае?*
*Там малодка загарае.*
*Ні падлегчы...*
*Ні абняць...*
*Толькі й можа —*
*пазіраць.*

**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

*Пазаўчора —*
*яхта,*
*хвалі акіяна,*
*прыгажуня Светка...*
*А сягоння —*
*дача,*
*у гародзе ванна*
*і праз плот суседка.*

**Наталля Шкут, Светлагорскі раён.**

*Ліхадзей між*
*нас лунае —*
*У бальніцы заганяе...*
*То не змей, не цмок,*
*не вісус.*
*Гэта горай —*
*кляты вірус!*
*Не пужаецца Фама:*
*Як не бачу, — то й няма.*

**Мікалай Старых, г. Гомель.**

*Яшчэ ўчора без прынукі*
*Мылі ногі, мылі рукі,*
*А як вірус побач дзесь,*
*Ясь купаецца ўвесь.*

**Алена Мельнік, г. Віцебск.**

*Меў пасаду і пашану,*
*Не лічыў сваё дабро...*
*Узяў на лапу —*
*Мае... ванну*
*І дзіравае вядро.*
*ххх*
*...А нядрэнна Валянцін*
*Пражывае каранцін...*
*Каб у ванну йшчэ*
*і Ганну,*
*Дык на чорта і Багамы?!*

**Любоў Чыгрынава, г. Мінск.**

**Чарговы конкурсны агляд (і, адпаведна, новае «дамашняе заданне» — гэта з яго нагоды спадарыня Мельнік з Віцебска выдала: «Новы здымак? Значыць, зноў трэніроўка для мазгоў!») надрукаваны ў нумары за 9 снежня. Амаль месяц прайшоў. І таму не дзіва, што многія з чытачоў ужо даслалі свае варыянты подпісаў, многія, хочацца верыць, яшчэ дашлюць, бо... Як сведчыць рэдакцыйная пошта, без конкурсаў «Хто каго?», без «...Народа на провадзе» — і «Звязда» не «Звязда».**

**А значыць (хочацца верыць!), быць і быць гэтым рубрыкам! Каб адкрываць новыя імёны і таленты, каб падымаць настрой і прасвятляць, каб нагадваць даўно крылатае «Пакуль народ смяецца, ён на зямлі жыве!»**

**Валянціна ДОЎНАР, са шчырай удзячнасцю да ўсіх, хто пісаў (і, магчыма, будзе!), да ўсіх, хто чытаў.**

# НЕ АДКЛАДВАЙ НА ЗАЎТРА ТОЕ, ШТО МОЖНА З'ЕСЦІ СЁННЯ,

## або Як «рэаніміраваць» стравы, якія засталіся

**З любога «ўчарашняга» можа атрымацца выдатнае «сённяшняе», і не існуе такой стравы, з якой немагчыма прыгатаваць іншую — гэта вам скажа любы работнік грамадскага харчавання. Спатрэбяцца толькі фантазія і натхненне — і вось звыклая навагодняя страва ператвараецца ў... новую ежу. І замест таго каб душыцца ўчарашнімі салатамі, падсохлай мясной нарэзкай і халоднай курыцай, ваша сям'я і госці з задавальненнем ужываюць новы кулінарны шэдэўр. Галоўнае — памятаць: мы адказваем за тых, каго накармілі!**

Навагодні стол павінен літаральна ламіцца ад страў. Гэта прыдумалі не мы, не нашы бацькі і нават не нашы бабулі і дзядулі, што перажылі вайну і голад. Гэта старадаўняя славянская традыцыя: стол на святы павінен быць багаты. Гэта нешта глыбіннае, на

падсвядомым узроўні — тут ужо нічога не папішаш. І вось 31 снежня гаспадыні па ўсёй краіне рэжуць і рэжуць салаты, намазваюць курыныя тушкі тоўстым слоем маянэзу і марынуюць у прыправах мяса — у колькасці, якой у іншы час сям'і разам з гасцямі хапіла б на тыдзень. Зразумела, што на наступную раніцу палова прыгатаванага перасяляецца ў халадзільнік і на балкон. Але ж гэтыя рэшткі — усё яшчэ якасная ежа. Ёй проста неабходны «апгрэйд».

### Другое жыццё салаты

Перш за ўсё — адказ на вечнае пытанне: запраўляць усю салату маянэзам адразу або адкладваць у вазачку па меры неабходнасці. Здавалася б, адказ відавочны: па меры неабходнасці. Але некаторыя гаспадыні прыводзяць довад, што ў нарэзаным і не запраўленым выглядзе прадукты, якія ўваходзяць у склад салаты, праз некаторы час акісляюцца або падсыхаюць, а маянэз утрымлівае кансерванты: соль і лімонную кіслату. У вопытных гаспадынь ёсць такі лайфхак: усе інгрэдыенты, акрамя салёных агуркоў, выкладваюцца ў каструлю пластамі. Застаецца толькі ўзяць патрэбную колькасць салаты, дадаць агурок (калі ён патрэбны па рэцэпце), маянэз і змяшаць. У такім выглядзе загатоўка лёгка прастаіць у халадзільніку тры-чатыры дні.

— Зразумела, запраўляць маянэзам адразу ўсю салату непажадана, — распавядае **Валерый ЕРАНКЕВІЧ, повар з 50-гадовым стажам.** — Лепш за ўсё заправіць патрэбную колькасць салаты за 20-30 хвілін да падачы. Так маянэзныя салаты атрымліваюцца смачнейшыя.

Колькі гэта — неабходная колькасць? У сетцы існуе безліч кулінарных калькулятараў. Але ў цэлым салаты можна запраўляць з разліку 150-200 г на аднаго чалавека. На стале будзе шмат смачнага, так што можна лічыць нават 100—150 г на аднаго едака. Тым больш што нескладана пры неабходнасці заправіць яшчэ адну вазачку салаты маянэзам.

Але калі мы ўсё ж заправілі зашмат салаты, як «рэаніміраваць» яе на наступны дзень?

— Каб «ажывіць» салату з маянэзам — у прыватнасці, аліўе — паспрабуйце дадаць у яго мандарын ці апельсін, — дае параду Валерый. — Галоўнае — ачысціць долькі ад плёнак і вельмі дробненька парэзаць. Атрымліваецца досыць цікавы смак. Той жа эфект дае кансерваваны ананас — мякаць без соку таксама вельмі дробна рэжам і дадаём у маянэзныя салаты. Так часам робяць на банкетах, якія працягваюцца не адзін дзень. І госці кажуць, што смачна.

Акрамя таго, учарашняя салата — гэта магчымасць зрабіць гарачыя бутэрброды. З парэзанага на святочны стол і няз'едзенага падсохлага хлеба (лепш — з белага) робім грэнкі — намазваем сметанковым маслам, каб атрымалася хрусткая скарыначка, выкладваем салату і пасыпаем сырам. Запякаем у духоўцы 3-5 хвілін. Можна запякаць салату ў тарталетках, расказвае повар, але абавязкова зверху патрэбны цёрты сыр. Так, дарэчы, вы выкарыстоўваеце і сырную нарэзку, калі яна засталася. Лепш за ўсё змяшаць некалькі сартоў сыру, так што спатрэбяцца ўсе сырныя рэшткі. Дарэчы, пачак гатовых «формачак» з тонкага цеста (яны прадаюцца ў хлебных аддзелах магазінаў) заўсёды варта мець дома на запас.

Для запякання асабліва падыходзяць тыя салаты, дзе ёсць мяса ці каўбаса, грыбы, марынаваныя агуркі. Але для тарталетак падыдзе нават падсохлая агароднінная нарэзка — проста накрываем яе цёртым сырам і — злёгку — маянэзам.

— Незапраўленыя салаты варта захоўваць максімум двое сутак. Запраўленыя — крыху менш. Тут усё залежыць ад інгрэдыентаў. Тэрміны захоўвання аліўе, напрыклад, наўпрост звязаныя з агурком, які вы выкарыстоўвалі. Калі гэта марынаваныя агуркі, тэрмін захоўвання салаты большы, калі салёныя, вельмі хутка салата набывае кіслы смак.

### Мяса і курыца: шукаем варыянты

Запечаныя мяса, птушка і мясная нарэзка, якія засталіся пасля свят — гэта патэнцыяльная салянка.

— Калі ў вас ёсць гатовы булён, варым класічную салянку. У ход ідуць марынаваныя агурочкі, аліўкі, лімон і, вядома, усе віды мяса — запечанага і вэнджанага, а таксама каўбасы, салямі, вяндліна, сасіскі.

Цыбуля і бульба тут — па жаданні. Дадаём таматнае пюрэ, соль і перац, пры падачы — па лыжачцы смятаны. Апошні штрых — пасыпаць супчык парэзанай свежай зелянінай. Дарэчы, салянка — выдатны сродак ад пахмелля.

Палова запечанай курыцы, якую не даелі ў навагоднюю ноч — гэта аснова бясконцай разнастайнасці салатаў. На такі выпадак нядрэнна мець у халадзільніку на запас будзе слоічак кансерваванай фасолі і/або кукурузы. Гатовае курынае мяса можна зняць з костак, парэзаць і дадаць у амлет ці зрабіць з ім піцу.

Яшчэ адзін варыянт — дамашняя шаверма. Дробна рэжам курыцу і агародніну, запраўляем маянэзам напалову з таматавым соусам, можна дадаць надзёрты сыр. Начынку заварочваем у лаваш і абсмажваем з абодвух бакоў на патэльні.

А можна, маючы лаваш, паступіць інакш. Мясную і агароднінную нарэзку (ці, напрыклад, некалькі крабавых палачак, якія не трапілі ў салату) дробна рэжам, злучаем з дробна парэзанымі яйкамі ўкрутую і зелянінай, дадаём маянэз (варыянт — мяккі сыр) і спецыі. Заварочваем сумесь у лаваш і скручваем рулет. Наразаем яго на кавалачкі сантыметра ў чатырох шырынёй і адпраўляем у халадзільнік на некалькі гадзін. Халодная закуска да чаю (або да той жа салянкі) гатовая.

### Адварная бульба — што з ёй?

Можна, напрыклад, напячы піражкоў. Спатрэбіцца адно або некалькі яек (гледзячы колькі ў вас засталося бульбы) і трохі мукі. Вымешваем, дзелім цеста на часткі і лепім піражкі. Начынкай могуць быць агародніна, грыбы ці мяса (фарш, вяндліна або тая ж запечаная курыца са святочнага стала). Запякаем у духоўцы, падаём гарачымі, пасыпаўшы зелянінай.

Яшчэ варыянт — зразы з цыбуляй і квашанай капустай. Абсмажваем цыбулю да залацістага колеру, дадаём на патэльню капусту і тушым хвілін 10—15. Цеста робім як на піражкі. На адну штуку — сталовая лыжка цеста. Начыняем зразы капустай з цыбуляй, «запячатваем» і абсмажваем у алеі.

Ну, і бульбяныя запяканкі. Вядома, гэта ідэальна: смачна, эканомна і можна выкарыстоўваць амаль усё, што засталося з мяснога. Дарэчы, некаторыя гаспадыні запякаюць нават аліўе: проста дадаём у яго яшчэ маянэзу, пасыпаем зверху сырам — і ў духоўку хвілін на 15. Кажуць, смачна. Паспрабуем?

### Засталося шампанскае?

Калі гадзіны адлічваюць апошнія хвіліны адыходзячага года, прынята піць шампанскае. Але далёка не ўсе любяць «шыпучку», і часам яна застаецца пасля застолля. Што можна зрабіць у гэтым выпадку? Напрыклад, прыгатаваць «П'яны бісквіт». 4 яечныя жаўткі ўзбіваем блэндарам з 200 г цукру, дадаём шклянку мукі, разрыхляльнік (1 ч. л.), сок палавінкі лімона, трохі ваніліну па жаданні. Перамешваем. На гэтым этапе ў цеста трэба ўліць 180—200 мл шампанскага — менавіта яно надасць бісквіту пышнасць і лёгкасць. Бялкі ўзбіваем у пену асобна і акуратна дадаём у цеста. Яблыкі чысцім і рэжам. Астатняе — класіка: форму змазваем маслам, выліваем у яе цеста, выкладваем яблыкі і запякаем пры 180 °С 40 хвілін.

### Госці нон-стоп

Не паспелі раніцай 1 студзеня сысці госці, а ўвечары вы зноў чакаеце гасцей? Так часам бывае ў святочныя дні. Ну што ж, з пакінутых ад навагодняга застолля страў можна накрыць цалкам прыстойны стол. Яго асновай няхай стане кіш. Гэты французскі пірог выдатна выглядае і хутка з'ядаецца гасцямі літаральна да апошняга кавалачка. Вам спатрэбіцца цеста — яго можна купіць. Ну а можна і прыгатаваць самастойна. На кіш ідзе пясочнае цеста. Прасеяную муку (180 г) з соллю расціраем са 120 г халоднага сметанковага масла, злучаем з халодным малаком (2-3 ч. л.). Вымешваць цеста не трэба. Проста раскатваем у пласт, адпраўляем у халадзільнік на 15 хвілін, потым выкладваем у форму. Начынкай можа быць што заўгодна — мяса, агародніна, рыба: усё, што засталося пасля застолля. Пасыпаем усё гэта багацце дзёртым сырам (сыру не шкадуем, яго павінна быць шмат) і запякаем 30—35 хвілін.

Дадаём да пірага запечаныя тарталеткі, астуджаныя «шайбачкі» з салаты ў лавашы і бульбяныя піражкі з начынкай. Ну, а рэшткі нарэзкі садавіны плюс недапітае ў навагоднюю ноч чырвонае віно — гэта ж інгрэдыенты для глінтвейну, самага ўтульнага зімовага напою! Надзіраем цэдру лімона, злучаем цукар і спецыі (карыца, гваздзіка), дадаём віно і дробна парэзаную садавіну. Награваем сумесь да 70—80 °С, памешваючы. Працэджваем і разліваем па кубках. П'ём гарачым. З «П'яным бісквітам» — неверагодна смачна!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ПАМІЖ «ЗЯМЛЁЙ» І «ПАВЕТРАМ»

## Астролаг сцвярджае, што надыходзячы год будзе шчаслівейшы за 2020-ы

**Верыць ці не верыць у астралагічныя прагнозы — справа кожнага. Але пытацца ў астролагаў пра будучыню напярэдадні 31 снежня — адна з навагодніх традыцый. Вось і мы вырашылі спытаць у астролага Вольгі РОЎНАЙ аб тым, што чакае нас у 2021-м.**

***— Вольга, якім будзе 2021 год для жыхароў нашай планеты?***

— 21 снежня 2020 года Юпітэр і Сатурн злучыліся ў пачатку сузор'я Вадаліва. Гэта сімвалічны пачатак новай эпохі — эпохі Паветра, якая працягнецца найбліжэйшыя 200 гадоў. Эпоха Паветра прыйдзе на змену эпосе Зямлі, якая працягвалася 180 гадоў. Макрасацыяльныя планеты Юпітэр і Сатурн злучаюцца раз у 20 гадоў, і ў нашым стагоддзі яны будуць злучацца менавіта ў знаках Паветра (Блізняты, Шалі, Вадаліў). Такім чынам, эпоха Зямлі з яе акцэнтам на матэрыяльным плане, рэсурсах, жорсткіх структурах саступае месца эпосе Паветра — новаму часу, калі павышаецца каштоўнасць ведаў, павялічваецца значнасць і сіла нефармальных аб'яднанняў, цэніцца ўменне ставіць калектыўныя мэты вышэй за індывідуальныя, паважаць свабоду іншых. Планету чакае новы віток навукова-тэхнічнага прагрэсу, інавацыі ў розных сферах, рэфармаванне сістэм улады ў бок дэмакратызацыі. На прынцыповую вышыню будуць падымацца этычныя пытанні, якія датычацца адносін паміж людзьмі, адносін паміж уладай і народам, стаўлення чалавецтва да рэсурсаў. 2021 год — пераходны паміж дзвюма эпохамі. Старое і аджыўшае будзе сыходзіць, вызваляючы месца для новай рэальнасці.

***— Ці можна чакаць, што надыходзячы год будзе больш спакойны і шчаслівы, чым 2020-ы?***

— Так, можна. Асабліва гэта датычыцца другой паловы года. 2019 і 2020 гады — час, які можна назваць дном ямы, канцом эпохі. 2021 год — пераходны: у новую эпоху, у новы час. І хоць ён будзе крызісны і няпросты, дыхацца будзе лягчэй, чым у мінулыя гады. Мы адчуем вецер перамен, з'явіцца пачуццё перспектыў. Але глабальны крызіс, які пачаўся з пандэміі, будзе працягвацца. У 2021 годзе планета сутыкнецца з сур'ёзнай барацьбой старога і новага — кансерватыўнага і прагрэсіўнага. Але сіла, у адрозненне ад мінулых гадоў, ужо будзе на баку эвалюцыі і прагрэсу. Злучэнне процілеглых па сваім значэнні планет (Юпітэр — пашырэнне, Сатурн — абмежаванне, паглыбленне) у Вадаліве не дасць нам зусім адарвацца ад зямлі і зробіць прагрэс паступовым. Адбывацца гэта будзе не без перашкод, але ўсё ж няўмольна.

***— Якія перыяды надыходзячага года будуць самыя радасныя, а якія — самыя цяжкія? Напрыклад, пішуць, што Юпітэр будзе рэтраградны з 20 чэрвеня да 18 кастрычніка, і што гэта будзе складаны перыяд...***

— Тройчы за 2021 год будзе ўсталёўвацца квадрат Сатурн—Уран, і гэтыя перыяды могуць перажывацца як найбольш складаныя. Уран — планета рэвалюцыі, Сатурн — планета структуры і парадку. Рэфармаванне і абнаўленне ў структурах, якія раней здаваліся ўстойлівымі, непазбежна. У 2021 годзе нас чакаюць чатыры зацьменні (для параўнання — у 2020 было шэсць зацьменняў, што цяжэй). Больш светлых адчуванняў і падстаў для радасці падорыць другая палова 2021 года. Што датычыцца перыяду ретраграднасці, то гэта час, калі мы робім работу над памылкамі. У такія перыяды трэба быць уважлівымі і не наступаць на адны і тыя ж граблі.

***— Уран — «планета свабоды і раптоўных перамен» — будзе знаходзіцца ў Цяльцы, што кіруе грашыма. Што гэта значыць для жыхароў Зямлі?***

— Уран у Цяльцы з 2018 года. Цялец — знак фінансаў, матэрыяльных каштоўнасцяў і рэсурсаў, знак устойлівасці. А Уран — планета, якая сімвалізуе свабоду, непрадказальнасць, павышанае напружанне, новыя тэхналогіі. Транзіт Урана па сузор'і Цяльца на працягу сямі гадоў расхістае тэмы, якія раней былі ўстойлівыя. Фінансавая тэма ў 2021 годзе працягвае быць нестабільнай. Нешта новае чакае нас на рынку крыптавалют і ў фінансавай сферы ў цэлым, у тым ліку ў стаўленні людзей да матэрыяльных рэсурсаў. Здавалася б, нам ужо не прывыкаць выходзіць з зоны камфорту і вучыцца нечаму новаму, але нас чакаюць яшчэ адкрыцці ў гэтым кірунку. Трэба быць адкрытымі новым павевам і не трымацца за старое. Быць гатовымі да апгрэйду свайго жыцця.

***— Няптун у Рыбах — ці значыць гэта, што творчыя асобы будуць адчуваць прыліў сіл?***

— Няптун знаходзіцца ў Рыбах з 2012 года і прабудзе там да 2026-га. Гэта ўзмацняе цікавасць людзей да тонкіх матэрый — духоўных пошукаў, вывучэння навук аб душы, занятку мастацтвамі. У самыя складаныя і крызісныя часы людзі шукаюць падтрымку Нябёсаў. Многія дазволяць сабе выйсці за межы матэрыялістычнага погляду на свет і знойдуць падтрымку: хто — у духоўнасці і рэлігіі, хто — у псіхалогіі, хто — у творчасці.

***— Плутон, планета трансфармацый, будзе знаходзіцца ў Казярогу. Гэта азначае, што карта свету зменіцца?***

— Плутон — планета павольная. Ён асталяваўся ў Казярогу з 2008 па 2023 гады. Плутон сімвалізуе Вялікі Закон, які кіруе светам. У перыяд свайго транзіту па Казярогу ён дае нам на сваёй скуры адчуць залежнасць асобнага чалавека ад вялікай сістэмы і матэрыялізуе глабальны эканамічны і ідэйна-палітычны сусветны крызіс.

***— Чаго чакаць знакам задыяка ў 2021 годзе? Якія знакі маюць больш шанцаў пражыць надыходзячы год шчасліва?***

— Знакі кардынальнага крыжа — Авен, Рак, Шалі, Казярог — былі апошнія два гады пад найбольш моцным ціскам, пад прэсінгам абставін. Ім можа стаць лягчэй і вальней, асабліва ў сферах, звязаных з кар'ерай. Увага пераходзіць на знакі фіксаванага крыжа — Цялец, Леў, Скарпіён, Вадаліў. У іх жыцці энергія барацьбы новага і старога ў найбліжэйшы час можа выяўляцца найбольш яскрава.

***— Якім трэба пастарацца зрабіць сваё мысленне і светаўспрыманне, каб быць паспяховымі ў надыходзячым годзе?***

— У эпоху Паветра вельмі важнымі становяцца ўменне знайсці аднадумцаў, здольнасць аб'ядноўвацца ў групы з агульнымі мэтамі. Узмацняецца значэнне ведаў. Трэба думаць прагрэсіўна, ісці ў нагу з часам, быць адкрытымі новаму. У надыходзячы перыяд ключавой становіцца здольнасць вучыцца ў любым узросце, атрымліваючы новыя веды і навыкі.

**Гутарыла Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Сімвал года

# Дымок з ганаровым статусам

## Каго абралі сімвалам наступнага года ў Гродзенскім заапарку?

**На гэтую ролю тут было некалькі прэтэндэнтаў, у тым ліку зубр. Выбар на карысць дамашняга яка абумоўлены некалькімі прычынамі. Па-першае, яго афарбоўка. Па сваім знешнім выглядзе Дымок як ніхто іншы адпавядае 2021 году, а гэта год Белага Металічнага Быка. Па-другое, які — парнакапытныя жывёлы з роду сапраўдных быкоў.**

У Гродзенскім заапарку стала традыцыяй выбіраць сімвал года. Дымок прыйдзе на змену папярэдняму сімвалу — пацуку па мянушцы Гаечка. Хатні як яшчэ даволі малады — яму няма і пяці гадоў. У заапарк яго прывезлі з Карэліі. Аднак, Дымок ужо паспеў абзавесціся нашчадкам — сёлетнім летам у яго і самкі Жэі нарадзіўся першынец, якога ў заапарку назвалі Жуком. Усё сямейства знаходзіцца ў адным вальеры і аддае перавагу свежаму паветру, хоць для ўсіх парнакапытных у заапарку ўстаноўлены домікі з бярвення.

Дзякуючы тоўстай поўсці які вельмі добра пераносяць нізкія тэмпературы, мароз і холад для іх больш спрыяльныя, чым, напрыклад, гарачае лета. У дзікай прыродзе гэтыя жывёлы здольныя ўзбірацца на высокія вяршыні і нават сярод снегу адшукваць сабе ежу. Дамашнія які — сапраўдныя памочнікі для жыхароў высакагорных раёнаў.

Вось і ў гродзенскага Дымка дружалюбны характар. Тым не менш ён не будзе пакідаць межы вальера, як гэта было з іншымі сімваламі года — парсючком, сабакам і пацуком. Затое ўсе наведвальнікі могуць пачаставаць новага сімвала года і загадаць жаданне. Пачастункі, а гэта ў асноўным агародніна, трэба пакідаць на варце альбо перадаць супрацоўнікам заапарка. Самастойна карміць Дымка забаронена — як, дарэчы, і ўсіх астатніх жывёл.

Трэба сказаць, што нядаўна ў заапарку з'явілася самка лемура з «навагодняй» мянушкай Санта. Яна нарадзілася ў Іспаніі чатыры гады таму, а ў Гродна прыехала з Вільнюса. Дарэчы, яе прыезд доўгі час адкладваўся з-за пандэміі, і вось, нарэшце, гэта падзея адбылася. Санту набылі для пары лемуру Глобусу. Лемуры — жывёлы, якія адносяцца да атрада прыматаў і лічацца аднымі з самых загадкавых істот. У дзікай прыродзе яны жывуць толькі на Мадагаскары.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# «ГОД ПАВОЛЬНАГА РУХУ ДА ЛЕПШАГА ДЫ СТАНОЎЧЫХ ПЕРАМЕН»

## Што абяцаюць зоркі

### АВЕН (21 САКАВІКА — 20 КРАСАВІКА)

Будзе поспех ці паражэнне — усё вырашаць дзеянні. Чым больш намаганняў да поспеху прыкладзяце, тым на больш значныя станоўчыя перамены можна разлічваць. Але ж перамога ў тым ліку залежыць ад добрага тылу. Гэтым тылам будуць сваякі і добрыя сяброўскія сувязі, на якія можна спадзявацца ў самыя крытычныя моманты жыцця. Калі жадаеце перамагчы ды заваяваць таго, каго кахаеце, то пастарайцеся стаць для яго добрым сябрам. Можна чакаць значных перамен у кар`еры і рабоце. Ваша энергія і здольнасць да хуткай выпрацоўкі рашэнняў будуць добрым падмуркам для набыцця прыхільнікаў і памагатых у новых кірунках працоўнай дзейнасці. Стан здароўя будзе залежаць ад таго, ці здолееце вы пазбягаць перанапружання, сістэматычнага парушэння рэжыму сну.

### ЦЯЛЕЦ (21 КРАСАВІКА — 20 МАЯ)

Год павольнага, але ўпэўненага руху наперад. Не трэба ствараць унутраных канфліктаў, каб жыццё не стварала вам канфлікты ў самым блізкім асяроддзі. Сваякі і родныя будуць чакаць ад вас, што вы пачняце ўдасканальваць сваё жыццё больш хуткімі тэмпамі. Без вас і вашых парад яны наўрад ці здолеюць самастойна выпрацаваць значныя рашэнні. Кар`ера і работа запатрабуюць перфекцыянісцкіх адносін да абавязкаў. Рабіце кожны крок так, быццам гэта апошняя магчымасць зрабіць нешта значнае. Толькі з падобным стаўленнем можна разлічваць на значныя поспехі, у тым ліку на значны прыбытак. Калі казаць пра здароўе, трэба перагледзець адносіны да спорту і харчавання. Як гаварыў Парацэльс, «лекі ці атрута — залежыць ад колькасці».

### БЛІЗНЯТЫ (21 МАЯ — 21 ЧЭРВЕНЯ)

Будуць добрыя магчымасці для прагрэсу і росту. Надышоў час больш думаць, чым дзейнічаць. Добра спланаваныя дзеянні прынясуць больш вынікаў, чым імпульсіўная і неабгрунтаваная рэакцыя на праблемы і нечаканасці. Можна чакаць пашырэння кола сяброўскіх зносін, а таксама новых плённых сувязяў у рабоце і ў грамадскім жыцці. Асабістае жыццё будзе прапаноўваць зашмат альтэрнатыў і спакушаць прынесці добрыя адносіны ў ахвяру дзеля свабоды і незалежнасці. Паляпшэнне матэрыяльнага становішча можа прывесці да змены месца жыхарства ці набыцця больш камфортнага жылля. Выпраўленне стану здароўя можа адбыцца дзякуючы штодзённай увазе да яго. Здароўе — гэта ж не толькі тое, што далі нам бацькі, але і пастаянная работа на яго карысць.

### РАК (22 ЧЭРВЕНЯ — 22 ЛІПЕНЯ)

Шмат чаго будзе залежаць ад поглядаў. Змяніце іх, і рэчаіснасць таксама зменіцца да лепшага. Гэтае будзе выдатна працаваць у дачыненні да сваякоў, сям`і і сяброўскіх адносін. Каханне і адносіны з супрацьлеглым полам запатрабуюць невялікай ахвяры ў выглядзе магчымасці ўлічваць іхні пункт гледжання пры прыняцці сур`ёзных рашэнняў. Жыццё прынясе мноства шанцаў палепшыць матэрыяльнае становішча і атрымаць добры заробак. Аддайце перавагу тым кірункам, якія найхутчэй прыносяць грошы. Як кажуць амерыканцы, сённяшнія грошы даражэйшыя за заўтрашнія. Добры стан здароўя забяспечыць не столькі спорт, колькі захаванне арганізма ў раўнавазе з навакольным асяроддзем ды ўнутраным светам. Памятайце, што праблемы нараджаюцца спачатку ў галаве і свядомасці, а потым увасабляюцца праз падзеі і здарэнні.

### ЛЕЎ (23 ЛІПЕНЯ — 23 ЖНІЎНЯ)

Вы будзеце здольныя павярнуць да карысці любыя абставіны рэчаіснасці. Упэўненасць і магчымасць заставацца сабой у любой сітуацыі будуць добрымі спадарожнікамі як у прыватным жыцці, так і ў кар`еры. Не ствараўце для сябе перашкод залішняй крытыкай паводзін сваякоў ды каханых. Замест гармоніі можна атрымаць канфлікты і непаразуменні. Поспехаў на рабоце можна дасягнуць праз мэтанакіраванасць і паслядоўную абарону сваіх прафесійных прынцыпаў і поглядаў. Добры год для ўдасканальвання працоўнага майстэрства, пачатку вучобы. Пастарайцеся быць такімі ж прынцыповымі ў стаўленні да здароўя. Добры год для пазбаўлення ад шкодных звычак, а таксама сур`ёзных змен у адносінах да ежы і вобразу жыцця. Ніхто, акрамя вас, не зменіць ваша жыццё да лепшага.

### ДЗЕВА (24 ЖНІЎНЯ — 23 ВЕРАСНЯ)

Прыйдзецца адначасова вырашаць некалькі задач і праблем. Таму з першага дня года прывучыце сябе расстаўляць прыярытэты, як у асабістым жыцці, так і ў сацыяльным. Адносіны з супрацьлеглым полам запатрабуюць часу і здольнасці прыходзіць на дапамогу тады, калі таго запатрабуе сітуацыя. Жыццё дасць шмат шанцаў на поспех у кар'еры дзякуючы магчымасці наладзіць добрыя асабістыя сувязі з калегамі. Але ж пазбаўцеся ад ілюзіі, што будзе лёгка даносіць сваю думку да кіраўніцтва. Жыццё прынясе дастаткова магчымасцяў палепшыць матэрыяльны стан, а таксама атрымаць добрую адукацыю і павандраваць па свеце. Але ж памятайце, што большасць праблем са здароўем нараджаецца ў свядомасці, перш чым праявіцца ў целе.

### ШАЛІ (24 ВЕРАСНЯ — 23 КАСТРЫЧНІКА)

Год вялікіх магчымасцяў і вялікіх намаганняў. Спатрэбіцца шмат працаваць над сабой, каб палепшыць адносіны з супрацьлеглым полам і сваякамі. Што датычыцца кар'еры і работы, тут жыццё прынясе зашмат сюрпрызаў. Каб атрымаць поспех, трэба пазбягаць лішняй рызыкі і старацца захоўваць добрыя адносіны з калегамі. Само развіццё падзей бы абставіны адкрыюць шлях да дасягненняў у вашай працоўнай дзейнасці. Фінансавыя дасягненні могуць быць значныя не толькі дзякуючы росту заробкаў. Вялікую ролю адыграюць сваякі і сябры. Значных змен у асабістым жыцці можна дасягнуць праз кампрамісы і чуласць да жаданняў блізкіх сэрцу людзей. Некаторыя падарожжы і вандроўкі зменяць ваш светапогляд такім чынам, што вы адчуеце натхненне і новыя стымулы да прагрэсу і росту.

### СКАРПІЁН (24 КАСТРЫЧНІКА — 22 ЛІСТАПАДА)

Зараз галоўнае набыць цвёрдую глебу пад нагамі. Не імкніцеся да перамен дзеля саміх перамен без параўнання таго, што маеце, з тым, што можаце атрымаць. Здаровая кансерватыўная пазіцыя выратуе шмат ад якіх праблем у жыцці асабістым і грамадскім. У адносінах з супрацьлеглым полам вялікае значэнне мае псіхалогія. Калі навучыцеся лічыцца не толькі з моцнымі бакамі сваёй другой палавінкі, але і са слабымі, то адносіны зайграюць больш яркімі фарбамі. Новыя магчымасці ў сацыяльным жыцці падараць сябры і калегі. Надышоў год камандной гульні, калі разам з аднадумцамі можна дасягнуць значна большага, чым самастойна. Што датычыцца стану здароўя, то спатрэбіцца вялікая ўвага да ежы і рытму яе ўжывання. Як сцвярджалі ў старажытнасці, «мы ёсць тое, што ядзім».

### СТРАЛЕЦ (23 ЛІСТАПАДА — 21 СНЕЖНЯ)

Галоўнымі ворагамі будуць унутраная напружанасць ды пераболыпанні. Жаданне бачыць тое, чаго няма на самай справе, будзе падставай для ўскладнення адносін са сваякамі і сябрамі. Паспрабуйце жыць сённяшнім днём і рабіць справы тады, калі яны становяцца важнымі. Размеркаванне магчымасцяў адносна жаданняў і імкненняў пойдзе на карысць у працоўным жыцці. Будзе шмат магчымасцяў павысіць і адтачыць прафесійнае майстэрства, атрымаць дадатковую або асноўную адукацыю. Уладкаваць асабістае жыццё, а можа, і дайсці да шлюбу дапамогуць абставіны. Але ж яны створаць толькі ўмовы. Асноўная работа за вамі. Яе сутнасць у здольнасці да кампрамісу з магчымасцю прызнаць свае хібы і памылкі. Часцей за астатнія ролі вам прыйдзецца выконваць ролю суддзі ці арбітра ў спрэчках паміж роднымі, сябрамі і калегамі.

### КАЗЯРОГ (22 СНЕЖНЯ — 20 СТУДЗЕНЯ)

Год павольнага руху да лепшага і станоўчых перамен ва ўсіх сферах. Галоўнае, каб вы не спяшаліся атрымаць узнагароду ад жыцця, перш чым для гэтага саспеюць неабходныя ўмовы. Няхай усё адбываецца сваім ходам. Ваша задача — бачыць натуральнае развіццё падзей, каб скарыстоўваць іх для сябе і на карысць родным і блізкім. Можа значна палепшыцца матэрыяльнае становішча, і гэта вы зможаце скарыстаць для набыцця нерухомасці ці паляпшэння жыллёвых умоў. Што датычыцца работы, тут будзе працаваць закон пераходу колькасці ў якасць. Значны рост можа адбыцца дзякуючы дасканаламу выкананню сваіх абавязкаў на ўзроўні перфекцыянізму. Жыццё будзе дараваць памылкі ў адносінах з супрацьлеглым полам. Але ж гэта будзе не бясконца і толькі да таго моманту, пакуль вы самі даруеце слабасці і недахопы тым, каго кахаеце.

### ВАДАЛІЙ (21 СТУДЗЕНЯ — 19 ЛЮТАГА)

Прыйшоў час для хуткага ды імклівага характару развіцця падзей. Кожны дзень і тыдзень будуць прыносіць нешта новае. Асабістае жыццё будзе нагадваць кніжку загадак, якія трэба пастаянна разгадваць. Паводзіны родных і блізкіх будуць заставацца незразумелымі да таго часу, пакуль вы не здолееце паглядзець на іх з пункту гледжання вышэйшых законаў рэчаіснасці. Станоўчыя зрухі чакаюцца ў кар'еры і рабоце. Будзе шмат магчымасцяў дабіцца значных вышынь, набыць новую спецыяльнасць ці арганізаваць сваю справу, бізнес. Але ж чым больш магчымасцяў, тым больш адказнасці перад сваякамі, калегамі і паплечнікамі. Не трэба адносіцца да добрага стану здароўя як да нечага пастаяннага. Калі над ім не працаваць, яно можа пагоршыцца тады, калі гэта менш за ўсё патрэбна.

### РЫБЫ (20 ЛЮТАГА — 20 САКАВІКА)

Вы пабудуеце добры падмурак для значных перамен і поспеху на асабістым фронце. Самае галоўнае цяпер — не ісці на кампрамісы са сваім сумленнем. Менавіта яно перасцерагэ ад памылак і няўдалага развіцця падзей. Значныя перамены могуць адбыцца дома. Сваякі будуць прыходзіць на дапамогу ў самыя крытычныя моманты вашага жыцця. Але ж яны і самі будуць мець патрэбу ў вашай псіхалагічнай падтрымцы. Пазітыўныя змены ў кар`еры забяспечыць здольнасць знаходзіць агульную мову з калегамі. Трэба пакідаць больш часу на паляпшэнне стану здароўя. Не толькі спорт, але і карысны пасіўны адпачынак у выглядзе дастаткова працяглага сну, вандровак на прыродзе будзе рабіць значны ўклад у ваша самаадчуванне.

**Уладзімір ВАСЮК, астролаг.**

# СНЕЖАНЬСКІЯ ПЕРАПЕВЫ

**Па гарызанталі: 1.** У снежні зіма ... сцеле, а мароз наводзіць масты *(прык.)*. **5.** Першы снег — не зіма, першая каханка — не ... *(прык.)*. **9.** Тое, што і ўспамін *(разм.)*. **10.** Атмасферныя ападкі ў выглядзе ледзяных шарыкаў. **11.** Хаціна са снегу ў канадскіх эскімосаў. **14.** Жаданы сыход справы. **15.** Рад складзенага на ржышчы зжатага, не звязанага ў снапы збожжа *(абл.)*. **17.** Сорт яблыкаў. **18.** Калючае пустазелле. **19.** «Прыбеглі раніцай з хаты // У снежкі гуляць ...» З верша Ул. Бабкова «Першы дзень зімы». **23.** «І цягне бегчы на ... — // Туды, дзе снежань гаспадарыць». З верша Т. Дзям'янавай «Зіма. Завеі. Халады». **24.** ... год канчае, а зіму пачынае *(прык.)*.

**Па вертыкалі: 1.** Завея, завіруха. **2.** Сховішча для лёду. **3.** Беражы ... у люты мароз *(прык.)*. **4.** У коміне ... слупам — да халадоў *(прык.)*. **6.** Рэчаіснасць, рэальнасць. **7.** Расчыстка вуліц, дарог ад снегу. **8.** Тое, што і наваколле. **12.** ... для душы, зіма для здароўя *(прык.)*. **13.** Снежань вока снегам цешыць, ды марозам ... рве *(прык.)*. **15.** Прыйдзе ... хмуры — раскапае гуры *(прык.)*.; прысвятак ... адзначалі 5 снежня. **16.** «Поле нікне ў снежным тумане, // Снег блішчыць, як халодная ... , // І лятуць мае лёгкія сані». З верша М. Багдановіча «Зімовая дарога». **20.** У тэлефоннай размове вокліч: «Слухаю!» **21.** У футболе становішча, калі мяч аказваецца за межамі гульнявога поля (10 снежня — Сусветны дзень футбола). **22.** Адценне мовы.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Палотны. 5. Нявеста. 9. Успамінак. 10. Град. 11. Іглу. 14. Удача. 15. Прост. 17. Аніс. 18. Асот. 19. Зайчаняты. 23. Прастор. 24. Снежань.

**Па вертыкалі:** 1. Пурга. 2. Ледасховішча. 3. Нос. 4. Дым. 6. Ява. 7. Снегаачыстка. 8. Акруга. 12. Лета. 13. Вуха. 15. Пракоп. 16. Сталь. 20. Ало. 21. Аўт. 22. Тон.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.57 | 7.29 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.39 | 7.14 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.47 | 7.28 |
| Гомель — | 9.07 | 16.52 | 7.45 |
| Гродна — | 9.42 | 17.14 | 7.32 |
| Брэст — | 9.34 | 17.23 | 7.49 |

### Месяц

*Поўня* *30 снежня.*
*Месяц у сузор'і* *Ільва.*

### Імяніны

*Пр. Зоі, Мадэста, Марка, Міхаіла, Сімяона.*
*К. Меланіі, Сільвестра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Тэлеканалы хутка скемілі, што самае карыснае, што яны могуць зрабіць для дарослых 1 студзеня, — гэта ўвесь дзень круціць мульцікі для дзяцей.**

Гэты год мяне так моцна стаміў, што студзень я пачну з такіх прадуктыўных заняткаў, як сон пасля ежы і ежа пасля сну.

**Навагодні настрой: упрыгожваючы ёлку, пабіўся з катом з-за дожджыку.**

Таму, хто жанчыну сваю любіць і футра ёй купіць, Дзед Мароз прынясе ўсё для галення і шкарпэтачкі.

**Кожны год 31 снежня мы з сяброўкамі парымся на кухні. Традыцыя ў нас такая!**

**Наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 5 студзеня.**

## Даты Падзеі Людзі

### 31 СНЕЖНЯ

**У краіне**

**1880** год — нарадзіўся Антон Пятровіч Баначыч, рускі і беларускі спявак, педагог.

**1925** год — нарадзілася Ніна Антонаўна Равінская, артыстка аперэты, заслужаная артыстка Беларусі і Расіі.

**1935** год — нарадзілася Клара Мікалаеўна Малышава, балерына, народная артыстка БССР.

**1945** год — нарадзіўся Рафаіл Львовіч Белянкоў, беларускі спартсмен (цяжкая атлетыка), майстар спорту СССР міжнароднага класа. Чэмпіён Еўропы і СССР. Рэкардсмен свету ў жыме, Еўропы ў рыўку.

**1975** год — нарадзіўся Ігар Аляксеевіч Артамонаў, артыст балета, заслужаны артыст Беларусі, народны артыст Беларусі.

**1980** год — выдавецтва «Беларусь» узнагароджана ордэнам Дружбы народаў.

**У свеце**

**1880** год — нарадзіўся Джордж Кэтлет Маршал, дзяржаўны і ваенны дзеяч ЗША, генерал арміі. Удзельнік найважнейшых міжнародных канферэнцый перыяду Другой сусветнай вайны. Браў дзейны ўдзел у распрацоўцы праграмы амерыканскай дапамогі заходнееўрапейскім дзяржавам, названай яго імем.

**1930** год — нарадзіўся Анатоль Барысавіч Кузняцоў, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст РСФСР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі. Усяго за сваю кар'еру сыграў больш за сто роляў у кіно. Адна з найвядомейшых — чырвонаармеец Фёдар Сухаў у фільме Уладзіміра Матыля «Белае сонца пустыні».

**Так гаварыў...**

**АЎРААМ ЛІНКАЛЬН:**

*«Я перамагаю сваіх ворагаў тым, што раблю з іх сяброў».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3894. Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12